КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 38 (1268) 17 верасня 2016 г.

"К" інфармуе

23 верасня ў Віцебску адбудзецца запуск двух трамваяў і тралейбуса з размалёўкамі на аснове эскізаў Казіміра Малевіча і Ніны Коган. Паколькі арыгінальным эскізам размалёвак транспарту ўжо амаль 100 гадоў, трэба было адаптаваць іх пад сучаснасць, чым і займаліся старшы выкладчык кафедры дызайна Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Ілья Гурко і выкладчык Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтва, член Беларускага саюза дызайнераў Сцяпан Драздоў. "Гэта праца дызайнерскага характару. Наша задача: адаптаваць стагадовыя эскізы пад наш час, да сучаснага транспарту і сучасных прапорцый, а таксама да асаблівасцяў асяроддзя і тэхнічных умоў эксплуатацыі. Сама работа складалася з некалькіх этапаў: пошук і дбайная прамалёўка арыгінальных эскізаў, складанне камп'ютарнага макета, дадатак яго графікай і слоганамі. Потым гэта раздрукоўваецца на плёнку і асцярожна накладваецца на аб'ект", - распавядаюць Драздоў і Гурко. Дызайнеры праекта лічаць, што такая спроба можа прыцягнуць увагу новых маладых мастакоў, зацікавіць іх гісторыяй свайго горада.

Па словах Валянціны Кірылавай, аўтара і кіраўніка праекта "Гісторыка-культурная спадчына "УНОВИС" ("Сцвярджальнікі новага мастацтва") — культурны код развіцця горада Віцебска", у які ўваходзіць і гэтая падзея, размалёўка трамваяў — толькі першая з дваццаці частак вялікага праекта. "Зараз праходзіць рэстаўрацыя ўсіх тых віцебскіх эскізаў першай трэці XX стагоддзя, якія потым увасобяцца ў наступных частках праекта", — кажа спадарыня Кірылава, заснавальніца Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва.

На транспартных сродках размешчаны не толькі малюнкі, але і цытаты з трактатаў Малевіча, інфармацыя пра аўтараў сапраўдных эскізаў, гісторыя іх стварэння. Каля года "супрэматычны" транспарт будзе курыраваць па маршрутах горада. "Віцебскія трамваі на працягу стагоддзя з'яўляюцца візітнай карткай горада. У іх вельмі багатая і цікавая гісторыя. Калі стваралася Віцебская мастацкая школа, трамваі служылі для пачаткоўцаў у якасці палатна, нават Марк Шагал практыкаваўся на іх. Таму, калі нам паступіла прапанова працягнуць творчыя эксперыменты ў гэтай галіне — мы з радасцю пагадзіліся", — каментуе кіраўнік Віцебскага трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення Васіль Паўлючкоў.

На пытанне аб тым, ці знойдуць такія праекты падтрымку мясцовай улады, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Наталля Шыёнак сказала: "Калі будуць грошы — будуць рэалізавацца падобныя праекты і ў далейшым. Мы ў гэтым зацікаўлены, паколькі гораду і жыхарам такія мерапрыемствы ідуць на карысць".

Дарэчы, у Мінску 15 — 16 верасня прайшла Міжнародная канферэнцыя і экспазіцыя выставы ў рамках правядзення мерапрыемстваў, прымеркаваных да стагоддзя з дня стварэння мастацкага аб'яднання "УНОВИС". Яе правядзенне плануецца і ў наступным годзе.

Вольга СТАРАВОЙТАВА, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

Зусім хутка ў Віцебску можна будзе ўбачыць "супрэматычны" грамадскі транспарт. Гэта падзея адбудзецца ў рамках традыцыйных Дзён еўрапейскай спадчыны пад слоганам "Спадчына і супольнасць", дзе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь вылучыла ў межах тэмы больш вузкую — "Спадчына і веды".

ПРАЯЗДЖАЮЧЫ НА ТРАМВАІ МАЛЕВІЧА...

Трамвай паводле Малевіча і Коган ды іх распрацоўкі ў эскізе.

Соцыум

Інфармант мае права?

Скончылася лета, сезон этнаграфічных экспедыцый. Настаў час апрацоўваць матэрыялы, пісаць артыкулы, вучыць назбіраныя песні ды танцы, разгадваць сакрэты рамёстваў па сабраных і сфатаграфаваных вырабах. Часта да этнаграфічных звестак і аматары, і навукоўцы ставяцца як да ананімнай народнай творчасці, забываючыся, што на іх распаўсюджваецца дзеянне закона аб аўтарскім праве.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Прававы статус

У законе "Аб аўтарскім праве і сумежных правах" няма артыкулаў пра этнаграфічныя матэрыялы, таму даводзіцца выводзіць правілы іх выкарыстання з агульных палажэнняў. Скажам, правы на матэрыялы, сабраныя ў экспедыцыях, належаць і таму, каго апытвалі, і таму, хто апытваў. Інфарманты — вяскоўцы, якіх апытваюць — маюць аўтарскія правы на інтэрв'ю як літаратурны аб'ект у частцы адказаў-расповедаў і сумежныя правы на выкананне народных песень, казак, танцаў. Калі сам чалавек-творца склаў песню ці верш, то на ўласныя аўтарскія творы ён таксама мае права. Калі твор народны і яго аўтар невядомы, то дзеянне аўтарскага права на яго не распаўсюджваецца, але дзейнічае сумежнае права на выкананне.

Даследчыкі маюць правы на інтэрв'ю як літаратурны аб'ект у частцы сваіх пытанняў і агульнай яго будовы, аўдыязапісы (як на фанаграму, не на змест, які фармулюе інфармант), фотаздымкі, экспедыцыйныя дзённікі, справаздачы. Звычайныя інтэрв'ю, якія публікуюцца ў СМІ, лічацца літаратурнымі аб'ектамі. Правы на іх звычайна прыпісваюцца журналістам. Аднак Яўген Партны, супрацоўнік юрыдычнай кансультацыі, што спецыялізуецца па інтэлектуальнай уласнасці, заўважыў, што ўнёсак суразмоўцы ў інтэрв'ю стварае большасць аб'ёму тэксту, а журналіст толькі апрацоўвае атрыманы матэрыял. Таму правы журналіста і суразмоўцы на матэрыял павінны быць, як мінімум, роўнымі. Этнаграфічныя ж гутаркі — спецыфічныя аб'екты, якія сумяшчаюць элементы журналісцкага інтэрв'ю і навуковага даследавання.

Калі даследаванне ладзіць установа альбо арганізацыя і прыцягвае для яго правядзення валанцёраў, то каб замоўца мог законна распараджацца матэрыяламі, мусіць быць атрыманы дазвол і ад даследчыкаў, і ад інфармантаў. Калі даследчык дзейнічае ў рамках службовага задання (напрыклад, яго камандзіруе навуковая ўстанова ці ўстанова культуры і гэта афармлена адпаведным загадам), то сабраны матэрыял лічыцца службовым творам (у частцы даследчыка, але на правы інфармана статус даследчыка не ўплывае).

Як заўважаюць аўтары суполкі "Вольны архіў" у адной з сацыяльных сетак (яна асвятляе і пытанні палявой этнаграфіі), "з гледзішча заканадаўства аб інтэлектуальнай уласнасці інфармант або яго нашчадкі могуць мець абгрунтаваныя прэтэнзіі да этнографаў, калі тыя вырашаць без дазволу выкарыстоўваць запісаныя матэрыялы. Асабліва калі гэта будзе публічнае выкарыстанне. Адпаведна, з інфармантамі мусілі б заключацца дамовы, паводле якіх яны перадаюць даследчыкам правамоцтвы адносна запісанага".

Павага да інфармантаў

Бываюць выпадкі, калі інфармант, раззнаёміўшыся з даследчыкам, выконвае "салёныя" прыпеўкі ці распавядае досыць інтымныя падрабязнасці свайго жыцця.

Працяг **на старонках 4 — 5.**

Рэдакцыя плюс...

Лідар гурта "J:морс" Уладзімір Пугач сёння ў "сутыкненні" з нашым "калектыўным розумам". А вось і яшчэ адна нагода для сустрэчы: 5 лістапада ў Палацы Рэспублікі гурт дае сумесны канцэрт з Заслужаным калектывам краіны Прэзідэнцкім аркестрам Рэспублікі Беларусь.

Ад інтэрнэт-мема да "паднаготнай" ДК

Падрыхтаваў Алег КЛІМАЎ

Калега

— З нядаўніх часоў вы перыядычна апынаецеся ў ролі журналіста, беручы інтэрв'ю ў вядомых дзеячаў культуры і мастацтва. Як адчуванні?

— Калі мне прапанавалі паўдзельнічаць у такім праекце, я спачатку з асцярогай паставіўся да ідэі: маўляў, давайце я паспрабую. Але мне спадабалася, увайшоў у смак, сапраўды цікава задаваць пытанні розным людзям. А ці правільна я гэта раблю з пункту гледжання журналістыкі — не ведаю.

— Суразмоўцаў хто падбірае?

— Збольшага я. У мяне ёсць права вета, каб адмовіцца ад сустрэчы з прапанаваным мне чалавекам. Ніякіх падводных камянёў, антыпатый ды іншага: навошта рабіць інтэрв'ю, для якога я не здолею прыдумаць цікавых тэм, у якім не будзе інтрыгі? Але здараецца і адваротнае, — калі я прашу арганізаваць інтэрв'ю з артыстам, які прыехаў у Беларусь з выступам, і з якім мне хацелася б пагутарыць у рамках праекта.

— Для вас існуе паняцце журналісцкай этыкі — пра што нельга пытацца, што можна "публікаваць", што — не?

— Магу адказаць толькі з пазіцыі дылетанта, бо не з'яўляюся прафесійным журналістам. Усё, што не для запісу, на публіку выдаваць не трэба. Калі мой суразмоўца адказаў так, калі ён пры гэтым не знаходзіўся ў непрытомнасці,то выказванне яго — якім бы яно ні было, павінна стаць, калі я палічу патрэбным, здабыткам людзей.

— Ці робіце адкрыцці ў сабе, калі праводзіце інтэрв'ю?

— Для мяне працэс інтэрв'ю — тэра інкогніта. Усё раблю інтуітыўна. Бывае, пераглядаючы мантаж, дзіўлюся: а як я здагадаўся яшчэ пра гэта спытаць? Ці, наадварот, лаеш сябе, што пра нешта не здагадаўся.

— Інтэрв'юеры-арыенціры?

— Уладзімір Познер. Раман Супер. Юлія Меньшова. Рыхтуючыся да праекта, я пытаўся знаёмых журналістаў: "Хлопцы, што пачытаць па тэме інтэрв'ю?" Ягор Хрусталёў параіў Лары Кінга, але каб я не занадта ўчытваўся, — як пойдзе.

— Каго з візаві адзначылі б?

— Усе па-рознаму адкрываліся... Калі казаць аб шырыні дыяпазону паміж вобразамі медыйным і тым, які паўстаў перада мной пры асабістым знаёмстве, — гэта Іван Ахлабысцін. Пры ўсёй сваёй масава-публічнай эпатажнасці, абсурднасці нейкіх заяваў, ён вельмі... разумны мужчына. Алег Скрыпка не зусім так адказаў на пытанні, як я меркаваў. Я чакаў большай брутальнасці ад яго (як і ад Вольскага, дарэчы). Мне нават здалося, што ў некаторыя моманты ў ім браў верх... канфарміст, ці што?

— А для вас самога гэты занятак — браць інтэрв'ю — гульня, форма адпачынку ад музычнай дзейнасці або дадатковая актыўнасць, дзе вам хацелася праявіць сябе?

— Мне пашанцавала, што я ўсё жыццё займаюся тым, што мне падабаецца. Падабаецца і гэты занятак, як я ўжо сказаў. Пакуль атрымліваю задавальненне ад працэсу.

Крытык

— Медыя могуць паўплываць на поспех / няпоспех выканаўцы на нейкім этапе яго творчасці?

— Могуць, ёсць прыклады.

— А вынесены на публіку не самы спрыяльны для артыста "інсайд" можа знізіць наведвальнасць канцэртаў?

— Павысіць! Цяперашні свет уладкаваны так: калі вакол нейкай культурнай з'явы магчыма стварыць мем, ён гэту з'яву і пацягне за сабой.

— Вы самі крыўдзіліся (ці крыўдзіцеся) на музычных крытыкаў за штосьці?

— Магу памыляцца, але лічу сучасную музычную крытыку як жанр анахранізмам. Яна была карысная як спадарожная функцыя музычнага бізнесу пры продажы кантэнту. Нават у 1990-я людзі спачатку чыталі крытыку, а потым ішлі ў краму купляць кружэлку. Ці не ішлі. Сёння ж яны хутчэй знойдуць ды спампуюць прадукт, чым прачытаюць пра яго загадзя.

Заканчэнне — **на старонках 8 — 9.**

Афіцыйна

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 верасня 2016 года № 331, вялікая група работнікаў розных сфер удастоеная дзяржаўных узнагарод. Сярод іх дзеячы мастацтва і культуры.

Так, згодна з Указам, медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны кампазітар Яўген Алейнік, метадыст аддзела краязнаўства і пошукавай работы Абласнога цэнтра творчасці (Магілёў) Мікалай Барысенка, артысты драмы — вядучыя майстры сцэны Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь "Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі" Вераніка Буслаева, Дзяніс Паршын і Наталля Халадовіч.

Уганараваны медалём Францыска Скарыны артыст-вакаліст (саліст) Гродзенскай капэлы Марына Гаравая і артыст камернага аркестра — вядучы майстар сцэны ўстановы Людміла Нікіціна.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі Дзень бібліятэк адзначылі цэлым шэрагам імпрэз і акцый. Адна з іх асабліва прыцягвала ўвагу: Нацыяналцы перадалі ў дар кнігу 1765 года выдання, знойдзеную… у кантэйнеры з макулатурай.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

"Псалтыр" з макулатуры

Урачыстая цырымонія перадачы рэдкіх выданняў у рамках праекта "Кнізе — другое жыццё", які ажыццяўляецца кампаніяй "Белгіпс-эка" з 2015 года, прайшла 15 верасня. Як адзначыў падчас мерапрыемства намеснік дырэктара Нацыяналкі Алесь Суша, гэта акцыя знакавая:

— Кампанія захоўвае кнігі, што былі ва ўжыванні, падчас кантэйнернага збору макулатуры, гэта значыць, мае своеасаблівую бібліятэку тых выданняў, якія з той ці іншай прычыны перасталі быць патрэбнымі гаспадарам, але сярод іх сустракаюцца і вельмі каштоўныя. Так, сёння бібліятэцы будуць перададзены дарэвалюцыйныя выданні твораў Крылова і Метэрлінка, але найважней за ўсё — унікальнае беларускае вучэбнае выданне XVIII стагоддзя, якое раней належала Будслаўскаму бернардынскаму манастыру.

Падручнік па тэалогіі 1765 года.

Такім чынам, Нацыяналка атрымала ў гэты дзень падручнік па курсе тэалогіі на лацінскай мове Францыска Пшылецкага (1765 год, Вільня), які эксперты ўжо прызналі гісторыка-культурнай каштоўнасцю, "Псалтыр" (1888 год, Кіеў), "Творы Памялоўскага" (1909 год, том I, Масква) і "Творы М.В. Гогаля. Поўны збор у адным томе" (1921 год, Масква).

— Да гэтага часу кампанія падоўжыла жыццё 27 тысячам кніг, 21 тысяча з якіх была перададзена ў 59 арганізацый, у тым ліку ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, — адзначыла ў сваёй прамове намеснік дырэктара кампаніі "Белгіпс-эка" Лілія Сёмачкіна. — Натуральна, мы збіраемся і далей працягваць гэтую дзейнасць, так што сённяшняе падпісанне пагаднення аб перадачы кніг у дар Нацыянальнай бібліятэцы, думаю, не апошняе.

Таксама ў гэты дзень у Нацыянальнай бібліятэцы краіны прайшоў "круглы стол", прымеркаваны да 950-годдзя першай беларускай бібліятэкі — Бібліятэкі полацкага Сафійскага сабора — і Дня бібліятэк. У пасяджэнні ўзялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, самой установы, рэспубліканскіх бібліятэк і бібліятэк ВНУ краіны, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінскай духоўнай акадэміі, Інстытута тэалогіі імя святых Кірылы і Мяфодзія БДУ ды іншых арганізацый. А наступным днём, 16 верасня, у Нацыяналцы прайшоў яшчэ адзін, цяпер ужо міжнародны "круглы стол" на тэму "Прафесійныя СМІ і іх уплыў на прафесійныя кампетэнцыі: да 20-годдзя часопіса "Бібліятэчны свет".

Да слова, Дзень бібліятэк супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі краіны адзначылі і з дапамогай светлавога табло на будынку. Так, 14 і 15 верасня мінчане і госці сталіцы змаглі прачытаць цытаты вядомых беларусаў аб кнізе і значнасці чытання. Напрыклад, такія як "Добрая кніга заўсёды з'яўляецца лепшым сябрам у жыцці" (Максім Танк), "Ну, з чым, скажы, з якой каханкай магу я кніжку параўнаць?" (Пятрусь Броўка), "Ты зжылося з намі, бацькаўскае слоўца, як бы корань з дрэвам, як бы з небам сонца!" (Янка Купала), "З маленства люблю кнігу. Чытаць — гэта і праца, і свята" (Янка Брыль), "Любіце кнігу, бо яна — крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы" (Францыск Скарына), "Кнігі жывуць да тых часін, пакуль іх не толькі чытаюць, але і перачытваюць" (Якуб Колас). Усе выказванні выконваліся ў форме графічных выяў, якія можна было назіраць на электронным светлавым табло з 20.00 да поўначы.

К

Есць пытанне!

На гэтым тыдні шэраг інтэрнэт-рэсурсаў распаўсюдзілі навіну пра тое, што быццам бы ў Мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой" будзе забаронена рабіць сэлфі на фоне помнікаў, а таго, хто парушыць забарону, музейшчыкі аштрафуюць.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Сэлфі на помніку?

Адразу з боку інтэрнэт-супольнасці пасыпаліся гнеўныя заявы, накшталт "Як так можна!", "Гэта ж музей, а не абарончы аб'ект!" і нават "Музей вырашыў зарабіць на сваіх наведвальніках!"… Каб расставіць усе кропкі над "і", "К" звязалася з установай.

— Сэлфі ў крэпасці рабіць можна, ніхто не забараняе і не можа забараніць, — запэўніла намеснік дырэктара комплексу Ларыса Бібік. — Але ёсць крытэрыі таго, як сэлфі рабіць. Калі нехта крыўляецца ля помніка "Смага", а пасля выкладае сваё фота ў Інтэрнэт, дык варта казаць пра маральны бок асобы. Усё ж такі наш музей — своеасаблівы, і паводзіны тут маюць быць адпаведныя.

Як адзначыла намеснік дырэктара, нават і за такія, "скрыўленыя" фота, наведвальнікаў не аштрафуюць.

— Максімум, што могуць зрабіць у падобнай сітуацыі супрацоўнікі — папярэдзіць пра тое, што так паводзіць сябе ў нашым музеі нельга, — кажа Ларыса Бібік. — І ўсё. Ніхто не збіраецца цягнуць такіх "турыстаў" у пастарунак. Ды і, пагадзіцеся, не ў гэтым заключаецца галоўная наша задача...

Што да штрафаў, дык яны будуць прадугледжаны. Але не за сэлфі, а за пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцяў, якія знаходзяцца на тэрыторыі музея.

— Справа ў тым, што некаторыя нашы наведвальнікі пачалі залазіць на помнікі, прадстаўленыя ў крэпасці, хадзіць па руінах, — кажа Ларыса Бібік. — Папярэджанні ў такой сітуацыі нічога не зменяць. Таму мы вырашылі паставіць каля нашых помнікаў таблічкі, на якіх турыстам будзе нагадвацца пра тое, што пашкоджанне каштоўнасці будзе мець непрыемнасці. Гэта ўратуе помнікі гісторыі, а таксама, магчыма, і жыцці: некаторыя госці забіраюцца на самы верх аб'ектаў.

Шыльдачкі "Па руінах не хадзіць!" і "На помнікі не залазіць!" у хуткім часе з'явяцца на тэрыторыі. Змесцяць там і тэкст пра тое, што, адпаведна з заканадаўствам, штраф парушальнікам складзе ад 10 да 30 базавых.

— Забеспячэннем парадку і вырашэннем, штрафаваць наведвальніка ці не, зоймуцца адпаведныя органы, — адзначыла Ларыса Бібік. — Напрыклад, за парадкам у нас сочаць міліцыянеры, таму яны будуць і назіраць за тым, каб турысты паводзілі сябе прыстойна. Што да штрафаў за парушэнне правапарадку, дык яны будуць ісці не ў скарбонку комплекса, а ў адпаведныя структуры.

Як кажа Бібік, раней падобныя пытанні не стаялі.

— Яшчэ гадоў 5 — 10 таму наведвальнікі прыязджалі ў Брэсцкую крэпасць з адпаведным настроем, з горыччу аглядалі экспанаты, амаль у цішыні слухалі расповед, — кажа Ларыса Бібік. — Цяпер такога часам не назіраецца: некаторыя лічаць комплекс чарговым турыстычным і нават забаўляльным аб'ектам. Людзі забываюцца на тое, што тут, у сценах крэпасці, лілася кроў, гінулі… А пра гэта заўсёды варта памятаць, наведваючы наш музей. Інакш навошта сюды ехаць?..

К

Прызы "...Вежы"

Учора ў Брэсце завяршыўся XXI Міжнародны тэатральны фестываль "Белая Вежа". Цэласнае асэнсаванне ўсёй яго праграмы — наперадзе. Але на "круглым стале", што падводзіў папярэднія вынікі, і на штодзённых абмеркаваннях прагледзеных спектакляў крытыкі ў адзін голас адзначалі значнасць гэтай падзеі не толькі для тэатральнай грамадскасці, але і для ўсяго горада і краіны.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Позна ўвечары ў пятніцу былі названы пераможцы. "Лепшым спектаклем" была прызнана "Чайка" Львоўскага акадэмічнага тэатра "Уваскрэсенне" (Украіна), дзе аднайменная п'еса Чэхава паўстала ў аўтарскім прачытанні рэжысёра Яраслава Федарышына, пададзеным у фармаце вулічнай імпрэзы для гледачоў усіх узростаў. За "Лепшую рэжысуру" быў адзначаны Ежы Зонь і "Хор сіротаў" тэатра "КТО" з Кракава (Польшча). Паліну Харламаву, артыстку Дзяржаўнага акадэмічнага рускага тэатра драмы імя Максіма Горкага з Астаны (Казахстан), уганаравалі за "Лепшую жаночую ролю" — Крысціны ў "Паганцах". "Лепшай мужчынскай роляй" стаўся Чаплін у аднайменным спектаклі, сыграны і пражыты Піпам Уоттанам (Вялікабрытанія). "Ноч напярэдадні Ражаства" Чарнігаўскага абласнога акадэмічнага ўкраінскага музычна-драматычнага тэатра імя Тараса Шаўчэнкі вылучылі за "Лепшы акцёрскі ансамбль". Два спецыяльныя прызы — "Відовішчнае ўвасабленне паэтычнай прытчы" і "За яркі дэбют на фестывалі" — атрымалі, адпаведна, "Жастар тэатр" з Астаны (Казахстан) і Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя Аляксандра Пушкіна з Ашхабада (Туркменістан).

Сцэна са спектакля "Чайка".

К

Калектыў Вялікага тэатра Беларусі выказвае шчырае спачуванне родным, калегам, сябрам і блізкім з прычыны смерці рэквізітара Сяргея Паўлавіча ТРЫГУБКА.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 001. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 16.09.2016 у 21.30. Замова 3518. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Увага! Аб'ява!*

Стыпендыяльная праграма Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча "Gaude Polonia"

Нацыянальны цэнтр культуры аб'яўляе конкурс на атрыманне стыпендыі на шасцімесячны курс навучання ў Польшчы ў рамках стыпендыяльнай праграмы Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча "Gaude Polonia". Праграма "Gaude Polonia" прызначана для маладых творцаў і перакладчыкаў з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Курс навучання ў Польшчы пачнецца 1 лютага і будзе доўжыцца да 31 ліпеня 2017 года. Набор удзельнікаў ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Кандыдаты павінны валодаць польскай мовай на базавым узроўні.

Заяўкі прымаюцца да 15 кастрычніка 2016 года.

Падрабязную інфармацыю аб Праграме і бланкі анкет можна атрымаць на інтэрнэт-старонцы
http://nck.pl/gaude-polonia/
і ў Нацыянальным цэнтры культуры ў Варшаве
(тэл. +48-22-350-95-30, e-mail:bogumila.berdychowska@nck.pl),
а таксама ў Польскім Інстытуце ў Мінску
(Мінск, вул. Валадарскага, 6; тэл. (8017) 200-63-78, (8017) 200-95-81).

Філасофія сезона

У Магілёўскім абласным драматычным тэатры рыхтуюцца да адкрыцця 128-га сезона. На прэс-канферэнцыі, прысвечанай гэтай падзеі, дырэктар установы Андрэй Новікаў зазначыў, што мінулы сезон быў дастаткова складаным, аднак тэатр імкнецца пры невялікіх фінансавых сродках выпусціць цікавыя, глыбокія пастаноўкі.

Настасся ПАНКРАТАВА,
Мінск — Магілёў — Мінск

Тэатр запатрабаваны ў жыхароў абласнога цэнтра, пра што сведчаць сталыя аншлагі на прэм'ерных паказах. Рэжысёрскія пошукі і акцёрскія работы знаходзяць водгук у крытыкаў і тэатральнай грамадскасці: на Нацыянальную тэатральную прэмію вылучана "Крэйцарава саната" галоўнага рэжысёра тэатра Саўлюса Варнаса, гэты ж спектакль увайшоў у праграму "Belarus open" Міжнароднага форума тэатральнага мастацтва "ТэАРТ", дарэчы, разам з другой пастаноўкай магіляўчан — "Час сэканд хэнд" рэжысёра Уладзіміра Пятровіча.

Магілёўскі драматычны чакаюць на гастролях у Польшчы, Германіі, Літве. Зрэшты, пакуль трупа была ў адпачынку, актрыса Алена Дудзіч выступіла на Міжнародным тэатральным фестывалі "Перакрыжаванне" ў літоўскім Друскінінкаі з монаспектаклем "Рыкаючы верабей. Эдыт Піяф". Беларускі расповед пра французскую зорку прынёс артыстцы дыплом за лепшую жаночую ролю. Як падкрэсліў Саўлюс Варнас, у калектыва стае запрашэнняў: "Напрыклад, вельмі хочацца на гастролі ў Шры-Ланку, але сёння мала хто прапануе аплаціць пералёт да кропкі назначэння, а для тэатра такія выдаткі непад'ёмныя. Аднак мы па кожнай прапанове шукаем магчымасці".

Каб фінансавае напружанне менш адбівалася на творчых памкненнях, тэатр спрабуе часцей звяртацца да матэрыялу ў малых формах, з меншай колькасцю дзейных асоб на сцэне, пры гэтым працягвае трымаць якасную планку матэрыялу. Адна з такіх варыяцый — запланаваная на кастрычнік прэм'ера спадара Варнаса "Смех у цемры" па рамане Уладзіміра Набокава "Камера Абскура". У вераснёўскай афішы значыцца шэраг мінулагодніх прэм'ер, цёпла прынятых публікай і крытыкай, прынамсі спектакль Віталя Краўчанкі "Браты і Ліза" па п'есе Аляксея Казанцава. Дарэчы, кіраўніцтва мяркуе працягнуць супрацоўніцтва з маладым рэжысёрам, пра якога пісала нядаўна "К", аднак абмежаваны бюджэт вымусіў перагледзець планы, адсунуўшы новыя рэпетыцыі на канец сезона.

Знакавай падзеяй абяцае стаць восеньская прэм'ера "Скарына" па п'есе Мікалая Рудкоўскага. Галоўны рэжысёр актыўна вядзе рэпетыцыі, літчастка шукае цікавыя факты, звязаныя з беларускім першадрукаром, каб трупа магла больш глыбока занурыцца ў атмасферу далёкай эпохі. Аднак наколькі велічна будзе пададзена на сцэне асяроддзе XVI стагоддзя, пакуль невядома: калектыў чакае адказу на запыт адмысловага гранту.

Акрамя звыклай афішы, Магілёўскі драматычны прапануе арыгінальныя праграмы. Напрыклад, для школьнікаў і студэнтаў будуць ладзіцца "Урокі эстэтыкі, этыкі і маралі", для падлеткаў і моладзі пройдзе спектакль-канцэрт "Магія тэатра". Да таго, літаратурны рэдактар Вольга Семчанка разам з кіраўніком кінаклуба "Рэзананс" Ірынай Ідалевіч распачнуць на малой сцэне тэатра сустрэчы клуба аматараў тэатральнага і кінамастацтва "Новы ракурс". У мінулым сезоне адбылося пару паказаў шэдэўраў кінематографа з наступным абмеркаваннем. Вопыт падаўся цікавым, але арганізатары вырашылі не толькі паставіць сустрэчы на рэгулярную аснову, але і пашырыць тэматыку імпрэз. Плануецца перамяжоўваць бясплатныя сеансы класікі для ахвотных з зачыненымі паказамі для вузкай аўдыторыі: студэнтаў акцёрскага аддзялення Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і прафесійных акцёраў запросяць на прагляд і разбор відэаверсій спектакляў. Прынамсі, ля тэатра ўжо вісяць афішы кінаверсіі "Гамлета" Эймунтаса Някрошуса. Прафесійныя тлумачэнні пабачанага, спецыфіку акцёрскага існавання балтыйскай школы будзе тлумачыць галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога Саўлюс Варнас.

Аб жаданым паляпшэнні фінансавага становішча, адзначаным юбілеі ў мінулым тэатральным сезоне, высокай зададзенай планцы на "Славянскім базары…", старым Хатабычы, які павінен начараваць грошай, і шмат іншым казалі на прэс-канферэнцыі Беларускага тэатра "Лялька" ў Віцебску.

У мінулым тэатральным сезоне адзначалася 30-годдзе тэатра. Цягам гэтага перыяду адбыліся прэм'еры "Горада клоўна Піка" па п'есе Міхаіла Барценева, "Умкі" паводле сцэнарыя Юрыя Якаўлева (абедзве пастаноўкі рэцэнзавала "К"), а таксама быў адноўлены спектакль "Скарб" паводле казкі Уладзіміра Караткевіча "Чортаў скарб". Традыцыйна "Лялька" прымала ўдзел у мностве гарадскіх мерапрыемстваў і праводзіла свае ўласныя, дзе з тэатральным мастацтвам арганічна паядноўваліся жывапіс, музыка, педагогіка, гістарычная навука. І, вядома ж, запомніўся юбілейны капуснік, дзе згадвалі захапляльныя падзеі 30-гадовага шляху.

Пра матэрыяльнае становішча ў няпросты эканамічны час мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра "Лялька" Віктар Клімчук быў вымушаны прамаўляць на прэс-канферэнцыі акцэнтавана, бо гэта ўплывае на фестывальную актыўнасць. І наогул фестываляў становіцца менш усюды, прычынай, — усё той жа фінансавы складнік. Але ж у Казань на II Міжнародны фестываль тэатраў лялек "Шомбай-fest" з "Загубленай душой, або Пакараннем грэшніка" (пастаноўка Алега Жугжды) тэатр паедзе ў канцы верасня. 6 — 7 кастрычніка плануецца паўдзельнічаць на фестывалі ў Калінінградзе, але тут ужо пэўныя цяжкасці з транзітнай візай, якая каштуе 60 еўра на кожнага. Зноў жа пытанні матэрыяльныя…

Урэшце, да грашовых цяжкасцяў сёння тэатрам не прывыкаць. На прэс-канферэнцыі распавядалі пра развіццё фестывалю "Лялечны квартал", які праводзіць тэатр у рамках "Славянскага базара ў Віцебску". Сёлета прыязджалі вядомыя калектывы з Масквы, Мыцішчаў, Кіева і Палтавы, таму зусім нездарма ў адміністратыўных і культурных колах Віцебска прызнавалі, што гэта лепшы праект на "Славянскім базары-2016". Зададзеная высокая культурная планка будзе трымацца і далей, як і казаў Віктар Клімчук: "У мяне іншы погляд на "Славянскі базар...", таму што я лічу, што папса — гэта папсой, але трэба, каб было мастацтва".

Больш за тое, Віктар Клімчук марыць запрасіць лялечныя тэатры з такіх славянскіх краін, як Польшча, Сербія, Балгарыя, хоць зноў, хутчэй за ўсё, паўстануць фінансавыя праблемы, бо трэба будзе плаціць за дарогу. Але ж удзел тэатраў з гэтых дзяржаў прывёў бы да значнага кроку наперад у славянскім руху.

"Лялька" вядомая сваімі дарослымі пастаноўкамі, напоўненымі глыбокім сэнсавым зместам, але і дзіцячыя спектаклі вылучаюцца філасофскім сэнсам і той эстэтычнай прывабнасцю, якая прымушае гледачоў наведваць іх не аднойчы. Зараз "вялікі голад" у касе тэатра менавіта на дзіцячыя спектаклі прыводзіць да неабходнасці пашырэння гэтай часткі рэпертуару. Як адзначыў Віктар Клімчук, калі людзі раней наведвалі 5 — 6 разоў адзін і той жа спектакль, дык цяпер яны больш глядзяць у свой гаманец і бачаць, ёсць грошы ці няма. Таму запланавана прэм'ера "Вясёлага Дарафея" паводле п'есы Ніны Гернет "Гусяня" і пастаноўка паводле апавядання Леаніда Панцялеева "Фенька". Першы спектакль будзе ставіць Віктар Клімчук, а другі — яго сын, які больш вядомы як цудоўны акцёр, Міхаіл Клімчук. У асобе апошняга "Лялька" набыла, нарэшце, другога пастаяннага рэжысёра пасля мастацкага кіраўніка. І гэта не "сямейнасць" у негатыўным сэнсе гэтага слова, бо ён паспяхова скончыў славуты Расійскі дзяржінстытут сцэнічных мастацтваў па спецыялізацыі "рэжысёр тэатра лялек", а яго першая пастаноўка "Горад клоўна Піка" намінавана сёлета на Нацыянальную тэатральную прэмію.

Пра навіну, якая можа значна палепшыць фінансавае становішча тэатра, распавёў яго дырэктар Аляксандр Грыгор'еў. Няхай яна і мае сімвалічны характар… Звязана тое з адзначанай тэндэнцыяй ставіць у горадзе скульптуры. Побач з тэатрам, дзе ёсць аглядавая пляцоўка з ратондай, будзе пастаўлены помнік старому Хатабычу, бо стваральнік гэтага персанажа, пісьменнік Лазар Лагін, родам з Віцебска. Чакаецца, што Хатабыч павінен начараваць нешта значнае ў матэрыяльным сэнсе… А за творчасцю ў Беларускім тэатры "Лялька" справа не стане, што і пацвердзіў Віктар Клімчук: "Трупа збалансавана, ёсць і моладзь, і акцёры сталага ўзросту, усё можна зрабіць з гэтымі людзьмі".

Георгій КАРЖАНЕЎСКІ
Віцебск

Ліёс роспісаў у СШ № 2. / Фота Tut.by

Сітуацыя

Ці не дзікунства?

У самым пачатку адраджэння царкоўнага жыцця напрыканцы XX стагоддзя, аўтар гэтых радкоў выконваў замовы святароў. У прыватнасці, на стварэнне вялікіх алтарных вобразаў касцёлаў у Баранавічах, Дарэва, Ляхавічах і Гарадзеі. Нашу руку праваслаўнага мастака абраў Казімір Свёнтак для стварэння галоўнага вобраза, падараванага кардыналам касцёлу, у якім ён пачынаў сваё пастырскае служэнне. Аглядаючы гэты вобраз, тагачасны апостальскі нунцый спадар Каласуонэ некалькі разоў прамовіў слова "эччэленца" (выдатна).

Нашы гомельскія роспісы "Парнас" і "Хрэстаматыйныя навукоўцы у садзе Лікея", выкананыя ў Дзіцячай школе мастацваў і тагачасным ліцэі (цяпер гімназія № 56), абумовілі перамогу іх аўтара ў неформальным "тэндары" на замову роспісаў інтэр'ераў трох сярэдніх школ Навабеліцкага раёна Гомеля (№ 18 цяпер — Ірынінская гімназія).

Паколькі, за выключэннем летніх вакацый, працяглая праца над роспісамі ў атачэнні "броўнаўскага руху" шкаляроў немагчымая, то яны выконваліся на так званых ДВП і ДСП і прымацоўваліся на сцены. (Такім жа чынам ствараліся вялізныя постаці Ганаровых грамадзян горада Гомеля, якія ўпрыгожваюць рэпрэзентатыўную канферэнц-залу гомельскага Палаца князёў Паскевічаў, у якой ужо сустракаліся кіраўнікі некалькіх краін, з драўніны зроблены і вялізны іканастас Петрапаўлаўскага кафедральнага сабора.)

Наш самы вялікі роспіс, які быў створаны ў СШ № 2 адлюстроўваў постаці славутых гістарычных асоб Беларусі паміж гістарычнымі "молатам і накавальняй" Польшчы і Расіі. Апошнія былі ўвасоблены ў выявах іх геральдычных арлоў, паміж якімі быў адлюстраваны вялізны герб "Пагоня". Асабліва ўдалымі з'яўляліся выявы Еўфрасінні Полацкай, героя Грунвальда, пад нагамі якога быў адлюстраваны сцяг крыжаносцаў, а таксама постаці Стэфана Баторыя і Льва Сапегі з выявай Статута Вялікага Княства Літоўскага ў руцэ. (Менавіта ў той час, малюючы аўтэнтычную выяву Крыжа Заступніцы Беларусі, аўтар добра запомніў "дыспазіцыю" яго рознакаляровых кабашонаў).

На працягу амаль 20 гадоў гэты роспіс упрыгожваў інтэр'ер гомельскай школы. Потым, па прадпісанні супрацоўнікаў МНС быў дэмантаваны і схаваны. А нядаўна інтэрнэт-парталы паведамілі аб тым, як выявамі Еўфрасінні Полацкай і іншых славутых гістарычных асоб Беларусі захоўвалі чысціню тратуара перад парадным уваходам у будынак школы № 2. Змешчаныя фотаздымкі дастаткова красамоўныя. Самае ж прыкрае і жудаснае ў тым, што ў свой час, па ініцыятыве тагачаснага дырэктара гэтай школы спадара Гражкіна, выява Святой Роўнаапостальнай Еўфрасінні Полацкай, сумесна з роспісам, які адлюстроўваў стваральнікаў славянскай пісьменнасці і вялізнай трохмятровай іконай Святога Георгія, была асвечана святаром...

Мікалай ПАЛКОЎНІЧАНКА
Гомель

Палессе кліча

"К" пісала ў красавіку, як сумавалі карыстальнікі сацсетак: "Палессе сёлета не пакліча", маючы на ўвазе меркаванае паменшэнне перыядычнасці фестывалю "Покліч Палесся", што праходзіць раз на два гады ў Ляскавічах Петрыкаўскага раёна. Аднак песімізм аказаўся неабгрунтаваным: фестываль сёлета адбудзецца. Яму папярэднічае этнаграфічны летнік "Сакрэты майстэрства" ў Жыткавіцкім раёне, частка якога ўваходзіць у склад Нацыянальнага парка "Прыпяцкі". Акурат Нацпарк і з'яўляецца галоўным арганізатарам фестывалю.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Асноўныя мерапрыемствы фестывалю пройдуць у Ляскавічах 24 верасня. Удзельнікі этнаграфічнага летніка "Сакрэты майстэрства" будуць даследаваць вёскі Жыткавіцкага раёна, надаючы асаблівую ўвагу асаблівасцям матэрыяльнай культуры. Летнік маладзёжны: сёлета прыедуць студэнты з Гомеля, Мінска і Мазыра. У 2012 і 2014 гадах моладзь працавала ў Петрыкаўскім раёне, па выніках даследаванняў Веткаўскі музей стараабрадніцтва і беларускіх традыцый выдаў кнігу "Этнаграфічны летнік на Петрыкаўшчыне".

Прыпяцкае Палессе да нашых дзён захавала багата рыс самабытнай культуры — народныя святы, фальклор, рамёствы. Сённяшнія даследчыкі ідуць па слядах Чэслава Пяткевіча, Казіміра Машыньскага, Зінаіды Эвальд, Яўгена Гіпіуса, Зінаіды Мажэйкі. Як адзначыла этнамузыколаг Тамара Варфаламеева падчас канферэнцыі "Праблемы рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і ўстойлівае развіццё Палесся" ў Нацыянальнай акадэміі навук, Палессе застаецца самым "спеўным" краем з усіх беларускіх тэрыторый. Аднак якасная фіксацыя праяў яго культуры патрабуе добрай тэхнікі, якой часта не маюць нават прафесійныя даследчыкі.

Каб прадэманстраваць гісторыка-культурную спадчыну і сучасную культуру Палесся, удзел у фестывалі 24 верасня прымуць прадстаўнікі ўсіх раёнаў Гомельскай вобласці, а таксама Лунінецкага, Пінскага, Столінскага раёнаў Брэсцкай. На падворках яны будуць паказваць абрады сваёй мясцовасці. На галоўнай сцэне плануецца прэзентацыя фестывальных брэндаў Гомельшчыны, а таксама выступленні гуртоў з Украіны, Польшчы, Малдовы, Літвы, Расіі. Беларусь будзе прадстаўляць шэраг гуртоў, сярод якіх вядомая гомельская "Ягорава гара". Будзе дзейнічаць асобная фальклорная пляцоўка, дзе плануюцца выступы аўтэнтычных выканаўцаў.

У межах фестывалю пройдзе конкурс юных майстроў "Перазвон талентаў", будзе дзейнічаць пляцоўка "Палесся шчодры ўраджай" (пано з ягад, садавіны і гародніны, аб'ёмныя каркасныя касцюмы).

"Лічбавы" падыход

Святкаванне Дня бібліятэк — нагода пагутарыць пра дасягненні бібліятэкараў за апошнія гады, а таксама пра магчымыя праблемы ў гэтай галіне. Статыстыка ж дапаможа ацаніць тое, што зроблена за апошні час.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

1128:866 на карысць бібліятэк

Напрыклад, як сцвярджаецца на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у краіне на пачатак бягучага года дзейнічала 2,9 тысячы публічных бібліятэк, агульны фонд якіх складаў амаль 60 мільёнаў асобнікаў кніг, часопісаў, рукапісаў і іншых крыніц інфармацыі. У сярэднім на адну бібліятэку прыходзілася 21 тысяча экзэмпляраў бібліятэчнага фонду, а завітала ў айчынныя кніжніцы летась 3,3 мільёна чытачоў. Колькасць карыстальнікаў публічных бібліятэк у мінулым годзе павялічылася да 1128 чалавек у сярэднім на адну ўстанову (у 2000 годзе — 866 чалавек).

Самае цікавае, што сярод карыстальнікаў публічных бібліятэк, згодна са статыстыкай, кожны трэці — сельскі жыхар. Да слова, летась на вёсцы працавала 2,3 тысячы публічных бібліятэк. Іх наведала амаль 1 мільён чалавек, колькасць карыстальнікаў у сярэднім на адну бібліятэку склала 419 чалавек.

Каб пацвердзіць тэзіс пра тое, што ў нашай краіне з кнігай "сябруюць", прывяду такі факт: сярод дзяржаў СНД Беларусь з'яўляецца краінай, дзе чытаюць найбольш. Так, на 1 тысячу чалавек насельніцтва ў 2014 годзе ў нас прыпадала 365 карыстальнікаў публічных бібліятэк. У Расіі гэты паказчык склаў 353 чалавекі, у Казахстане — 286, у Азербайджане — 283.

Акрамя таго, не варта забываць, што сёння ў бібліятэках нароўні з кніжнымі выданнямі карыстальнікам даступныя электронныя каталогі, калекцыі электронных публікацый, а таксама іншыя інфармацыйныя крыніцы ў алічбаваным выглядзе. Але для таго, каб гэтыя электронныя дакументы чытаць, трэба, натуральна, мець з чаго іх чытаць. Як кажуць статыстыкі, на пачатак года ў краіне было камп'ютарызавана 81,2 % публічных бібліятэк, а доступ у Інтэрнэт мелі больш за 68 % публічных бібліятэк (у 2011-м гэта лічба была ўдвая меншай — 32,9 %).

Іншая справа, што прыведзеныя паказчыкі, на жаль, не зусім адпавядаюць найноўшым тэндэнцыям. Напрыклад, згодна з мінулай Дзяржаўнай праграмай "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады планавалася камп'ютарызаваць і падключыць да Інтэрнэту ўсе бібліятэкі краіны. Але, як бачна, зрабіць гэтага не ўдалося.

— Нягледзячы на пэўныя цяжкасці, за апошнія гады нам удалося дабіцца даволі вялікага поспеху ў плане інфарматызацыі бібліятэк, — адзначыў "К" намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша. — Гэта адбылося з-за выдаткавання значных асігнаванняў на набыццё камп'ютараў, на падключэнне іх да Інтэрнэту. Таксама сваю ролю адыграла і аптымізацыя. Разам з тым, на маю думку, камп'ютарызацыя павінна ісці ў комплексе з рашэннем іншых задач. Трэба не толькі паставіць ПК з Інтэрнэтам у бібліятэку, а зрабіць так, каб супрацоўнікі ўстановы маглі аказваць шэраг інфармацыйных паслуг сваім наведвальнікам, пачынаючы ад пошуку канкрэтных электронных дакументаў да карыстання электроннымі базамі даных Нацыяналкі ці сваёй абласной "кніжніцы". Карацей, каб бібліятэка зрабілася сапраўдным інфармацыйным цэнтрам, адкрытым усяму свету. Прагрэс у гэтым плане ёсць, таму ў будучыню варта глядзець з аптымізмам і працягваць тую працу, якая паслядоўна ідзе зараз як у сталіцы, так і ў рэгіёнах...

К

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце ў акаунтах kimpressby** у сацыяльных сетках **Facebook, Vk, Twitter, Instagram**

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Такія творы, напэўна, ён не хацеў бы дазваляць публікаваць. Прынамсі з поўнымі звесткамі пра яго. Дасюль здараецца, што людзі баяцца выконваць "палітычныя" прыпеўкі пра лідараў савецкага часу, калектывізацыю. Ці выконваюць і кажуць даследчыку "толькі для цябе, нікуды не пускай". Даследчык павінен сумленна тлумачыць інфарманту, як і навошта фіксуецца гутарка. І атрымліваць ад яго згоду на гэта, пажадана пісьмовую. Той жа "Вольны архіў" заўважае: "Само існаванне дамовы, якая адпавядае фармальным патрабаванням закона, яшчэ не гарантуе этычнасці працы даследчыка з інфармантамі. І наадварот, адсутнасць дамовы не азначае, што праца вядзецца неэтычна. Але існаванне дамовы, прынамсі, звяртае ўвагу даследчыка на прававы аспект і накладвае на яго абавязкі і абмежаванні, за парушэнне якіх можа наступіць адказнасць". З іншага боку, дамова гарантуе даследчыку права на выкарыстанне і публікацыю матэрыялаў, ахоўвае яго ад патэнцыйных праблем.

Фіксаванне звестак падчас адной з экспедыцый СЭТ. / Фота Алены ЛЯШКЕВІЧ

Інфармант мае права?

А ці былі прэцэдэнты?

Яўген Партны паведаміў, што аўтарскае права на этнаграфічныя матэрыялы застаецца ў Беларусі досыць абстрактным паняццем. У нас судовыя справы ў галіне інтэлектуальнай уласнасці завязваюцца пераважна вакол камп'ютарных праграм і гандлёвых знакаў.

Таму цікава паглядзець на практыку іншых краін. У Літве навукоўцы заключаюць з інфармантам караценькую дамову, дзе паведамляецца, што той не супраць "выкарыстання расповеду ў навуковых і асветных мэтах". Асяродак "Гарадская брама — Тэатр NN" у польскім Любліне займаецца ўспамінамі пра яўрэяў гэтага горада і прапануе інфармантам больш удакладненую дамову, дзе прапісаны шляхі выкарыстання звестак (публікацыя, размяшчэнне ў інтэрнэце…). У ЗША дзейнічае Кодэкс этыкі Амерыканскай антрапалагічнай асацыяцыі, які кажа, у прыватнасці, што "…антраполагі не павінны прыхоўваць мэты, магчымыя наступствы і крыніцы падтрымкі даследчыцкіх праектаў…" Затым: "Антраполагі павінны рабіць усё магчымае, каб гарантаваць, што іх даследаванне не шкодзіць бяспецы, годнасці і прыватнаму жыццю людзей, з якімі яны пра-

Каментарыі з нагоды

Ірына ГЛУШЭЦ, вядучы метадыст па этнаграфіі і фальклоры Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці:

— Калі экспедыцыю арганізуе ўстанова культуры, адукацыі ці навуковая ўстанова, то аўтарскае права на сабраныя матэрыялы належыць ёй як арганізатару, а ўдзельнікі стварылі службовы твор. Калі ініцыятар экспедыцыі — грамадская арганізацыя, а даследчыкі не з'яўляюцца яе супрацоўнікамі, то лепш заключыць пісьмовую дамову. Наш цэнтр мае намер так рабіць падчас экспедыцый, што ўваходзяць у мерапрыемствы фестывалю "Покліч Палесся". Пісьмовых жадамоў з інфармантамі не плануем, звычайна згода чалавека на выкарыстанне расповеду запісваецца на дыктафон.

Марыя ЛУК'ЯНАВА, адказная за экспедыцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства:

— Заканадаўства аб аўтарскім праве ў Беларусі не распрацаванае да такіх "драбінак", пра якія вядзецца гаворка. Але сёлета мы ўпершыню падпісвалі дамовы і з удзельнікамі экспедыцыі, і з інфармантамі. Па іх даследчык можа захоўваць копію сваіх матэрыялаў, але не можа яе камусьці перадаць без згоды арганізацыі. Публікацыя матэрыялаў экспедыцыі, калі гэта гутарка цалкам ці анталогія, мусіць здзяйсняцца са згоды арганізацыі. Але ўдзельнік можа публікаваць фрагменты гутаркі з інфармантам, напрыклад, у сацыяльных сетках ці цытаваць у даследаванні з пазнакай, што звесткі сабраныя ў экспедыцыі СЭТ. Пісьмовыя дамовы заключаліся з інфармантамі, з якімі мы працавалі сістэмна. Вусная згода астатніх — на дыктафоне. Мы паступова адкрываем архіў для публічнага доступу, але там няма імя і прозвішча інфарманта. Калі звесткі патрэбны навукоўцу для публікацыі, ён атрымае іх па запыце.

Аляксей БІЧУРЫН, кіраўнік Цэнтра па калектыўным кіраванні маёмаснымі правамі Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці:

— Шмат якія аспекты аўтарскага права дапускаюць суб'ектыўнае тлумачэнне. Вялікае пытанне, ці можна разглядаць успаміны, расповед пра маладосць ці апісанне этнаграфічнага абрада як твор. Твор — гэта вынік творчай дзейнасці, увасоблены ў аб'ектыўнай форме. Аўдыязапіс — аб'ектыўная форма. А вось крытэрыяў творчай і нятворчай дзейнасці заканадаўства аб аўтарскім праве не ўтрымлівае. Калі браць азначэнне творчасці як "стварэнне новага, чаго раней не было" — то паўстае пытанне, наколькі яно новае. У выпадку спрэчак на гэ-

Разбор уласнага палёту

Нарэшце, прыспеў час падвесці вынік нашага "каласавання" ў апошнюю суботу лета. Нагадаем, газета "Культура" супрацоўнічала з Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа ў праекце "ПаКаласімся!"

Аліна САЎЧАНКА

Пачну з пытанняў. Мы да апошняга не ведалі, на якую публіку арыентуемся і што хочам да яе данесці, не мелі маштабнай задачы. Мне і зараз складана адказаць на пытанне: што такое "ПаКаласімся!", як назваць фармат мерапрыемства, ці часта павінна адбывацца падобнае ў музеі. Усё атрымалася прыстойна, але з верагоднасцю, бадай, у 50 працэнтаў магло праваліцца, таму што мы працавалі без канцэпцыі, разлічваючы на выдатных запрошаных выступоўцаў, аўтарытэт музея і газеты, спрыяльнае надвор'е і фартуну. Таму самая галоўная выснова з экспірыенсу: прагаворванне мэты і ўмоваў яшчэ на беразе. Заўсёды трэба ведаць, для каго і для чаго ты нешта робіш, што хочаш даць і атрымаць з гэтага.

Па-другое, мерапрыемства праводзілася без укладання матэрыяльных сродкаў. Гэта добры варыянт для пробнага разу, але не адносна перспектывы.

Трэцяя, не менш важная заўвага. Мы запрасілі людзей амаль на шэсць гадзін: яны малявалі, спявалі і танцавалі, займаліся ўзвядзеннем трэш-скульптур, слухалі лекцыю, а потым амаль адразу пайшлі на кінапрагляд. За такі адрэзак часу, каб апынуліся дома, дык, пэўна, ужо разы два ўсадзілі б гасцей за стол. А мы змаглі прапанаваць толькі гарбату ды сухарыкі. Канешне, у музей, у першую чаргу, прыходзяць не страўнік набіць, але, калі мы хочам затрымаць аўдыторыю, за намі — стварэнне камфортных умоў. Прызнаюся, мы, два калектывы, да апошняга шукалі партнёра са сферы харчавання.

З добрага. Для мяне раскрылася яшчэ адна цудоўная музейная "групоўка" — коласаўцы, людзі прафесійныя, адукаваныя і свядомыя, ды пры гэтым вясёлыя, шчырыя, лёгкія на ўздым. Ці гэта не ідэальны набор якасцей для іх прафесіі? А калі добры калектыў мае ці не лепшую музейную пляцоўку ў горадзе (са стратэгічнага пункту гледжання ды адносна атмасферы)? Яшчэ мне стала зразумела, як зжылі сябе старыя рэкламныя метады — пашырэнне інфармацыі праз газеты, тэлебачанне ці радыё. Інтэрнэт — вось сапраўднае выйсце. Менш чым за два тыдні, дзякуючы сацыяльным сеткам, мы праінфармавалі тысячы чалавек (гэта колькі паштовых скрыняў трэба было б абысці!). Да нас, у выніку, прыйшло 70+ асоб, што для мемарыяльнага музея і новага праекта можна лічыць вынікам. Але, працягваючы, варта імкнуцца да больш высокіх лічбаў. Што ні кажы, інтэрнэт — бясплатны спосаб прасоўвання, якім карыстаюцца ўсе.

Як чалавека ў добрым сэнсе прагматычнага, мяне ўсцешылі перспектывы, якія раскрыліся на "ПаКаласімся!" Напрыклад, прапанова мастака Андрэя Дубініна чытаць бліскучыя лекцыі па мастацтвазнаўстве ў сценах музея. За "дзякуй" і пры ўмове інтэлектуальнага слухача. Упэўнена, курс спадара Дубініна стаў бы топавым мерапрыемствам у горадзе ў самым хуткім часе. Тое ж тычыцца і калямузейнай зялёнай пляцоўкі. Мы праверылі яе на "пленэрнасць", і яна атрымала 100 балаў са ста магчымых.

Лета скончылася, а разам з ім і плюсы, звязаныя з доўгім светлавым днём, цёплым надвор'ем, вакацыямі і адпачынкамі ў гараджан. Але бліжэйшыя месяцы музей не перастане быць менш прывабным, трэба толькі задумаць нешта незабыўнае і, галоўнае, людзям неабходнае і цікавае. А "ПаКаласімся!" можна назваць карысным вопытам для музея, ды і для газеты.

Для мяне галоўнае ў "ПаКаласімся!" — спроба. Вядома, было цікава, а што ж атрымаецца на выхадзе, але спроба — найперш. Патлумачу.

Сяргей ТРАФІЛАЎ

Некалькі нумароў таму, "пад заслону" апагея фестывальнага сезону, журналісты "К", і я ў тым ліку, выказаліся адносна застойных тэндэнцый у гэтай частцы культурнага працэсу. Нібыта жыццё віруе на нашых фэстах, але штогод — на тым самым месцы і па тым самым сцэнарыі. Вось адзін фрагмент таго тэксту: "Новай патэнцыйнай публіцы культурнай дзеі хочацца культурнага свята, аднадумцаў навокал, якаснай выверанай праграмы, а не па завядзёнцы — што ёсць, тых і прадставім. Гэта як на музычных фестывалях: едуць на пэўных артыстаў, таму іх арганізатары і заманьваюць. Карацей, прыспеў час задумацца пра мэтавыя аўдыторыі мерапрыемстваў".

Ад падобнага, падаецца, і варта было адштурхоўвацца рэдакцыі і музею, але ж з мэтавай аўдыторыяй выявілася праблема. Адносна чытачоў папяровай версіі нашай газеты яна, як правіла, па-за межамі Мінска і нават абласных цэнтраў, а вось падпісчыкі старонак у сацыяльных сетках — у значнай ступені мінчане. Ды і разлічваць мы маглі найперш на апошнюю групу (і "пляцоўка" — сталічны музей). Не маючы, праўда, ніякіх магчымасцяў для іншай рэкламы, акрамя бясплатнай — у сацыяльных сетках газеты

цуюць…", "антраполагі павінны вызначыць загадзя, ці жадаюць […] інфарманты захаваць ананімнасць або атрымаць вядомасць", "антраполагі павінны загадзя інфармаваць пра даследаванне і атрымліваць згоду асоб, якія даследуюцца".

У беларускай сітуацыі, калі інфарманты — людзі сталага веку, што падазрона ставяцца да чужых, адразу даставаць пісьмовую дамову — значыць папросту спужаць інфарманта. Звычайна дамову ахвотна падпісваюць пасля размовы, раззнаёміўшыся з даследчыкам.

Яшчэ некалькі вытрымак з таго ж кодэксу: "Антраполаг павінны… пры любой магчымасці распаўсюджваць вынікі даследванняў"; "Антраполагі павінны сур'ёзна разглядаць усе разумныя просьбы доступу да іх даных і іншых даследчыцкіх матэрыялаў у мэтах даследавання", а таксама "рабіць вынікі даследаванняў даступнымі для [...] неантраполагаў". У беларускіх рэаліях зноў жа складана гэта рэалізаваць: часам даследчык хоча апублікаваць матэрыялы сам, але на апрацоўку іх не хапае часу, і яны ляжаць у асабістым архіве гадамі…

ты конт варта звяртацца ў суд, які, у сваю чаргу, выносіць рашэнне на падставе экспертнага заключэння. Калі разглядаць трохкутнік з ініцыятара даследавання (установы), даследчыка і інфарманта, то ініцыятар з'яўляецца вытворцам фанаграмы, сам даследчык — уладальнікам аўтарскіх правоў, як і інфармант, калі мы вызнаем іх размову вынікам творчай дзейнасці. Правы стваральніка фанаграмы залежаць ад правоў выканаўцы. Строга кажучы, не атрымаўшы дазволу інфарманта, нельга выкласці яго расповед ці песню ў сацыяльную сетку. Але на практыцы варта ацэньваць рызыкі: ці будзе інфармант выстаўляць прэтэнзіі?

Этнаграфія ў сеціве

Дапусцім, урэгуляваўшы стасункі з інфармантам, даследчык хоча распаўсюдзіць матэрыялы. Наяўнасць музычных файлаў на старонках сацыяльнай сеткі мы прызвычаены ўспрымаць як належнае, аднак выкарыстанне твораў без дазволу праваўладальнікаў з'яўляецца парушэннем. Выкласці запісы ў сеціва — гэта спосаб выкарыстання, які падпадае пад азначэнне "ўсеагульнае абвяшчэнне". Калі яно робіцца без дазволу, то гэта правапарушэнне са штрафам 30 — 50 базавых велічынь для фізічных асобаў і яшчэ большым — для юрыдычных (але для гэтага трэба, каб хтосьці з праваўладальнікаў падаў на парушальніка ў суд ці прынамсі звярнуўся ў міліцыю).

Як не атрымаць штраф у 50 базавых за народныя песні ў сеціве?

Калі ж мы дадаем незаконна запампаваны кімсьці трэцім у сеціва запіс да свайго допіса ці каментарыя, то, па сутнасці, ўдзельнічаем у правапарушэнні.

Па практыцы выкарыстання этнаграфічных запісаў у сеціве суполка "Вольны архіў" дае наступныя парады. Калі мы збіраемся самі запампаваць у сеціва нейкі аўдыязапіс, то папярэдне запытваем дазволу ў асобаў, якія маюць на яго правы — аўтараў, ці выканаўцаў, ці ўладальнікаў арыгіналаў запіса. Этнаграфічныя запісы выкананняў народных твораў можна запампоўваць у сеціва не пытаючы дазволаў, калі сумежныя правы ўжо не дзейнічаюць. То бок, праз 50 гадоў пасля ажыццяўлення запісу або яго першай публікацыі. Калі мы хочам дадаць да паста ці каментарыя сацыяльнай сеткі спасылку на аўдыязапіс, ужо кімсьці запампаваны, то спярша пераконваемся, ці ёсць ён на афіцыйнай старонцы (суполцы) выканаўцы. Бо гэта азначае, што выканаўца сам размясціў запіс для ўсеагульнага ведама, па сутнасці зрабіўшы яго здабыткам грамадства.

К

Каментарыі з нагоды

Вольга ЛАБАЧЭЎСКАЯ, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Універсітэта культуры і мастацтваў:

— Беларускія даследчыкі, музеі часта не дужа дасведчаныя ў аўтарскім праве. Напрыклад, могуць узяць чужое фота, не пазначыўшы ні крыніцы, ні аўтара. Дамовы з інфармантамі звычайна не заключаюцца, калі чалавек ставіцца насцярожана — вусная згода на выкарыстанне расповедаў запісваецца на дыктафон. У іншых краінах патрабуецца згода на друк успамінаў. У Расіі гэтага не жорстка прытрымліваюцца, а ў Польшчы, ахоўваючы таямніцу прыватнага жыцця, імя і прозвішча інфарманта шыфруюць, праз шыфр звесткі можна знайсці ў архіве. У публічным доступе можа быць пазначана "КІ, жанчына, 50 гадоў". Што да суаднесенасці правоў даследчыка і ўстановы, ад імя якой ён працуе, то пры ўмове наладжанай архівізацыі ў даследчыка павінен быць уласны фонд. Пакуль у большасці выпадкаў публікуюцца звесткі "з уласнага архіва аўтара".

Ірына КАШТАЛЯН, супрацоўніца Архіва вуснай гісторыі:

— Першасныя правы на інтэрв'ю належаць рэспандэнту. Для таго, каб выставіць інтэрв'ю на сайце, мы падпісваем з рэспандэнтам дамову. У ЗША без такой дамовы інтэрв'ю нельга выкарыстаць, нават калі ёсць зафіксаваная вусная згода рэспандэнта. У Еўропе больш мяккая практыка — можна пазначыць толькі імя і першую літару прозвішча суразмоўцы. Дамова трэба і для таго, каб чалавек, пабачыўшы транскрыпцыю, не сказаў "прыбярыце", бо атрымліваецца цэнзураванне першакрыніцы. Даследчыкаў часта прымаюць за журналістаў, таму істотна патлумачыць, што расповед будзе перададзены слова ў слова, не так прыгожа, як у газеце. Найперш варта інфармаваць чалавека, што яго ўспаміны публікуюцца, калі гэта не маленькая цытата, а цэласны наратыў. Мы падпісваем дамовы з даследчыкамі і для таго, каб людзі разумелі, што ў рэспандэнта ад цяжкіх успамінаў можа адбыцца рэтраўматызацыя. Мы толькі вітаем выкарыстанне матэрыялу самім даследчыкам, ды і навукоўцу зручна спаслацца на пэўны архіўны шыфр. Просім, каб спасылаліся разам з архівам і на экспедыцыю.

Сяргей ВЫСКВАРКА, загадчык арганізацыйна-творчага аддзела Любанскага ДК:

— У раёне ўзяты пад ахову дзяржавы як нематэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць спеўны стыль выканання трох вёсак. Адну і тую ж народную песню могуць ведаць сорак бабуль. За кім аўтарскае права на такі твор?... Дамоў з інфармантамі, збіраючы матэрыял, я не падпісваю. Складана ўявіць, каб у галіне этнаграфіі распачалі судовую справу. Гэта сфера, дзе няма грошай, значыць, і практыка выкарыстання заканадаўства не распрацаваная.

Сёлета ўвесну ў нашым раёне дзейнічала экспедыцыя па этнабатаніцы. Ёй кіравалі эстонскія навукоўцы з музея ў Тарту, таму збіральнікі працавалі па іх методыцы. Спачатку размаўлялі з людзьмі, а напрыканцы гутаркі пыталіся імя і прозвішча, узрост, і ці не супраць чалавек, каб яго расповед быў выкарыстаны для навукі. Некаторыя адмаўляліся прадставіцца. Я мяркую, людзей насцярожваў падыход: усё ж беларускія даследчыкі спачатку знаёмяцца, а потым вядуць гутарку. Калі чалавек згоды на выкарыстанне сваіх звестак не даў, то ў эстонскай практыцы звесткі ўсё роўна могуць выкарыстоўвацца, проста без пазначэння імя інфарманта (тады пазначаецца месца пражывання, пол і ўзрост).

Неяк размаўляў пра аўтарскае права са знаёмымі літоўцамі. З іх расповеду ў агульных рысах вынікае, што ў Літве паспрабавалі неяк юрыдычна аформіць этнаграфічныя даследаванні, але сутыкнуліся са шматлікімі складанасцямі, нюансамі і пакуль не прыйшлі ні да якога рашэння.



Лекцыя Андрэя Дубініна падчас "ПаКаласімся!" / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

і музея, а таксама ў выглядзе рассылкі прэс-рэлізаў. Пры гэтым маючы ў "пасіве" аглушальны поспех (нават паводле масіраванай рэкламы) фестывалю "Тбілісоба", праграму фэсту "Пешаходка", фінал марафона класікі ля Ратушы, яшчэ некалькі дзей. Усё — задарма, а ў нас — кошт білетаў у 1 рубель. Няшмат, але пры бясплатнасці ва ўмоўных канкурэнтаў…

Тэхналогію рэкламнай кампаніі ў тры дзясяткі пастоў у сацсетцы апісваць не стану. Фактычна, яе не было, бо маючы крыху часу паміж рэдакцыйнымі ды музейнымі справамі, і рабіліся абвесткі, "клеіліся" афішкі ў фотарэдактары, шукаліся спасылкі. Усяго дзён за дзесяць да дня Х! Паведамленні, праўда, былі персаніфікаванымі: пра кожнага ўдзельніка — дзве — тры згадкі цягам гарачай для нас дэкады, заснаваныя на публікацыях газеты. Дадатковы чалавечы рэсурс — 0, фінансавы — 0, часу — 0. Гэта, падаецца, і называецца энтузіязмам.

Карацей, як думаецца мне, не маючы дакладнага ўяўлення пра тое, каго мы і музей можам пабачыць на сядзібе Коласа ў апошнюю суботу лета, заставалася масіравана прасоўваць праграму. Галоўным асабіста для мяне было адасобіцца ад распаўсюджанага ў нас фармату "свята народнай музыкі і песні", таго, чаго "новай патэнцыйнай публіцы культурнай дзеі" (даруйце за самацытату), так не хочацца. Мы хутка знайшлі паразуменне з музеем, падахвоціліся разам на эксперыментатарскі крок. Таму галоўным словам было, відаць, "інакш". І адштурхоўваліся мы са свайго боку ад адмаўлення. Балазе, як вы ўжо зразумелі з памянёнага вышэй слова "энтузіязм", бюджэт імпрэзы быў роўны, без малога, таму самаму нулю (заключаўся ён у сціплай закупцы матэрыялаў для аднаго з майстар-класаў). Адпаведна, нерэальна запрасіць медыйных персон на безганарарнай аснове. Але ж ёсць сябры (для кагосьці з "культураўцаў" ці музейшчыкаў — асабістыя, іншыя — для ўсёй установы), што адразу сказалі: "ОК".

Як на маю думку, пры амаль нулявых фінансавых укладаннях і пры значных інтэлектуальных у нас першы блін — не камяком. 70+ чалавек, што прыйшлі на Коласаву сядзібу, сітуацыя, калі творцы і гледачы не засталіся незадзейнічанымі, атмасфернасць больш як пяцігадзіннай дзеі ў незвычайным месцы, — гэта "актывы". У некаторым сэнсе — нашы, газетныя, бо рэклама, найперш, сыходзіла ад нашых вэб-рэсурсаў. Значыць, мы запрашалі пад сябе, пад сваё імя. Думаецца, яно ад такой акцыі займелі больш трывалыя сувязі з чытачамі. Але яшчэ больш гэтыя "актывы" — музейныя. Коласаўскі дом, калі захавае традыцыю і працягне насычаць яе зместам з пэўнай перыядычнасцю, займее свой брэнд. Эксперты ў сферы бізнесу кажуць: праз пару гадоў гандляваць будуць найперш брэндамі. Крок да спробы асучасніць музейную прастору (не толькі ўласна экспазіцыю) зроблены.

І яшчэ. "ПаКаласімся!" атрымалася гарадской дзеяй для тых людзей, якім не даспадобы грамыханне музыкі на вялізных пляцоўках, але цікава адкрываць незнаёмыя мясціны ў знаёмым горадзе, бачыць інтэлігентных і зацікаўленых культурай, неабыякавых да беларускага, ахвочых да новага. 70+ гасцей, якія прыйшлі, прынамсі, з апошняй мэтай, выглядаюць куды больш сур'ёзна, чым няхай сабе і тысячы тых, хто зварочвае на чарговы "дзень шашлыка".

Дзякуй за настойлівую і выніковую прапанову зрабіць "нешта цікавае" дырэктару музея Коласа Зінаідзе Камароўскай, за плён супольнай працы — вучонаму сакратару Яўгеніі Мятлушка і загадчыку аддзела навуковай прапаганды Марыі Казакевіч. З боку газеты — найперш аглядальніку Аліне Саўчанка. Важкі ўнёсак у тое, каб свята адбылося, зрабілі нашы Наталля Овад і Алег Клімаў. Назву прыдумаў Яўген Рагін. За "мазгавы штурм" і канкрэтныя справы дзякуем усім "коласаўцам" і "культураўцам".

К

Дзяжурны па нумары

Знарок і не

Распавяду пра назіранні, якія ўпэўнілі мяне, наколькі малы час і, у маштабах краіны, невялікія выдаткі патрэбныя для таго, каб сфармаваць у самай шырокай грамады ўяўленне станоўчасці ўсведамлення сябе беларусамі. Карацей, пра незнарочысты і знарочысты патрыятызм.

Сяргей ТРАФІЛАЎ

Сярод маіх знаёмых ёсць тыя, каму колькасць вышываначных элементаў, што цягам апошніх месяцаў актыўна множыцца ў розных праявах візуальнай камунікацыі, падаецца, мякка кажучы, залішняй. Відаць, ад таго, што, пачаўшыся як грамадская ініцыятыва, цяпер яны сталі нагадваць бег навыперадкі: маўляў, хто зробіць тыя дэталі лагатыпаў, упаковак, банераў найбольш кідкімі, той малайчынка. Прымаючы гэта скептычнае меркаванне і такую яго аргументацыю, мне ўсё ж тэндэнцыя падабаецца. Пакрысе за кошт візуалізацыі мы рушым да асноўнага, да сутнасці, да свядомасці. Хоць і знарочыста.

Далей — сіла слова. Падаецца, у сучасным свеце "спажывання" інфармацыі поглядам выява замяніла і пісьмовае, і агучанае слова. Але калі ўбачыў на майках беларускай зборнай па баскетболе простае і яснае "Зборная тваёй краіны", няхай і на рэкламным плакаце, верце-не верце, нешта ўнутры затрымцела прыемнай дрыготкай. А якая шыкоўная назва "Белыя крылы" (і адразу метафарычная глеба для далейшай раскруткі) нацыянальнай каманды па футболе! І адразу ж перапоўненая "Барысаў-Арэна"! Гэта пра патрыятызм выказаны, але ўжо незнарочысты, як мне падаецца.

І трэцяе назіранне. Фестываль хмелю, соладу і вады ў Лідзе. Мо хтосьці падумае, што ўражанні на ім і канцэнтруюцца вакол прадукту, што атрымліваецца пры спалучэнні названых інгрэдыентаў. Ані! Вядучы Віталь Воднеў паміж выступленнямі гуртоў хэдлайнераў на галоўнай сцэне ("Трубяцкі", "Нейра Дзюбель", "Здоб шы здуб", "Бі-2") займаў паўзы не толькі рэкламаваннем брэнда-арганізатара, але і спевамі са шматтысячным натоўпам. І калі спачатку гэта былі агульнавядомыя рэчы, скажам, з мультфільмаў савецкай эпохі, дык раптам усё змянілася. І Дажынкавая плошча Ліды пачала спяваць "Бялявую, чарнявую…", "Калядачкі" і далей па рэпертуары "Песняроў", затым далучыліся і больш сучасныя "Тры чарапахі" і "Госці" Лявона Вольскага. Ну а лейтматывам гучалі словы "любоў" і "Беларусь" у разнастайных спалучэннях. І, думаю, ні ў каго са збольшага маладой аўдыторыі не ўзнікала шырока тыражаванай у некаторых крыніцах "грэблівасці" да "звонкага "дзе" і густога "чаго", ужо даўно міфічнага непрымання моладдзю беларускай мовы, паблажлівасці да беларускай музыкі.

Цяпер, праз пару тыдняў, думаю: знарочысты ці незнарочысты такі патрыятызм? Калі ўбачыў, як Віталь заскочыў у прэс-палатку за сцэну і папрасіў калег правесці невялікі "мазгавы штурм", каб прыгадаць агульнавядомыя песні для наступнага яго выхаду на сцэну, я зразумеў, што гэта — імправізацыя. Але як яна прыдалася для абсалютна, падавалася б, нетэматычнай імпрэзы! Урэшце, характар патрыятызму ў дадзеным выпадку мо і не мае асаблівага значэння. Мы пакуль (на жаль) у пачатку гэтага простага і складанага адначасова шляху любові да свайго.

К

Доктар, неабыякавы да культуры

Сёння той рэдкі выпадак, калі "К" робіць выключэнне і выбірае для размовы чалавека зусім не са сваёй галіны. Госць "суботніх сустрэч" доктар медыцынскіх навук, прафесар, урач-герыятр, старшыня Беларускага рэспубліканскага геранталагічнага грамадскага аб'яднання, загадчык кафедры Інстытута павышэння кваліфікацыі Федэральнага медыка-біялагічнага агенцтва (Масква) Андрэй ІЛЬНІЦКІ. А па сумяшчальніцтве — самы неабыякавы да беларускай культуры доктар.

Аліна САЎЧАНКА / Фота аўтара

Спроба прафагляду сферы ад геранталага

— Калі метафарычна апісаць сферу беларускай культуры і мастацтва як чалавека, то што яна будзе ўяўляць з сябе?

— Нечаканае пытанне. Я параўнаў бы беларускую культуру з тым светам, у якім я быў выхаваны. Я нарадзіўся ў Полацку і жыў на вуліцы Леніна, што раней называлася Вялікай, а потым Ніжнепакроўскай. І вось на гэтай вуліцы знаходзіцца ўсё тое, што ўвасабляе беларускую гісторыю, беларускую культуру, што дало штуршок для развіцця нашай дзяржаўнасці, нацыі. Гэта Сафійскі сабор, Богаяўленскі сабор, славутая брацкая школа, а таксама асобы Францыска Скарыны, Ефрасінні Полацкай, Усяслава Чарадзея, якія далі штуршок для развіцця нашай дзяржаўнасці, нацыі.

Мой бацька, былы кіраўнік Полацкага нацыянальнага гісторыка-культурнага запаведніка, Міхаіл Ільніцкі, сябраваў з мастачкай Нэлі Шчаснай, якая родам з Полацка. Яна перадала сваю калекцыю твораў Полацкаму ўніверсітэту. І вось у Шчаснай ёсць вядомая карціна пад назвай, калі я не памыляюся, "Дома". Гэта выява Сафійскага сабора, на яго фоне стаіць маці мастачкі і трымае на руках маленькую Нэлі. Вось гэта для мяне беларуская культура, мой дом. І канешне, беларуская мова. Я шмат вандрую па свеце, шмат дзе бываю, апошнім часам жыву ў Маскве. Але да беларускай мовы ты вяртаешся заўсёды, калі хочаш выказаць нешта зусім уласнае, тое, што на тваёй душы. Я ўвогуле хачу зазначыць, што зараз свет вельмі касмапалітычны, асабліва калі глядзіш на студэнтаў, што вучацца па балонскай канвенцыі: у адной краіне яны атрымліваюць адукацыю, у іншай потым працуюць. Пры тым кожны чалавек павінен мець кавалак той самай зямлі там, дзе ён адчувае сябе дома. Вось гэта для мяне Беларусь, беларуская культура, беларуская мова, гэта, па сутнасці, тое, чым я з'яўляюся.

— Дарэчы, як вы ставіцеся да касмапалітызму? І ці не рызыка гэта назаўсёды страціць сваю радзіму?

— Я нядаўна быў у Санкт-Пецярбурзе, на V Еўрапейскім кангрэсе па прэвентыўнай рэгенератыўнай антыўзроставай медыцыне, дзе пазнаёміўся з Раісай Цярохінай, загадчыцай кафедры тэорыі і методыкі мастацкай гімнастыкі Інстытута імя Лесгафта ў горадзе на Няве. І падчас нашай размовы аказалася, што родам яна з Беларусі, з-пад Валожына, але вырасла ў Пецярбурзе. Кожны год спадарыня Раіса ездзіць на малую радзіму дзеля таго, каб як яна па-беларуску кажа, "пасядзець на родным бацькоўскім ганку". Мы часта кажам: мала хто размаўляе па-беларуску, мова губляецца. Канешне, яе трэба падтрымліваць. Але сэнс не толькі ў мове, сэнс у самім пачуцці радзімы. Беларусы, дзе б яны ні жылі, заўсёды вяртаюцца сюды. Насамрэч цяжка згубіць нацыянальную ідэнтычнасць.

— Зараз часта дамінуе старая школа. Гэта тычыцца і музеяў, і тэатраў, і дамоў культуры, і спецыялізацый ВНУ, фестываляў. Добра гэта ці дрэнна? Чаму так адбываецца? Чаму працэс перадачы вопыту такі кансерватыўны?

— Ён заўсёды быў такім. Гэтак і павінна быць. Таму што патрэбны падмурак, на якім і будзе ўзрастаць здаровае, трывалае, новае. Урэшце, новыя ідэі ў навуцы, медыцыне павінны абапірацца на сталы вопыт. І гэта тычыцца ўсяго жыцця.

— Але голас маладых часта заглушаецца...

— Не пагаджуся. Чым больш "прыгод" у маладога амбіцыйнага чалавека, з ведамі, таленавітага, тым лепш для яго. Праз выпрабаванні трэба прайсці кожнаму. Над кожным маладым чалавекам, які мае слушныя ідэі, стаіць яшчэ больш моцная генерацыя людзей, якія часам маюць іншы светапогляд. І каб даказаць нешта, юнакам давядзецца сутыкнуцца з пэўным непаразуменнем, супраціўленнем. Трэба разумець, што лёгка нічога нікому не даецца.

— Дарэчы, як медыцына ставіцца да праблемы "бацькоў і дзяцей"? Як суіснаваць, напрыклад, у адным калектыве?

— Я ў Маскве зараз працую намеснікам дырэктара па навуцы навуковага медыцынскага цэнтра "Геранталогія" і адначасова — загадчыкам кафедры ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі Федэральнага медыка-біялагічнага агенцтва. І так склалася, што ў апошнім ў адміністрацыі працуюць людзі досыць сталага века. Але, ведаеце, гэта лепшы калектыў, які я бачыў. У нас маладая кафедральная крэатыўная каманда, якую вельмі падтрымлівае кіраўніцтва. Увогуле, няма лепш выпадка, чым калі малады ўрач трапляе ў аддзяленне да дактароў старога пакалення. У старэйшага пакалення ўжо, як правіла, скончыліся амбіцыі. У іх ёсць вопыт, які яны часам вельмі шчодра перадаюць.

— Але, як паказвае практыка, калі малады мастак трапляе пад крыло майстра, то часцей за ўсё адбываецца кланіраванне.

— Гэта залежыць ад таленту. Безумоўна, некаторыя рысы школы пэўнага майстра перадаюцца. Але каб "выйсці за межы" свайго настаўніка, каб нешта дадаць, для гэтага мае быць асабісты дар. Пад кіраўніцтвам майго настаўніка, кіраўніка кандыдацкай дысертацыі — знакамітага беларускага прафесара Эдуарда Вальчука, якому сёлета 80 гадоў, стваральніка айчыннай школы арганізатараў аховы здароўя, абаронена больш як 10 дысертацый, пры гэтым ён вельмі жорстка ставіўся да вучняў, вельмі раздражняўся нават няправільна пастаўленай косцы ў сказе. Але навучыў, як трэба выкладаць думкі, працаваць над зборам матэрыялаў. І вось я бачу, як наступнае пакаленне вучняў Вальчука вылучае новыя ідэі ў навуцы. Гэта мера таленту, усе мы стаім на нейкім падмурку.

— Адваротны бок медаля: з-за таго, што ў нас крытычна не хапае спецыялістаў, учарашніх выпускнікоў ВНУ адпраўляюць у рэгіёны і ставяць на пасады дырэктараў дамоў культуры, рамёстваў і г. д. Ці добра гэта?

— У мяне тут асабісты досвед. Ведаеце, калі скончыў інтэрнатуру, мне было 23 гады. Я адразу стаў загадчыкам аддзялення медыцынскай рэабілітацыі ў Полацкай гарадской паліклініцы. Яно было вельмі вялікім, там было 50 ці 60 работнікаў. Па сутнасці, я быў там як галоўны ўрач. Але страшна не было. Бо для наладжвання добрай працы існуе апарат кіравання, кіраўніцтва вышэйшае. У беларускай мове нават няма слова "камандаваць", бо ёсць "кіраваць". Гэтыя людзі і павінны падказваць.

— Як спецыяліст вы цікавіцеся старэннем духу, скажам, у прафесійнай сферы? З чым гэта звычайна звязана?

— Мне цяжка адказаць. Я толькі хачу сказаць, што мне даводзіцца шмат чытаць лекцый. Лектару, каб быць цікавым з вялікім аб'ёмам навуковай інфармацыі, трэба разбаўляць яго агульнакультурнай інфармацыяй. Таму многія славутыя ўрачы і выкладчыкі былі прыхільнікамі тэатра, ведалі музыку і прэм'еры, навінкі літаратуры і класіку. Святлана Алексіевіч нядаўна сказала, што цывілізацыя дала нам 20 — 30 дадатковых да жыцця гадоў, яго працягласць сапраўды павялічылася. Таму павінна стварыцца філасофія гэтых дваццаці — трыццаці гадоў. А што тычыцца старэння духу, падаецца, яго ўвогуле няма. Калі параўнаць жыццё чалавека ў Старажытнай Грэцыі і зараз, то яно не дужа адрозніваецца. Абсалютна тыя ж эмоцыі, мы ж з захапленнем чытаем Еўрыпіда ці Гамэра. Іншая справа, што чалавек зараз напружаны рознымі дэвайсамі, інтэрнэтам, але нам бракуе агульнакультурнага кантэксту. І ўрачам, і пацыентам. Нават вынішчаецца культура збору анамнезу, гісторыі хваробы, бо зараз усе працуюць, пацыенты ў тым ліку, на вынікі камп'ютарнай тамаграфіі ці аналізаў. А простай размовы з доктарам, становіцца, на жаль, усё менш. Таму гэты агульнакультурны кантэкст вельмі важны. 80 працэнтаў нашых хваробаў абумоўлены нашым жыццём, а 80 працэнтаў дыягназу вынікае з дыялогу — так старыя клініцысты гавораць.

— Вы часта бываеце ў рэгіёнах, хаця жывяце і працуеце ў мегаполісе. Як бачацца вам тыя падзеі, што там адбываюцца?

— Я рэдка бываю ў рэгіёнах на культурных імпрэзах. Гэта прафесійныя паездкі. Але адчуваю замілаванне. Ад беларускага менталітэту, ад людзей, мне вельмі падабаецца з імі размаўляць. Люблю беларускую аўдыторыю. Яна спецыфічная, вельмі адрозніваецца, дарэчы, ад маскоўскай. Гэта талака са своеасаблівым пачуццём гумару, гэта заўсёды пытанні з нейкай падкавыркай. Беларускі гумар такі — "з пад'ялдыкваннем", як казаў Барадулін. Заўсёды адчуваеш калектыўныя адносіны да праблемы, заўсёды чуеш смех.

— А калі вы прыязджаеце не як лектар, а як турыст?

— Гэта проста захапленне роднымі мясцінамі. А тое, што кідаецца ў вочы, — сутыкненне эпох у галаве. Я маю на ўвазе адносіны да часу. Напрыклад, быў я ў Глыбокім ў маі. Вісяць там разам расцяжкі "З Вялікаднем!", праваслаўная і каталіцкая, а побач вуліца 1 мая, Ленін. Перамогі, а побач — нешта сучаснае. Мы не прадумалі, не абмеркавалі, чым быў для нас савецкі час. Я не лічу, што ён быў толькі дрэнным. Пры тым засталося шмат савецкага, што замінае руху наперад. Ёсць беларуская суполка, якая размаўляе на сваёй мове (не маю на ўвазе беларускую ці якую іншую), але яны зразумелыя толькі для саміх сябе. Па сутнасці, у нас трэба дапрацоўваць сучасную прывабную нацыянальную ідэю. Можа гэта павінна быць ідэя памежжа. Вось у Вільнюсе гарманічна суіснуюць розныя культуры, і кожны там знаходзіць нешта сваё, тыя ж беларусы. Беларусь павінна развівацца, мне здаецца, у гэтай галіне. Ведаеце, я так радаваўся, калі Святлана Алексіевіч атрымала Нобелеўскую прэмію. Але калі ўбачыў каментарыі да падзеі: не на той мове піша, савецкая пісьменніца, менталітэт у яе не беларускі... А гэта ж якраз той чалавек, тая постаць, якая нам патрэбна. Мы павінны займець комплекс ідэй, каб ведаць, куды рушыць грамадству. Іх выпрацоўваць павінны людзі, якіх будуць разумець любы грамадзянін.

— Як вы ставіцеся да бібліятэк і дамоў культуры, асабліва ў сельскай мясцовасці. Ёсць меркаванне, што гэта архаізмы.

— У гэтым сэнсе я прыхільнік ідэй, што бібліятэка — цэнтр культурнага жыцця. Гэта не столькі кнігі пачытаць, гэта яшчэ і імпрэзы, мерапрыемствы, сустрэчы. Установы павінны захавацца. У тым ліку як цэнтры нацыянальнай культуры.

— Я на свае вочы бачыла, як старэе вёска. Моладзь рэдка мае там культурную альтэрнатыву. Ці вырашальная гэта праблема? Магчыма праз тую ж моладзь?

— Нядаўна чытаў раман французскага пісьменніка Патрыка Бесона "Ліст да страчанага сябра". Гэта кніга пра парыжскую моладзь 1990-х. Яны таксама бадзяліся, не ведалі, чым ім заняцца. У выніку — пачалі імкнуцца да таго, каб займець нейкія пэўныя практычныя навыкі. Яны наведвалі розныя студыі, хто танцы, хто акцёрскае майстэрства. Калі нашай моладзі не падабаюцца ганчарныя кружкі, няхай ходзяць на іншыя. Так жыве ўвесь свет. Мы існуем яшчэ па савецкай звычцы. Я першы раз трапіў за мяжу годзе ў 1988-м, у піянерскі лагер у ГДР. І вось чым адрозніваліся тыя лагеры ад нашых. У нашых — усё пахвілінна распісана ў добрых савецкіх традыцыях. А там — рабі што хочаш. І мы не ведалі, куды сябе прытуліць, бо лагерны расклад уключаў толькі тры пазіцыі дня — харчаванне. І мы назіралі за немцамі, якія самі арганізоўваліся. Гулялі ў гульні, хадзілі ў паходы, а мы — не. Таму што за нас усё вырашалася. Таму гэты прынцып "не пайду на гурток, лепш піва вып'ю" — гэта несур'ёзна, гэта такі , даруйце, "савок". А моладзі трэба самой думаць. Але для гэтага павінен быць нейкі культурны падмурак. Тая моладзь у кнізе Бесона чытала сур'ёзную літаратуру, глядзела сур'ёзныя фільмы. Калі моладзь зацікаўлена, мае ідэі як жыць, не будзе праблем з вольным часам.

— Але ідэя павінна нарадзіцца менавіта ў іх галовах.

— Так, на гэтым пабудавана ўся сістэма выхавання. У вёсках павінны быць настаўнікі ці нехта іншы, хто будзе адстойваць культурныя інтарэсы. Я шчыра скажу, на жаль, сёння ў Беларусі агульны культурны ўзровень трэба павышаць, больш актыўна садзейнічаць якасным культурным падзеям. Вось у Наваполацку ёсць музычнае вучылішча. І наша геранталагічнае таварыства неяк ладзіла там мерапрыемства для моладзі пад назвай "Адчуй сябе старым". Мы там пры дапамозе спецыяльных прылад як бы зніжалі дзецям зрок спецыяльнымі акулярамі, фіксавалі іх суставы, давалі карыстацца палкамі, трасцінамі. Спачатку з боку моладзі была адмова. Але ў выніку яны, учарашнія вясковыя хлопцы і дзяўчаты, што прыехалі вучыцца ў маленькі горад, захапіліся. Вельмі шмат залежыць ад прафесійнасці прадстаўлення матэрыялу. Так і ў культуры…

— Як вы лічыце, чаму ў Беларусі няма сапраўдных андэграўндных тусовак, яркіх мастацкіх суполак, маладых культурных лідараў, няма вартых рок-клубаў, гарачых спартыўных балельшчыкаў ды нават дурнавата-шчырых прыхільнікаў якой-небудзь таннай папсы?

— Зараз іншае жыццё. Беларусь у ім удзельнічае. У Еўропе калі штонебудзь адбываецца, людзі едуць па культурную падзею ў іншую краіну. Па-сапраўднаму таленавітых рок-музыкантаў у нас, можа, і няшмат. Але паглядзіце, як толькі ў Вільнюсе які канцэрт, адразу колькі людзей туды едзе. У Польшчы ёсць фестываль "Басовішча". Мяне запрашаў Глеб Лабадзенка, зусім малады чалавек, на курсы "Мова нанова". Я бачыў колькі там людзей.

— Але я бачу роўнасць, абыякавасць, залішнюю дарослaсць у маладых яшчэ людзей.

— Гэта такі менталітэт. Апантаных людзей не павінна быць шмат. У гэтым сэнсе наша грамадства як грамадства, не бачу асаблівай адметнасці. У нас павінна быць больш актыўная культурная пазіцыя. Я не вялікі прыхільнік рок-музыкі, але люблю оперу. І паўсюль дзе бываю, імкнуся яе наведаць. А многія прылятаюць у той жа Парыж на оперу таму, што ў іх мясцовасці такога няма. Вось яшчэ адна асаблівасць замежжа. Я быў у Парыжы на прэм'еры оперы "Любоўны напой" Даніцэці. Раніцай я ўбачыў, што ўсе буйныя газеты Францыі выйшлі з рэцэнзіямі на спектакль. Большую частку жыцця зараз я знаходжуся ў Маскве, і што б ні прайшло ў Вялікім тэатры, пра гэта ў лепшым выпадку напішуць праз тыдзень-другі ў якім-небудзь спецыялізаваным часопісе ці газеце. Ці яшчэ прыклад: еўрапейскі прафесар будзе размаўляць з вамі не толькі пра тое, "пачым цукар у краме", ён абавязкова пацікавіцца выставамі, прэм'ерамі. Гэта не абыякавасць з нашага боку, а іншая культурная пазіцыя. У Полацку і Наваполацку, адкуль я родам, ёсць універсітэт. І я лічу, у гэтым горадзе павінен з'явіцца прафесійны тэатр, таму што там вучыцца шмат студэнтаў.

Заканчэнне **на старонцы 11.**

Элеанора: трошкі сонца ў халоднай вадзе

На здымках — сонечная дама з эфектнай усмешкай, якая з задавальненнем пазіруе перад фатографам. Зяленіва, мора, яскравыя колеры, гуллівая постаць жанчыны, якая прагне жыць і атрымоўваць ад таго асалоду. Праменад па жыцці, усмешка дзівы, кіно па ўласным сцэнарыі, у якім антураж краіны Саветаў таксама здольны стаць яскравым фонам для персанальнага выхаду — такой паўстае Элеанора Язерская, вядомая тэлевядучая, на слайдах з сямейнага архіва. Праект "Дзяўчына, асвечаная сонцам", што ладзіцца ў рамках выставы "Non-fashion" у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, знаёміць гледача з такой Элеанорай — актрысай і рэжысёрам свайго аблічча і ўласнага жыцця. Язерская як успамін і чалавек, зорка і чалавек, як "чысты" фотавобраз — правакацыя ўдалася, і сёння новы праект за аўтарствам Эвеліны Домніч (ідэя), Веры Савінай (аўтар артыкула) і Уладзіміра Парфянка (куратара) пацвярджае "трэцяе жыццё" персоны, вядомай, бадай, кожнаму беларусу.

Фатаграфіі з сямейнага архіва Элеаноры Язерскай адсканаваў і апрацаваў для праекта яго куратар Уладзімір Парфянок.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Чаму "трэцяе жыццё" Элеаноры? Гэты ход у дачыненні да постаці шаноўнай спадарыні Язерскай падказаў мне і Уладзіміру Парфянку філосаф Ігар Бабкоў, які сустрэў нас падчас ажыўленай спрэчкі наконт "упісання" славутай медыя-постаці ў сучасную культуру. Элеанора як выклік савецкай аднастайнасці — тое, падумалася нам, было яе "першым жыццём", Элеанора як персанаж і закрытая постаць у постсавецкі час — другім, і Элеанора як з'ява і чалавек, якога сучасная беларуская (поп-)культура спрабуе асэнсаваць і захаваць — пасля яе сыходу — распачынае "трэцяе жыццё" адной з самых пазнавальных бландзінак беларускага тэлеэкрана. Элеанора — як ужо легенда? Як дзівачка? Экстравагантная вядучая, якая, здавалася, асабіста ведала знакамітасцяў гэтага свету? Аблічча гэтай жанчыны, яе рэальныя модусы па-ранейшаму прыцягваюць увагу і становяцца падставай для шматлікіх дыскусій і разваг: дык кім жа была Элеанора Язерская? Як змянілася да яе стаўленне сёння? І ці магчыма, што зараз, у яе "трэцім жыцці", ейнае месца ў пантэоне герояў нарэшце знойдзецца?

У размове з куратарам праекта "Дзяўчына, асвечаная сонцам" Уладзімірам Парфянком, мы паспрабавалі разабрацца, якія новыя грані вядомай асобы раскрывае праект, якім чынам ён стаў магчымым. І ці варта, увогуле, баяцца Элеаноры Язерскай, як часам баяцца і адкрыта не любяць яе некаторыя і цяпер?

— Уладзімір, пачну з пытання, якое, мяркую, хвалюе многіх: асобны праект для Элеаноры Язерскай у рамках буйной выставы… Як ён нарадзіўся? У беларускай папулярнай культуры сёння нямала фігураў, якія могуць прэтэндаваць на месца ў пэўным сэнсе іконы. Да прыкладу, я магу згадаць постаць той жа актрысы тэатра і кіно Стэфаніі Станюты. Яе дасягненні неаспрэчныя, яе ведае не толькі тэатральная публіка. Прыгожая жанчына, прадстаўніца мінскай інтэлігенцыі, мяркую, што ў яе архівах знойдзецца нямала фотаздымкаў, на якіх спадарыня Станюта яскравая не толькі на сцэне, а ў паўсядзённым жыцці. Але чаму паняцці мода, стыль мы абавязкова звязваем менавіта з Элеанорай Язерскай?

— Дар'я, усё гэта можа быць, маеш рацыю, але пачынаць трэба з матэрыяла. У дачыненні да спадарыні Элеаноры ён з'явіўся. Мне патэлефанавала яе пляменніца Эвеліна Домніч і прапанавала пазнаёміцца са слайдамі тэлевядучай, якія засталіся ў сямейным архіве. Я не мог не адрэагаваць на такую прапанову. А калі пабачыў выявы, увогуле быў агаломшаны: матэрыял — найцікавы! Адразу ўзгадаўся і знойдзены архіў фотамастачкі Вів'ен Маер, бо гэтыя слайды — і ёсць неацэнны прыклад народнай, папулярнай, аматарскай фатаграфіі, пра каштоўнасць якой сёння гавораць ва ўсім свеце. Фота мяне захапілі! Эвеліна прапанавала зрабіць менавіта паказ слайдаў, і мне падумалася, што гэта — выдатная ідэя ў кантэксце выставы "Non-fashion". Пляменніца памятала яшчэ тыя сямейныя сустрэчы-прагляды, падчас якіх Элеанора каментавала свае слайды, і гэты фармат — слайдшоу — падаўся мне адэкватным і ўдалым для падобнага матэрыялу.

— Вы ведалі асабіста Элеанору Язерскую?

— Я не быў з ёй знаёмы, але не мог яе не ведаць і не бачыць. Гэта быў чалавек, які вылучаўся сваім нефарматам на фоне нашага даволі шэрага, памяркоўнага гарадскога асяродку. Пару разоў перасякаўся з ёй на дыпламатычных прыёмах, але для мяне яна заставалася загадкавай персонай. Збольшага, каб "разгадаць" яе, магчыма, і ўзяўся за праект. Але ў першую чаргу прыцягальным аказаўся сам матэрыял. Гэта — у самым лепшым сэнсе аматарская фатаграфія. Як фота-аматары бачаць? Што яны фіксуюць на фотаздымках і якім чынам? Гэта вельмі цікава даследаваць, спазнаваць. Па-другое, гэта слайды, якія маюць на ўвазе зусім іншы рэжым як успрыняцця, так і рэжым здымкі. І Элеанора, прынамсі, як аўтар гэтых слайдаў аказалася вельмі моцным каларыстам. Справа ў тым, што яна сама прадумвала кампазіцыі сваіх фатаграфій, была рэжысёрам здымак. У яе было некалькі фотаапаратаў, — і можна сказаць, што ёй патрэбны быў толькі асістэнт, які ў патрэбны момант націсне на кнопку. Усё астатняе яна рабіла сама: выбірала месца, сцэну, дзе патрэбна зняцца, магчыма, для здымкі адмыслова апранаўся строй. Можа, новы строй, увогуле, быў падставай зрабіць фотасесію. Адчуваецца, што гэта — дзейства, шоу. І такі настрой, імпэт Элеаноры ўражвае, захоплівае. Цікава, што яна потым і сама падпісвала слайды — рамкі для некаторых з іх зроблены з кардону, і калі я ўбачыў подпіс да аднаго з фота "Дзяўчына, асвечаная сонцам" — у мяне адразу нарадзілася назва для ўсяго праекта.

— Вы яе такой убачылі?

— Так. У гэтых кадрах вельмі шмат цяпла. Я адсканаваў амаль дзве сотні слайдаў рознымі спосабамі. Галоўнае ўражанне ад выявы — гэта сонца. Вядома, што сам матэрыял — слайдаўская плёнка — падштурхоўвае да здымак менавіта ў добрае надвор'е. Яна патрабуе шмат святла. Але заўважна, што Элеанора атрымлівала задавальненне ад працэсу фатаграфавання. На большасці кадраў яна ўсміхаецца, яе энергетыка захоплівае ўсіх, хто навокал. Толькі некалькі кадраў, на якіх яна сумуе, ці выглядае маўклівай, сабранай, астатнія — чыстая радасць. На пэўных слайдах — яна дакладна выглядае як актрыса, дзесьці нечакана яна нават нагадала мне Ромі Шнайдэр, але, здаецца, гэта не было прамой задумай.

Возьмем той самы кадр, які яна падпісала "Дзяўчына, асвечаная сонцам". Банальны сюжэт. Элеанора — на асветленай пляцоўцы, у стракатай сукенцы, праз лістоту на яе падаюць промні святла. Побач — сабака ў чорна-белыя пляміны. Экспазіцыя зроблена па яе постаці, таму задні фон сыходзіць у цемру. Але калі яго павялічыць, можна заўважыць, што гэта не проста глухая цемра, а нейкая сцяна, ля якой стаяць людзі. Група, натоўп, што чагосьці чакае. Ці, мабыць, назірае як нейкая дзяўчына весяліцца з сабакам. І як ні дзіўна, у супрацьпастаўленні выяўляецца канфлікт: вось гэтага натоўпу — і індывідуальнасці, незалежнага, вольнага чалавека. Адчуваецца, што Элеанора заўжды вылучаецца, стаіць асобна ад атачэння. І гэты позірк пераконвае: пачынаеш верыць у прыдуманы свет Элеаноры. Жанчына-сонца, чаму не?

— Уладзімір, усё так, але калі трапляеш на выставу, разумеш, што гэты прыгожы вобраз ператвараецца ва ўласна легенду. Перад намі паўстае ўжо "чыстае аблічча", тое, кім бы Элеанора хацела, каб яе бачылі…

— Я не біёграф Элеаноры Язерскай, каб ведаць перыпетыі яе жыццёвага шляху. Я наўмысна пазбягаў храналогіі ў слайд-фільме, бо мне хацелася зрабіць такое кіно без пачатку і канца. Так, я крочыў за ідэяй Элеаноры — за тым абліччам, якое яна сабе прыдумала, стварыла. Дарэчы, у калекцыі былі і яе фатаграфіі на тэлебачанні, але мне яна падалася там нецікавай — антураж таго савецкага тэлебачання нібыта "капсуліраваў" яе. А калі яна "ззяе" сярод кветак, на моры — у гэтым вобразе больш шчасця і, адпаведна, таго, што можна назваць мастацкай праўдай.

— Цікава, што калі лічыць слайд-сесію пэўным кіно, у якасці музычнага суправаджэння вы ўзялі музыку Браяна Іна, якая называецца "Музыка для аэрапортаў"?

— Так. Варыянтаў музычнага суправаджэння было некалькі. Спачатку Вера Савіна прапанавала ў якасці бачання Элеаноры вальс Іягана Штрауса. Яна адштурхнулася ад сцэны ў фільме "Вялікі вальс" з Міліцыяй Кор'юс, дзе адбываецца нараджэнне музыкі з гукаў прыроды. Але Эвеліна Домніч не пагадзілася з такой трактоўкай, адзначыўшы, што Элеанора была нефарматным чалавекам, якая ведала Пятрова, Янчанку, Арцем'ева… Далей разглядаліся "Метамарфозы" Арцем'ева, але гэты варыянт падаўся занадта халодным ужо мне. І так нечакана неяк узнавіўся Браян Іна, які быў на слыху ў вузкіх колах у тыя часы. Выцягнуў яго "Музыку для аэрапортаў" — і ўсё супала. Гэта суправаджэнне трошкі запавольвае рытм слайд-паказу і гучыць нібыта аднекуль зверху, што стварае адмысловую атмасферу. Мяркую, што каб Элеанора ведала Браяна, яна абавязкова зрабіла пра яго адну са сваіх перадач.

— Уладзімір, вы распавядаеце пра ўсё вельмі натхнёна, і гэта яшчэ раз пацвярджае маю думку, што перад намі прыгожы праект, з любоўю зроблены куратарскай групай. Але дзе ж рэальная Элеанора? Яе таксама хацелася б убачыць…

— Дар'я, перад намі вельмі інтымны матэрыял, трэба звярнуць на гэта ўвагу. Гэтых слайдаў ніхто не бачыў, і сваякі Элеаноры зрабілі вельмі смелы крок, даўшы магчымасць людзям пазнаёміцца з такой Элеанорай — той, якую яна стварала з сябе. Слайды — гэта нават больш інтымная рэч, чым фатаграфія. Яны рабілі ілюзію, што ты сам здымаеш сабе кіно, а потым ладзіш кінасеанс і глядзіш яго ў блізкім коле. Куды бліжэй?

Па сутнасці, на прыкладзе гэтай калекцыі мы знаёмімся з вобразным светам, уяўленнем Элеаноры. І гэта рэч, магчыма, больш каштоўная, чым знаёмыя фатаграфіі экстравагантнай дамы ў студыі, на вуліцы, на прыёмах… Гэты вобраз яе мы бачылі, а вось такі — які іскрыцца?

Акрамя таго, у гэтых фотавыявах ёсць дух часу — як апраналіся людзі ў савецкія 1970 — 80-я, як адпачывалі, як хадзілі на дэманстрацыі — гэта ўсё захавана, і цікава, як Элеанора "асвятляе" сваім абліччам "савецкі" фон. Лічу, найкаштоўны матэрыял для даследчыкаў.

— І ў той час ёсць рэальная гісторыя пра рэчы Элеаноры, якія былі выкінутыя на сметніцу пасля яе смерці…

— Думаю, гэта гісторыя не такая адназначная. Асуджаць сваякоў тут нельга: яны пакінулі шмат рэчаў, рукапісаў, фатаграфій для музея. Яны парупіліся пра яе след. Магчыма, рэчаў было вельмі шмат, не ведаю… Але чаму вінаватыя выключна сваякі? Дзе нашы музеі, галерэі, дом моды? Чаму яны таксама не ўхапіліся і не зрабілі выставу яе рэчаў — капялюшаў, упрыгожанняў, сукенак? Дзе яны? Абмяркоўваць лягчэй, чым палюбіць кагосьці, зрабіць для яго штосьці.

— Магчыма, для кагосьці фігура Элеаноры Язерскай не з'яўляецца аўтарытэтнай?..

— І ў гэтым я акурат і бачу нашу местачковасць, калі беларусы ўвесь час шукаюць культавых персон у замежных далях. Знаходзім, і цягнем іх сюды, нібыта побач нікога няма. Давайце па-іншаму ставіцца да сваіх яскравых асобаў! Давайце раскрываць і даследаваць іх архівы, сямейныя фотаальбомы, давайце здымаць, урэшце рэшт, пра іх байапікі! Магчыма, наш праект атрымаўся кранальным, гэта такая ідэалізацыя, салодкая карамелька, але гэта толькі пачатак працы. Драма там, у жыцці Элеаноры, вядома, ёсць. Яе яскравы вобраз — гэта прыгожы "фасад", за якім кіпяць страсці. Як прабіцца да гэтай драмы — я не ведаю. Магчыма, трэба, каб з'явілася такая постаць, якой здолеюць даверыцца яе сваякі. Але чаму Элеанора Язерская не можа быць іконай нацыі? Не бачу перашкод.

— А чаму не можа Стэфанія Станюта?

— Ды і Стэфанія Станюта таксама. Я не бачу ў гэтым канфлікту. Дарэчы, а пра яе што-небудзь зрабілі? Архівы мы яе бачылі? Серыял хто-небудзь зняў?

К

КУЛЬТУРА www.kimpress.by / Рэдакцыя плюс... № 38 / 17 верасня 2016 г. 9

(Заканчэнне.
Пачатак на старонцы 1.)

Уладзімір Пугач. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Ад інтэрнэт-мема да “паднаготнай” ДК

Адзіны ў многіх праявах Уладзімір Пугач з гурта "J:Морс"

— Ды яшчэ і грошы плаціць не трэба. Але ёсць такія яркія персанажы, опусы якіх не маюць нічога агульнага з традыцыйнай крытыкай. Вось гэтыя памфлеты чытаць прышпільна. Ці патрэбная крытыка музыкантам? Калісьці была патрэбная, вось тады ад яе часцяком і залежыў поспех / няпоспех. Сёння ў музыкантаў ёсць наўпросты кантакт з публікай. Мабыць, музычны крытык сёння здольны паўплываць на лёс толькі артыста-пачаткоўца, нікому невядомага. Узяць, умоўна кажучы, і перанесці яго на нейкую ўрадлівую глебу: парэкамендаваць для ўдзелу ў фестывалі знаёмаму прадзюсару.

— Тое, што вы сказалі пра музычную крытыку, тычыцца і да крытыкаў, якія спецыялізуюцца на іншых відах мастацтва?

— Я пра гэта не думаў... Хутчэй, не. З кіно так не “пракатвае”. Я лепш спачатку прачытаю рэцэнзію, чым змарную час на прагляд фільма, які скончыцца “фігнёй”.

Гультай

— Вы сёння больш сур’ёзна ставіцеся да свайго занятку музыкай, чым тады, калі пачыналі?

— Складана тут усё неяк... У нейкі момант пачынаеш разумець, што робіш адно і тое ж: прыдумваеш песні, запісваеш іх, выпускаеш альбом, ладзіш прэзентацыю, выпраўляешся ў тур, раздаеш інтэрв’ю, “улазіш” у тэлевізар. Кропка. Табе ўсё гэта падабаецца, але адчування руху наперад няма. У 2010-м гурт выпусціў альбом “Электрычнасць”, які атрымаў выдатныя водгукі, мы з ім сабралі двойчы мінскі Палац спорту. І “з радасці”, што ўсё выдатна, што ўсё зрабілі, што больш нічога рабіць не трэба, з канца 2010 года па 2014-ы я на ўсё... “забіў”. Канцэрты мы гралі, але песень не запісвалі. Я не разумеў, навошта яны. Як у “Мумі-тролі”: адзін з персанажаў сабраў усе маркі і не ведае, што далей рабіць. У выніку гурт здаў. І тут ува мне прачнулася чарцяня і я зноў злавіў кураж. І трэба было вяртаць пазіцыі, ледзь не стартаваць зноўку. Летась мы выпусцілі новы альбом “Паветра”, і “паравоз” пад назвай “J:морс” цяпер зноў набірае хуткасць. Гэта значыць, штучна загнаўшы сябе ў тупік, я зразумеў, што трэба нешта здзяйсняць. Але, калі сітуацыя зноў паўторыцца, як буду выходзіць з яе, — не ведаю... Стану журналістам, відаць.

— Часам, толькі патрапіўшы ў “яблычак”, разумееш, што прамазаў...

— Так! Калі я думаю, што пацэліў, а насамрэч прамахнуўся, не расчароўваюся. Бывае, накатвае эмацыйная стомленасць, няма жадання рабіць далей тое, што замінае. Карацей кажучы, я чалавек лянотны!

— Вы задаволены тым, як правялі час, “забіўшы”?

— Не! Змарнаваў яго. Як і ўсе, жыву з мінулага ў будучыню, і вопыт назапасіў, што так рабіць нельга. Таксама вынік.

Лідар

— Вы можаце ўявіць творчасць, пазбаўленую прагматычнага моманту?

— У дачыненні да сябе? Не, таму што мне трэба карміць сям’ю. А наогул — вядома, і ёсць маса прыкладаў так званага чыстага мастацтва, калі чалавек стварае, бо інакш жыць не можа. Ці выступае наш гурт бясплатна? Выступае, у залежнасці ад сітуацыі. Але ўзяць і так проста адмовіцца ад ганарару...

— У расійскім фільме “Горка!” герой-камеа Сяргея Светлакова ў эйфарыі адмаўляецца ад ганарару за вядзенне вяселля...

— Гэта кіно мне падабаецца за тое, што ў ім паказана ўсё так, як яно ёсць насамрэч... Але часцей артыстам падчас карпаратываў даплачваюць за якасна праведзеную працу.

— А сваю рэакцыю на першыя грошы, атрыманыя за канцэрт, памятаеце?

— Было і здзіўленне, і кайф, і радасць ад таго, што за любімую справу яшчэ і плацяць!

— Як артысту выйсці на самаакупнасць? І якая ў тым доля выпадковасці?

— Ёсць “галіна народнай гаспадаркі” — прадзюсарства, і людзі, занятыя ў ім, напэўна, маглі б вам распавесці пра тое, як вывесці выканаўцу “ў плюс”. Да гэтага маю мала дачынення. Мы пачалі, не задумваючыся пра далейшае. Без алгарытмаў ды планаў. І атрымалася. А нехта пачынаў гэтак жа, і ў яго не задалося. Мы маем менеджара, але ён не ўплывае на творчасць. Тыя, хто займаюцца дзейнасцю вакол “J:морс”, са мной даўно. Гэта мае партнёры, якія глыбока ў тэме, а не нанятыя людзі. Як спрацуе гурт у творчасці, як спрацуюць менеджары — ад гэтага і залежыць памер прыбытку ўсіх “дзейных асоб” гэтай справы.

— У першую чаргу прыбытак залежыць ад Уладзіміра Пугача...

— І мне часам цяжка несці гэты “крыж”. Мой ненастрой, неразуменне сітуацыі б’юць і па іншых... За 4 гады прастою змяніўся склад гурта. Я не ведаў, што магу даць старым музыкантам, не бачыў, што хачу з імі рабіць. Мы стаміліся адзін ад аднаго, на рэпетыцыях глядзелі на гадзіннік. І вось на вядомым інтэрнэт-партале я раптам сказаў, што, пэўна, зраблю перапынак у студыйнай працы. Чым здзівіў музыкантаў “J:морс”, якім заява не спадабалася. (Устрывожыліся і прыхільнікі, і журналісты, якія вырашылі, што гурт распадаецца.) А пазней пайшоў на тое, чаго ніколі не рабіў у творчым жыцці: што называецца, звольніў двух музыкантаў. Потым з’явіўся праект “Нафта”, які камерцыйным стаць не змог: я так і не зразумеў, як трэба працаваць у абранай стылістыцы. З ім мы выдалі 5 — 6 песень, але астатні запісаны матэрыял так і не выйшаў. Гэта не была спроба стварыць новую вітрыну старой крамы, а спроба атрымаць задавальненне ад працэсу. Да моманту нараджэння “Нафты” для гурта не было напісана ніводнай песні, а мне хацелася папрацаваць з беларускімі рок-зоркамі — Старажуком, Мышкевічам. І песні ствараліся ды запісваліся на рэпетыцыях. У выніку я атрымаў задавальненне і набыў неацэнны вопыт. І шкадаваў бы, каб не паспрабаваў.

— Гэта значыць, і па-за “J:морс” вы пачуваецеся камфортна? Напрыклад, прымаючы ўдзел у якім-небудзь праекце адзін...

— Так. У ліпені ездзіў на раскопкі нармандскага паселішча, куды паклікалі археолагі. Узяў гітару, праспяваў, атрымаў масу задавальнення.

— Каб патэлефанавалі з якой-небудзь сельскай бібліятэкі, запрасілі выступіць, паагітаваць за чытанне...

— Я ўдзельнічаў у падобных праектах у Мінску. Не ўпэўнены, што рвануў бы ў іншы горад — канцэртны графік усё ж. Але прапанову разгледзеў бы і, можа, пастараўся ў будучыні знайсці час.

— Вы жывяце за кошт музыкі, а калегі па гурце?

— Таксама. У кагосьці ёсць пабочныя праекты. Сяргей Шчурко, скажам, выкладае гітару. Лінолеумам дакладна ніхто не гандлюе. Але зарабіць адной толькі музыкай у Беларусі цяжка. Зрэшты, як і займаючыся адным бізнесам.

— “J:морс” выключэнне?

— Так выйшла і сапраўды выпадкова, і таму, што мы захоплена займаліся гэтым працэсам, не кідаючы яго. Але, па вялікім рахунку, тое, што адбылося з гуртом, гэта не “халява”, а праца.

Дыктатар

— Уладзімір Пугач патрабавальны ў творчасці і ў тым, што яе атачае?

— Магу мозг вынесці, а бывае, магу “забіць” на ўсё.

— На песнях гэты настрой адбіваецца?

— Калі канчатковы прадукт мне не спадабаецца, ён не выйдзе. Таму і "ўсплываюць" нявыдадзеныя рэчы, якія не атрымаліся, да якіх не мог падступіцца, а потым раптам усё склалася. Так было з загалоўнай песняй альбома “Паветра”, якая “ляжала” з 2012-га.

Творца

— Увайшоўшы ў пачатку 2000-х у артыстычную тусоўку, цікава было ў ёй круціцца?

— Гэта быў новы для мяне свет: я не нарадзіўся ў сям’і музыкантаў, паэтаў, не начаваў на падмостках.

— Якая ваша звышзадача як асобы творчай?

— Калі гаворка пра песні ў такім кантэксце, я адчуваю "водар" бізнес-працэсу. Атрымліваецца, што калі аўтар нешта выдумляе, ён думае пра спажыўца. У справе вытворчасці самазвалаў так і павінна быць. У творчасці ж для мяне такі падыход дзіўны. Не можаш не пісаць — пішы. І няхай публіка вызначае, што ёй падабаецца, а што не. “Фільтраваць” сябе музыканту трэба тады, калі ён кажа нешта па-за ўласнай творчасцю, у інтэрв’ю. Тым больш калі ў яго ёсць свая немаленькая аўдыторыя. А наогул, мне блізка перадаваць песнямі простыя пачуцці: любоў, радасць, расчараванне, сум. Яны бываюць куды мацнейшымі ды больш устойлівымі, чым любы антыглабалісцкі кураж ды контркультурны пафас.

— А як жа Андрэй Таркоўскі, з яго “мэта мастацтва заключаецца ў тым, каб падрыхтаваць чалавека да смерці”?

— Я для сябе падзяляю тое, што творчы чалавек кажа, і тое, што з’яўляецца яго глыбіннай матывацыяй. Не заўсёды гэта супадае. Часам прасцей адказаць неяк мудрагеліста, нават пафасна на пытанне: “Што вы хацелі гэтым сказаць?”, чым падрабязна тлумачыць. Наогул, я не лічу, што творчыя людзі перагружаюць сябе сацыяльнымі звышзадачамі, калі твораць.

Псіхолаг

— Самыя моцныя эмоцыі вы адчуваеце, калі выходзіце на сцэну і бачыце перад сабой поўную залу; калі ўжо выступаеце; адразу пасля канцэрта; калі пасля яго заканчэння “даймаюць” фанаты?

— У першыя гады адчуваў пачуццё вострага задавальнення ад пасляканцэртнай атмасферы. Але гэты стан хутка прайшоў. Галоўны кайф — гэта ўсё ж калі я знаходжуся на сцэне, калі пачынаецца энергаабмен з публікай у зале. Спачатку я яе скaную — гляджу на людзей, спрабую зразумець, навошта яны прыйшлі на канцэрт, чаго чакаюць ад яго. А праз некаторы час надыходзіць момант, калі ў адказ на сваю энергію я атрымліваю энергію глядацкую. Вось гэты вір і ёсць пік кайфу!

— Ёсць для вас розніца паміж білетнымі канцэртамі гурта і выступамі ў зборных мерапрыемствах?

— На сольніках прыходзіць аўдыторыя толькі наша, мы дакладна ведаем, што і як рабіць. Калі ж гэта фестываль, карпаратыў, то публіку на іх трэба здолець “падсадзіць” на сябе, што больш складана.

— 3-га ліпеня ля мінскай Ратушы здолелі?

— У першую чаргу там была прэзентацыя альбома “Паветра” на адкрытай пляцоўцы. Але перад намі павінны былі выступіць яшчэ артысты. Умяшалася непагадзь: дождж, навальніца, сцэну літаральна раскідала. І калі мы прыехалі хвілін за 40 да пачатку выступу, толькі скончыўся дождж, а на пляцоўцы засталося гледачоў дзвесце. Я напружыўся, але адмаўляцца было позна. І ўсё “абышлося” цудоўным чынам: ужо на палове выступу паслухаць гурт сабралося каля пяці тысяч чалавек. І людзі падцягваліся да самага канца канцэрта. Я разумею, што ён быў бясплатным, а шмат людзей шпацыравалі непадалёк, але ж затрымаліся, засталіся.

— Што вам бліжэй: быць хэдлайнерам фэсту — закрываць яго, альбо паўставаць на ім у якасці “разагрэву”?

— Раней для мяне ўсё гэта было больш важным, цяпер — не. Але часцей сёння мы з’яўляемся хэдлайнерамі.

— А на “разагрэве” ў каго вы з задавальненнем выступілі б?

— Ні ў каго! Цікава паглядзець на чый-небудзь выступ з-за кулісаў. А “разаграваць”... Мы адыгралі больш за дзесяць канцэртаў з “Акіянам Эльзы” ў туры гэтага гурта па Беларусі. Было цікава назіраць, як яны працуюць. На адным з фестываляў выступалі на адной сцэне з “The Cardigans”, працавалі з “Hurts” — было цікава паглядзець, як яны граюць на двухактаўным клавесінчыку. Аказалася, што гэта мідзі-клавіятура ў пластыкавай скрыні...

— Гэта значыць, за гонар вы такое не лічыце?

— Не палічыце мяне ганарыстым, проста калі нават малавядомы артыст знаходзіцца ўнутры бізнес-працэсу, то больш знакамітых ён усё роўна лічыць за сваіх калег.

— А цікавая “паднаготная” шараговага дома культуры?

— Гэта... прышпільна! Часам такі “трэш” заўважаеш... За час існавання гурта мы неаднойчы вярталіся ў тыя месцы, дзе калісьці гралі. Пры нас змяняліся дырэктары дамоў культуры, рамантаваліся грымёркі, знікалі з іх прапаленыя канапы ці, наадварот, — па-ранейшаму стаялі з дзіркамі. Вельмі ўсё гэта міла бывае. Вяртаючыся туды, разумееш, што сталічнае жыццё стварае вакол цябе кокан, які прымаецца за зорнае неба. І, выбраўшыся з яго, ты бачыш людзей, якія па-іншаму думаюць, па-іншаму ацэньваюць свет, па-іншаму жывуць, у каго каштоўнасці, перавагі, адрозныя ад тваіх, нават уяўленні пра дабро ды зло не супадаюць. Гастролі — гэта як галаву ў вядро з халоднай вадой апусціць. Карацей, карысная рэч.

Пасол

— У жыцці некаторых артыстаў надыходзіць такі момант, калі ім хочацца зрабіць акустычную праграму, затым — выступіць з сімфанічным аркестрам. 5 лістапада ў Палацы Рэспублікі вы дасцё сумесны канцэрт з Прэзідэнцкім аркестрам Рэспублікі Беларусь...

— Праект “справакаваў” Павел Каранеўскі — намеснік генеральнага дырэктара тэлеканала “СТБ”. Мы сустрэліся з мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам аркестра Віктарам Бабарыкіным, яму ідэя таксама здалася цікавай. Яго калектыў робіць аркестроўкі нашых песень, якія я адабраў для праграмы “Беларускае золата”. Назва гучыць прэтэнцыёзна-прыгожа і нясціпла? Каб яго чорт узяў, так!

— Вы неяк па-іншаму сталі да сябе ставіцца, калі ўжо вашы песні прызналі музыканты акадэмічныя?

— Мне Бабарыкін яшчэ гадоў пяць таму прапаноўваў нешта зрабіць разам, але неяк усё гэта забылася... Міхаіл Фінберг дзесьці ў той жа час нешта падобнае прапанаваў. Не атрымалася... Але ведаеце, у дзіцячым доме спяваць дзеткам таксама няпроста. Прыязджаеш, а там хлопчыкі і дзяўчынкі гадоў па сем — восем. І куды ім спяваць песні “J:морс” пра каханне? Пачынаеш прыгадваць нешта з савецкіх мульцікаў. Вось дзе складанасць! А тут трэба будзе выканаць тое, што я спяваю ў гурце ўжо сто гадоў, як той казаў, проста цяпер — з аркестрам. Мне гэта падабаецца — прагнаць такі працэс праз сябе.

— Некалькі гадоў таму вы сталі Паслом добрай волі UNICEF у Беларусі. “Па прыколе” або рашэнне было абдуманым?

— Да майго прызначэння мы гадоў дзесяць працавалі з гэтай міжнароднай арганізацыяй. Аднойчы ж паступіла такая прапанова. Я пагадзіўся. А “прыколам” тое, да чаго я далучыўся, не назавеш: вось ты прыязджаеш у дзіцячы хоспіс, у Бараўляны, сыграць невялікі канцэрт для дзетак, якія ўжо сыходзяць, хворых на лейкемію. А яны песенькі нашы паслухаць прыйшлі ў актавую залу, з кропельніцамі... Валодзя Пазняк, музыкант гурта, неяк тыдзень піў пасля такога наведвання... Праз паўгода прыехалі — гэтыя дзеткі ўжо не ходзяць, мы пайшлі спяваць па палатах. Яшчэ праз нейкі час паклікалі на пахаванне... Вось такі “прыкол”...

Чытач

— Тэксты “J:морс” — тэма асобнай гутаркі... Назавеце вашых любімых паэтаў?

— Я мала чытаю паэзіі... Мандэльштам, Цвятаева ды Ахматава — так. Трапляліся томікі Сашы Чорнага. І мне вельмі падабаецца Вера Палазкова, можаце мяне за гэта “забіць”. З беларусаў... Класікаў чапаць не будзем... Не, нікога не магу назваць, і зусім тым не ганаруся. Апошнім часам я наогул мала чытаю. Мастацкую літаратуру перастаў чытаць гадоў пяць таму. Выбіраю публіцыстыку, навукова-папулярныя кнігі.

— Стругацкія — адны з улюбёных вамі празаікаў?

— У свой час яны “гралі” сацыяльную ролю ў савецкім грамадстве. Зараз творы Стругацкіх не гэтак актуальныя. Не магу сказаць, што я ацаніў сусветную, маштабную думку іх творчасці, але мне падабаліся яе атмасфера, гумар, увогуле, я своечасова стаў чытаць тыя кнігі. Магчыма, каб пачаў чытаць іх толькі сёння, то і не “зачапіўся” б за іх.

— Яны і цяпер сучасныя — “Град асуджаны”, “Кульгавы лёс”...

— Дарэчы, так! Ці “Абцяжараныя злом, або Сорак гадоў пасля”!.. Булгакаў, дарэчы, мне падабаецца.

— Якіх “вашых” беларускіх празаікаў назавеце?

— Ну, не чытаю я мастацкую літаратуру!.. Адсочваю навінкі, магу замовіць іх праз інтэрнэт. Яны чакаюць свайго часу, таму дома вялізны стос непрачытанага ляжыць — па сацыялогіі, па эвалюцыі чалавека. Калі нехта напіша выдатную манаграфію пра жыццё готаў у Беларусі ў старажытныя стагоддзі, я яе з задавальненнем прачытаў бы. Напэўна, прачытаю Алексіевіч. Трэба яе прачытаць.

— ...Калі ўсё ж закрануць тэксты вашых песень. Ці не падаецца вам, што рускамоўныя тэксты больш... фрагментарныя, ці што? Часам ўзнікае адчуванне, што асобныя словы ўстаўленыя ў сказы неяк знарочыста. Беларускамоўныя ж больш цэльныя за рускамоўныя, гісторыі ў іх выкладзены больш акрэслена. Можа яны такія таму, што ў жыцці вы не надта шмат выкарыстоўваеце беларускую мову і для песень стараецеся падбіраць словы больш дакладна?

— Хто яго ведае... Рускамоўныя тэксты такія ж. Проста іх у мяне значна больш, чым на беларускай мове. А працэс прыдумвання той жа — фразамі. Тэкст для песні “Жыві” я напісаў за тры хвіліны, а для “Не памірай” складаўся год, прычым у сааўтарстве.

— “Жыві” вы нядаўна выканалі разам з Валерыем Дайнекам...

— Было крута! Але мы яе ўжо да таго спявалі — на нейкім карпаратыве. А вось “Бялявую, чарнявую” выканалі ўдваіх упершыню. Вось яе мне складана было спяваць. У лесе ці на кухні каверы я магу спяваць, а каб вось так, усур’ёз...

— На кухні, дарэчы, часта спяваеце?

— Не, суседзям замінаю. А ў зале — так, я ж дома “дэмкі” пішу. У грымёрках спяваем — і перад канцэртамі, і, як ні дзіўна, пасля. Вова Пазняк гэта любіць рабіць. У гасцініцы. Спяваем усё запар, нават шансон — самы “бандыцкі”, “трэшак”. Што ў галаву прыйдзе, тое і спяваем. Кубанскія песні. Палескія. Я ўжо распавядаў вашай газеце, што ў планах ёсць запіс альбома, які складаецца з іх.

— Сярод песень “J:морс” ёсць такія, якія нечакана для вас “зачапілі” ўсіх?

— Я ні разу не адгадаў, што стане хітом.

Беларус

— 2016-ы ў нашай краіне — Год культуры. Вы адчуваеце, што ў гэтым кантэксце нешта ў Беларусі змянілася, можа, адчуваеце нейкі нацыянальны ўздым?

— Уздым адчуваю. Можа, усё выглядае павярхоўна, але, напэўна, так пакуль і павінна быць. Для таго, каб “зачапіць” вялікую масу людзей, трэба насіць прынтаваныя вышыванкі. Зразумела, што да сур’ёзнага адраджэння гэта адносінаў не мае, але ж з чагосьці ўсё павінна пачынацца. Калі казаць з маёй званіцы, то, на мой погляд, за апошнія 5 гадоў у Беларусі цікавай музыкі з’явілася значна больш, чым у папярэднія гады тры — чатыры. Можа, гэта звязана з сацсеткамі, а, можа, сапраўды ідуць нейкія глыбінныя працэсы. Заўважаю, што больш людзей пачалі размаўляць па-беларуску.

— А вы сябе да якой культуры адносіце, у рамках Беларусі?

— Я з Піншчыны, а таму — да палескай.

— Яе гаворкамі валодаеце?

— На жаль, не. Бабуля выдатна размаўляла, мама трошкі можа. Паклічу на дапамогу генетычную памяць ды паспрабую праспяваць на гэтай гаворцы праграму палескіх песень. Наогул, я думаю, што палеская культура — гэта нейкая ці не самастойная культура. Той выпадак, калі культурныя межы і дзяржаўныя ў нечым не супадаюць...

Пытанні задавалі Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Яўген РАГІН, Аліна САЎЧАНКА, Сяргей ТРАФІЛАЎ

К

"Для таго, каб “зачапіць” вялікую масу людзей, **трэба насіць прынтаваныя вышыванкі.** Зразумела, што да сур’ёзнага адраджэння гэта адносінаў не мае, але ж з чагосьці ўсё павінна пачынацца. Прынамсі, заўважаю, што больш людзей пачалі размаўляць па-беларуску".

"Статус Пасла добрай волі UNICEF... **Вось прыязджаеш у дзіцячы хоспіс сыграць для дзетак,** якія ўжо сыходзяць, хворых на лейкемію. А яны песенькі нашы паслухаць прыйшлі ў актавую залу, з кропельніцамі... Праз паўгода прыехалі — дзеткі ўжо не ходзяць, мы пайшлі спяваць па палатах. Яшчэ праз нейкі час паклікалі на пахаванне..."

"Я з Піншчыны. **Паклічу на дапамогу генетычную памяць** ды паспрабую праспяваць на тых гаворках праграму палескіх песень".

Аўдыя & Відэа



ТЭКСТ

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"

Леанід НАРУШЭВІЧ, лідар гурта “Князь Мышкін”

Жнівеньскія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць лідар гурта “Князь Мышкін” Леанід НАРУШЭВІЧ (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты “Культура”, музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

АЎДЫЯ

Гурт “Tiptoe”, міні-альбом “5ive”

А.: Зусім выдатная работа маладых выканаўцаў: спелыя аранжыроўкі ды выдатны голас Вольгі Горынай. Я б рэкамендаваў запісы “Tiptoe” на ўсе нашы радыёстанцыі. Вельмі буду чакаць новых рэлізаў ад праекта! Вось так: як быццам нікога і няма, а тут і прарве моладзь шаблоны!

В.: Вельмі якасны англамоўны сінці-поп з жаночым вакалам. Каб мне паслужліва не падказалі, што матэрыял гэты родам з Віцебска, то ў сілу сваіх адносных ведаў ў галіне зусім заходняй музыкі, я б палічыў яго за “фірмУ”. Тут у меру папсы ды электроннай сур’ёзнасці, танцавальнага ды “для праслухоўвання”. І грув з драйвам у межах хітовай нормы. Вельмі цікава, што будзе з праектам далей, і ці будзе — маю на ўвазе менавіта замежнае прасоўванне. Бо не мараць жа артысты “Tiptoe” толькі аб заваяванні айчынных начных клубаў? Гэта яны зробяць лёгка, а вось што потым?..

Адэля Вольская, міні-альбом “Усё атрымаецца”

А.: Той, хто старэйшы, памятае, як пры некаторых дамах быту былі студыі грамзапісу, у якіх запісвалася ўсё хітовае — ад “Boney M” да “Pink Floyd” — на пластыкавых паштоўках з відамі ўсялякіх прыгажосцяў. У якасці падарунка блізкім выдатная штука была па тых часах. Асабліва таленавітых можна было запісаць на пару мікрафонаў, і ўжо потым “прапаліць” на гэтыя прататыпы дыскаў за ўмераную плату “не адыходзячы ад касы”. Я сам у 1981 годзе ў Мінску на Маскоўскай, у тамтэйшым доме быту, пракруціў такую аперацыю дзеля ўшанавання сваіх яшчэ зусім юных песенек: нарэзаў штук 10 розных і раздаў сябрам на памяць. Стаў бы Макартні або Макарэвічам — за гэтыя гады ўсплылі б на аўкцыёнах!..

Ну, а пра Адэліны песенькі, запісаныя ў яе “асямнаццаць” гадоў, думаю, што гэта і была спроба выплюхнуць свае эмоцыі ды перажыванні на нешта кшталту фатаграфіі або вінілу — на памяць сябрам ды блізкім. Песенькі прасценькія, але мілыя, тату яе, мяркую, вельмі спадабаліся. А паколькі тату я паважаю ды цаню, то пісаць ўсялякія разборныя ды як бы крытычныя словы па дадзенай рабоце не стану. Хай расце дзіця, час пакажа, што з яго вырасце. Дарэчы, тэмбральна вельмі мне нагадала “олдавую” Умку з Масквы: тая гадоў пасля дваццаці пяці вырашыла выйсці са сваімі песнямі ў народ і вось спявае ды спявае. Раю Адэльцы паслухаць яе творчасць. А раптам?..

В.: Можна, вядома, паразважаць у катэгорыях “яблык ад яблыні...”, памятаючы пра тое, што перад намі работа дачкі Лявона і Ганны Вольскіх. Але і пра тое, што рэліз — дэбютны для дзяўчыны, таксама забываць не варта. А першыя крокі рознымі бываюць, нярэдка незалежна ад таго, каму што генамі ды звыш дадзена. Просіцца банальнае: дачакаемся паўнафарматніка (калі ён будзе), тады нешта больш-менш ясна і стане. Пакуль жа меладычна ўсё слабенька, тэксты адпавядаюць узросту чалавека, выхаванага ў інтэлігентнай сям’і, а вось сіла ў голасе адчуваецца. Развіць яго, падцягнуць да яго лірыку з музыкай — і ўсё можа здарыцца.

Гурт “Стары Ольса”, альбом “Medieval Classic Rock”

А.: Нечакана добрая ды цэльная пласцінка атрымалася. Яно і зразумела: музыканты ўзялі ў абарот самыя “прапаленыя” хіты рок-музыкі ды ўклалі ў іх свае лютні-дуды. Гэткі кавер-бэнд старадаўняй музыкі. Хоць мне часам здавалася, што гэта ці не хвацкі сольнік Алеся Чумакова, бо яго гераічны ды трохі пафасны голас па сутнасці і зрабіў альбом.

Песня да песні, ніводнага праколу, выдатныя аранжыроўкі ды дакладнае размяшчэнне інструментальных партый. Хіба што нам, старым рокерам, не хопіць у рэлізе асаблівага куражу, гітарнай перагрузкі ды моцы ўдарнай установкі, але гэта так, прыдзірачка. Рэч ад “Pink Floyd” — самы магутны трэк. Нясмела патрабую канцэртаў ды ўдзелу ў праграмах фестываляў з дадзенай работай. “Стары Ольса” жывы, і жывы цікавай музыкай, многая лета, сябры!

В.: Вось так напішаш, што альбом гэты нічога з сябе асаблівага не ўяўляе, а ён — бац, і возьме “Грэмі”. Ну і як я пасля гэтага буду выглядаць?.. Але ж сапраўды не ўяўляе, ужо прабачце мяне, прыяцелі-музыканты “Старога Ольсы”! Дзевяць кавераў на бранябойныя рок-хіты, аранжыраваныя пад сярэднявечную музыку, але абоймы пісталетнай не атрымалася. Да поспехаў занясу толькі дзве "кулі": варыянт “Another Brick in the Wall, Pt. 2” — манументальнай першакрыніцы “Pink Floyd” — выйшаў гэткім жа магутным. І інструментальную інтэрпрэтацыю “бітлоўскай” пусцяковіны “Ob-La-Di, Ob-La-Da”: версія можа скласці канкурэнцыю на вяселлях з карпаратывамі несмяротным умца-умца-шлягерам Веркі Сярдзючкі. Астатнія рэчы “ад куцюр” з “...Ольсы” мяне не ўразілі: выкарыстанне дзіўных для рока інструментаў на арыгінальнасці моцна не адбілася.

Магчыма, дадзены рэліз — першая паўнавартасная аўдыяработа беларускага выканаўцы, якая носіць адкрыта камерцыйны характар, таму што была запісана/складзена пад гастролі каманды па ЗША. Некалі “Песняры”, напэўна, здзівілі тамтэйшых “студэнтаў з фермерамі” сучаснай савецкай песняй з фалькавым адлівам. Хто ведае, можа і дыск “СО” створыць фурор сярод тамтэйшых адмыслоўцаў. Вось тады я і апынуся ў поўнай... няслушнасці...

ВІДЭА

Праект “Dirty Owl”, кліп на кампазіцыю “Aist Live”

А.: Думаю, у Мінгарвыканкаме гэта самы любімы кліп за апошні час. Яшчэ б — былы шэф асабіста прымае ўдзел у дадзенай рабоце: і як толькі такое стала магчымым? Ці не сваяк ён з аўтарам кампазіцыі? Таму што пад імёнамі выканаўцаў новага пакалення інжынернай камп-музыкі можа хавацца хто заўгодна.

“Dirty Owl” грае атмасферную ды вельмі спелую музыку — музыку горада, дыханне горада. У кліпе нутро велазавода цячэ працэсам стварэння байкаў, і з’яўленне ў кадры дырэктара прадпрыемства не здаецца дзіўным. Ён нібы прыйшоў паглядзець, як тут грамадзянін-электроншчык працуе. Добра папрацаваў, трэба сказаць.

В.: Артыст набулькатаў гукаў ды даў мелодыі ў адным з цэхаў Мінскага матазавода як бы непасрэдна ў час працоўнага працэсу. Ну, набулькатаў і набулькатаў, “сюр” у іншым — у сіваваласым мужчыне, які на некалькі секунд узнікае ў кадры, ківаючы ў такт музыцы галавой. “Дзесьці мы яго бачылі...” — падумаеце вы і не памыліцеся. Калі вы не служачы ААТ “Мотавела”, а жыхар нашай сталіцы, што працуе ў іншай сферы, чалавека гэтага, безумоўна, хоць раз бачылі па тэлевізары ў гадах 2010 — 2014-м. Тытр пад яго выявай тады абвяшчаў: “Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалай Ладуцька”. А сёння Мікалай Аляксандравіч і ўзначальвае азначанае вышэй прадпрыемства.

Не ведаю, ці здольна дапамагчы гэта кампазіцыя “будаваць” завадчанам, але перашкодзіць ім яна дакладна не зможа. Нават баюся выказаць здагадку, хто наступным з кіраўнікоў/чыноўнікаў можа з’явіцца ў кліпе якога-небудзь айчыннага выканаўцы...

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

"Я ваш, цёця Галя!"

Драгічыншчына: роля асобы ў развіцці ткацтва

Гэтым разам завершым гаворку пра музейны "калейдаскоп" Іванаўскага раёна ды пачнём расповед пра культурныя цікавосткі Драгічыншчыны. Тут мы таксама знайшлі шмат карыснага і для сябе, і для нашых чытачоў.

Яўген РАГІН, Кастусь АНТАНОВІЧ, Мінск — Іванаўскі — Драгічынскі — Кобрынскі раёны Брэсцкай вобласці — Мінск / Фота аўтараў

Калі зоркі згасаюць...

Па дарозе мы часта разважаем пра ролю асобы ў гісторыі Беларусі. Падчас вясновага ваяжу гэта былі Кастусь Каліноўскі і Вінцэнт Тышкевіч. Гэтым летам гутарылі пра постаць Напалеона Орды. Піяніст і кампазітар, графік і педагог, вандроўнік і паўстанец, паэт і грамадскі дзеяч, ён аб'ездзіў свет і ўсю Беларусь, пакінуў пасля сябе не абыякую мастацкую спадчыну.

Чаму сярэднестатыстычны беларус не ведае Орду? А паспрабуйце адшукаць на нашых тэлеканалах адказы на пытанні "Хто такі Орда?", "Што ён маляваў усё жыццё?", "Чаму такое імя мае?" Няма тых адказаў і ў школе. А ўявіце, якім адметным быў бы комплексны школьны дзень, прысвечаны аднаму толькі Орду? На ўроках гісторыі, малявання, спеваў гаворка вялася б толькі пра шматграннасць таленту ўраджэнца Варацэвічаў. Такое застаецца ў памяці навечна… Няма пакуль такіх урокаў. Таму і забыліся на Орду. Калі зоркі згасаюць, значыць, гэта таксама камусьці трэба.

Так, сярэднестатыстычны беларус у чаканні падвышкі заробкаў забыўся на мінулае Бацькаўшчыны. Яно часта і не патрэбна, калі жыць усё адно сённяшнім днём.

Тут была калісьці школа

Дык што, і музей Напалеона Орды ў **Варацэвічах** тады непатрэбны? Патрэбны! Гэта як паліто, набытае школьніку навырост. Дарэчы, і цяпер музей не пустуе: за час нашага візіту на легкавіку падкаціла купка зацікаўленых падарожных. Але кіраўніку музейнага комплексу Дзмітрыю Козаку хацелася б, каб чарада наведвальнікаў не перарывалася. Вельмі амбіцыйны малады чалавек. Іншы, напэўна, проста не вытрымае і фінансавую нішчымніцу, і мізэрнасць заробку, і не надта вялікі прэстыж прафесіі.

Тут была калісьці школка. У выніку рэканструкцыі спачатку з'явілася карцінная галерэя, а зусім нядаўна — Музей Напалеона Орды. На шыльдзе надпіс: "Праект сафінансуецца са сродкаў Еўрапейскага саюза "Трансгранічныя цэнтры дыялогу культур у Лосіцы і Варацэвічах". Так што яшчэ адна назва ўстановы.

Мы прайшліся па залах ды паверхах музея. Шыкоўна. Вось толькі арыгіналаў графікі няма. Ці здолее займець яе калісьці музей?

Апрача яго ў комплекс уваходзіць і асобны будынак карціннай галерэі. У вельмі далёкіх планах — узвядзенне гасцёўні і мастацкай школы. У сённяшніх эканамічных умовах такія планы праходзяць пад грыфам "мары".

Ужо дома высветлілі, што пра Музей Орды ў інтэрнэце — процьма інфармацыі. Водгукі на форумах — самыя станоўчыя. Вельмі дакладна прапісана, як можна дабрацца да Варацэвічаў асабістым легкавіком, аўтастопам і грамадскім транспартам. Словам, у музея ёсць будучыня.

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

У Мотальскім музеі я не знайшоў ужо звыклых для мяне карцін Янкі Рамановіча. Засумаваў, бо вельмі люблю творчасць мастака. А ў Варацэвічах узрадаваўся. Аказваецца, Дзмітрый Козак прыдбаў тыя палотны для карціннай галерэі музейнага комплексу. І сапраўды, тут карціны выглядаюць больш выйгрышна, бо і святла для іх хапае, і прасторы. Сюжэт трыпціху амаль што аднолькавы — вясковыя бабулі на лаўцы і маленькі хлопчык побач. Не да месца тут аналізаваць ідэйны змест твораў. Хачу толькі зазначыць, што пакуль буду жывы, буду едзіць да гэтых палотнаў. Побач з імі лягчэй дыхаецца. І адчуваеш сябе мальцам на ганку жыцця. А за табой пільна прыглядаюць Вера, Надзея, Любоў.

Шацёр праз дарогу

А цяпер — пра **Драгічыншчыну**. Вёска **Ліпнікі** здзівіла архітэктурным "артэфактам". Праз дарогу ад маштабнага Дома культуры — не менш дыхтоўны шацёр з каваным аздабленнем і сімпатычным мастком. Як патлумачыла мясцовая дзятва, якой назбіралася багата, гэта летняя танцпляцоўка. А Дом культуры быў зачынены на абед. Папярэдне даведаўшыся на сайце мясцовага райвыканкама пра наяўнасць у Ліпніках народнага фальклорна-этнаграфічнага калектыву "Скібічаны" ды ўзорнага ансамбля фальклорна-этнаграфічага танца "Ліпачка" мы хацелі пачуць пра іх дасягненні. Давялося патэлефанаваць у сельскі дом культуры пасля нашага вяртання ў Мінск. Вось толькі, як аказалася, мабільныя тэлефоны, пазначаныя на сайце, або не даступныя, або належаць абсалютна іншым людзям. Давялося патэлефанаваць у Драгічын. Сітуацыю з СДК патлумачыла метадыст раённага метадцэнтра Таіса Строг. Як высветлілася, установа ў Ліпніках працуе прадуктыўна. Рэгулярна адбываюцца разнастайныя мерапрыемствы, у тым ліку і дыскатэкі. Толькі праходзяць яны не на летняй сцэне, а ва ўтульнай і адмыслова абсталяванай зале ў будынку СДК. Больш за тое, на другім паверсе будынка працуе кафэ мясцовага СВК — з гэтай нагоды рэгулярна адбываюцца сумесныя святочныя мерапрыемствы, прыбытак ад якіх маюць абедзве арганізацыі. Галоўны ж гонар СДК — дзіцячы ансамбль "Ліпачка", які мае ў сваім арсенале звыш 20 народных танцаў, адзін з якіх "Полька-мост" з'яўляецца ўнікальнай мясцовай традыцыяй і прэтэндуе на статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Толькі за апошні час калектыў прыняў удзел у гала-канцэрце абласных "Дажынак", а таксама стаў лаўрэатам рэгіянальнага фестывалю харэаграфічнага мастацтва ў Лідзе. А вось на "Берагіню" так і не паехаў, хоць і запрашалі арганізатары. Прычына ўжо традыцыйная — не знайшлося сродкаў.

Ваенны — пра ваеннае

Шукаючы аб'екты для знаёмства ў Драгічыне, зацікавіліся сайтам мясцовага музея. Здавала-

Выставачная зала ў Музеі Напалеона Орды.

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

З мікрафонам да Коласа?

Радуе, сапраўды радуе, што зноў поўніцца рэдакцыйная пошта лістамі з рэгіёнаў краіны. А падзей у гэтых лістах — процьма. Знаёмім чытачоў з выбраным з рэдакцыйнай пошты, і, канешне, чакаем новых лістоў як з раённых ды абласных цэнтраў, так і з самых аддаленых вясковых паселішчаў Беларусі!

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Вось ліст галоўнага бібліятэкара аддзела абслугоўвання і інфармацыі **Навагрудскай** раённай бібліятэкі **Дзіяны Завадэўка**. Яна піша, што 8 верасня мясцовыя бібліятэкары зладзілі каля помніка Якуба Коласа ў райцэнтры літаратурны мікрафон "Спатканне з паэзіяй". Дзея адбылася ў рамках абласной акцыі "Чытаем разам творы Янкі Купалы і Якуба Коласа". Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі для гасцей выставу-экспазіцыю "Слава і гонар беларускай нацыі", а літаратурны мікрафон распавядаў у гэты час пра асноўныя падзеі жыцця і творчасці славутых пісьменнікаў. Да мікрафона таксама запрашаліся вучні 9 — 11 класаў, настаўнікі мовы і літаратуры, работнікі культуры, якія чыталі вершы класікаў.

Ідзе літаратурны марафон у Навагрудку.

Падчас адной з сустрэч ва ўрочышчы Хіноўск.

Удзельнікі акцыі "У цэнтры ўвагі — дзеці!"

Падобную акцыю 7 — 8 верасня зладзілі і на **Свіслаччыне**. Як паведамляе "К" метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Свіслацкай раённай бібліятэкі **Алена Рабчанка**, на мерапрыемствы, прымеркаваныя да будучага 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы, ва ўстанову культуры ды ў Ханявіцкую, Поразаўскую, Навадворскую бібліятэкі-цэнтры краязнаўства, Грынкаўскую бібліятэку, Занкаўскую бібліятэку-клуб былі запрошаны самыя розныя ганаровыя госці. Яны, як і мясцовыя школьнікі, чыталі паэтычныя радкі песняроў для ўсіх гасцей імпрэзы.

Сёння, 17 верасня, у **Любані** пройдзе III Абласное свята мастацтваў "Палескія сустрэчы". Пра гэта піша ў сваім лісце даўні сябра газеты, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама **Васіль Каткавец**. Распачнецца свята ў мясцовай дзіцячай школе мастацтваў з уручэння юным талентам Міншчыны, лаўрэатам міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў пасведчанняў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. "*І як працяг — святочны канцэрт лаўрэатаў і талентаў,* — піша Васіль Сцяпанавіч. — *Аснову праграмы складуць выступы юных музыкантаў Любаншчыны. І ўпершыню*

ся б, чарговы раённы музей. Гэтым разам толькі ваенна-гістарычны імя Дзмітрыя Удовікава. Але не, не чарговы, і не шараговы. Па дзейнасці сайта ўжо можна меркаваць і пра працу самой установы. Маецца тут і аператыўная інфармацыя пра музейныя знаходкі, сустрэчы з ветэранамі, фотагалерэя Драгічына розных гадоў, онлайн-тэст на веданне гісторыі Драгічына. Але галоўнае — музейнае выданне газета "Наш край — Загородье", якая раней мела беларускую назву "Гістарычная брама". З'явілася яна яшчэ ў 2006 годзе дзякуючы намаганням удзельнікаў мясцовага клуба гісторыкаў "Краязнаўца".

паказваюць не толькі ваенную атрыбутыку, але і дзіцячыя цацкі, вучнёўскія прадметы савецкага часу — тое, што можа зацікавіць сучаснага падлетка, які нават уявіць не можа, што такое і для чаго патрэбны пяро і чарнільніца.

Колькасць наведвальнікаў сёлета павялічылася. Часцей сталі прыязджаць землякі, лёсам раскіданыя па ўсім свеце. Стала модным дарыць у якасці падарунка білет у музей. На гэтыя выпадкі прапанавалі б рабіць адмысловы квіток і шэраг інтэрактыўных бонусаў да яго. Скажам, магчымасць пастраляць у ціры. Праўда, пакуль гэта здзейсніць можна толькі на Ночы музеяў, падчас якой пра-

Вырабы Антопальскага цэнтра рамёстваў.

Навуковы супрацоўнік драгічынскага музея Кацярына Крук.

Дырэктар Музея Напалеона Орды Дзмітрый Казак у зале з работамі Янкі Рамановіча.

Ваенна-гістарычны музей у Драгічыне.

Летняя сцэна ў Ліпніках.

Пасля ўсяго гэтага хацелася як мага хутчэй развіртуалізавацца і пабачыць музей на ўласныя вочы ды пазнаёміцца з яго дырэктарам Сяргеем Гранікам. Да нашага жалю, кіраўнік установы ад'ехаў перад нашым візітам па службовых абавязках. У яго адсутнасць паразмаўлялі з навуковай супрацоўніцай Кацярынай Крук. Яна і падзялілася музейнымі навінамі. Так, з апошняга — ва ўстанове былі распрацаваны і пачалі праводзіцца музейна-педагагічныя заняткі. Апроч таго з музейным чамаданам супрацоўнікі музея наведваюць школы раёна. Праўда, панавана паўдзельнічаць і ў квэст-гульні "Сталкер".

Прадугледжаны ў музеі і выязныя экскурсіі па раёне. Распрацавана ўжо некалькі маршрутаў. Дзецям вельмі падабаецца, бо апрача цікавай інфармацыі можна пакаштаваць стравы ад палявой кухні. Падлеткам, у сваю чаргу, прапаноўваецца паўдзельнічаць у зімовым экстрэмальным паходзе. І жадаючых, трэба сказаць, багата.

Выставачных плошчаў вельмі мала, а таму, каб рэгулярна прыцягваць адну і тую ж публіку, трэба добра пастарацца. У музеі гэта разумеюць і, як нам здалося, спраўляюцца з пастаўленай задачай.

Сярод заўваг такая: музей у Драгічыне пачынаецца з вешалкі, на якой вісіць мундзір радавога. Задумка — цудоўная. Але, па логіцы, яна павінна мець натуральны працяг, дакладней — выхад з музея, на якім таксама павінна быць вешалка, але ўжо з мундзірам генеральскім. Маўляў, які салдат не марыць… Не грэх для гэтага і асобныя дзверы (няхай сімвалічныя) зрабіць.

(Не)лірычнае адступленне Канстанціна Антановіча

Стала не такой ужо рэдкасцю, калі райцэнтры аддаюць пальму першынства ў сферы культуры мястэчкам ці вёскам. У Іванаўскім раёне гэта, безумоўна, Моталь. У Драгічынскім негалоснае званне культурнай сталіцы раёна мае Бездзеж. Там на базе мясцовага музея праводзяцца мерапрыемствы народныя, свецкія, царкоўныя... Чаго там толькі няма! Але, думаецца, канкурэнцыя Бездзежу будзе не лішняй. І як на Іванаўшчыне ўсё часцей турысты едуць у Варацэвічы, так і ў Драгічынскім раёне турыстычныя плыні можна арыентаваць і ў Антопаль, які пры належнай падтрымцы можа стаць брэндам. А чаго б і не стаць, калі сёння сувеніры з гэтага гарадскога пасёлка можна сустрэць у Францыі, Чэхіі, Польшчы ды багата якіх яшчэ краінах свету.

Антопальскі феномен

Адны з самых важкіх уражанняў за гэтую камандзіроўку напаткалі нас у гарадскім пасёлку **Антопаль**.

Пра музыканта-мультыінструменталіста кажуць: чалавек-аркестр! Галіна Сцепанюк — чалавек-цуд. Прычым вялікі, рознажанравы: і ткацкі, і педагагічны, і маральны. Мы не будзем казаць пра яе ўзнагароды, бо іх вельмі шмат. Мы паспрабуем распавесці, як дырэктар і адзіны майстар (не лічачы валанцёраў) Цэнтра рамёстваў здолела згуртаваць вакол сябе самых таленавітых дзяцей гарадскога пасёлка і ягоных ваколіц. Ды што дзеці! У Галіны Міхайлаўны нават прыбіральшчыца Цэнтра рамёстваў — вышывальшчыца ад Бога.

У гуртках — 61 дзіця. На большую колькасць не хапае квадратных метраў. Таму існуе строгі конкурс. Займаюцца круглы год па вечарах з кароткімі перапынкамі на каву і гарбату. Аднойчы летам завітаў хлопчык, не з мясцовых, з тых, што прыязджаюць на вакацыі да бабуль. Мясцовыя падлеткі імгненна яго "раскусілі". А хлопчык дрыжачым голасам прамовіў: "Цёця Галя, я ва-а-аш!" Ці можна прыгадаць лепшы доказ папулярнасці цэнтра і яго кіраўніка?

Галіна Сцепанюк вучыць ткаць паясы, займацца дэкаратыўным роспісам, вырабляць традыцыйныя сувеніры. Знаходзіць час і для экспедыцый. Аднойчы ў Сулічаве знайшла ў бабульчыным куфры маткі нітак яшчэ з польскага часу. З гэтых нітак, што яркасці не згубілі, зрабіла пояс, беручы за ўзор кавалачак старадаўняга вырабу. Палякі не ўцямілі, што гэта — наватвор. Таму за мяжой Галіна Сцепанюк — у даўно прызнаным аўтарытэце, стала атрымлівае запрашэнні на ўдзел у конкурсах і фестывалях. Пошукам сыравіны для будучых твораў заняты кожны гуртковец. Даследуюцца куфры, на вуліцы падбіраюцца каляровы дрот, стужачкі… Усё ідзе ў справу, усё потым радуе вока. Каб вы ведалі, з якога смецця…

Як завуць цябе, бібліятэкар?

Пры сустрэчах з бібліятэкарамі, прызнаемся, рознае было, і смешнае, і сумнае. Сёння не пра першае, а пра другое.

Бібліятэка ў Антопалі месціцца ў адным будынку з Цэнтрам рамёстваў. Так што прамінуць яе не маглі. Пачалі знаёміцца з бібліятэкарам, назвалі, па завядзёнцы, сябе, пацікавіліся прозвішчам жанчыны. "Завуць мяне Алена, а прозвішча не назаву", — адказала тая. Як ні стараліся, але чалавека не "ідэнтыфікавалі". А што? Таксама ўражанне, толькі не вельмі станоўчае. Настрой працягваць гутарку знік увобмірг. Чакаюць нас не паўсюль. І не паўсюль сустракаем мы аднадумцаў. Што зробіш…

Агульнае (не)лірычнае заканчэнне

Сумная рэч: у раённых цэнтрах знікаюць кнігарні. Знайшлі яе толькі ў Кобрыне. І тую трымае прыватнік. Даходы ад продажу, натуральна, — мізэрныя. Пакупніцкая перавага аддаецца крупам, кілбасе ды алею. Радуе іншае: у вёсках і мястэчках пакуль засталіся выбітныя людзі. Такія, як Галіна Сцепанюк. І гэта дадае надзеі.

К

на нашым свяце Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі прадставіць праграму "Эксклюзіўныя музычныя інструменты ў беларускай музыцы XIX — XX стагоддзяў. Вядучая — доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава пазнаёміць з арфай, бас-кларнетам, альтовай флейтай, клавішамі.

Як адзначае Васіль Каткавец, у рамках свята адбудзецца прэзентацыя мастацкай выставы "Да Любані з любоўю". А пасля ў парку культуры і адпачынку адбудзецца вялікі святочны канцэрт "450-годдзю Любані прысвячаецца", на якім выступяць лаўрэаты міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, салісты Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Беларусі і іншыя выканаўцы.

А на наступны дзень, 18 верасня, у аграгарадку **Васілішкі** і вёсцы **Старыя Васілішкі Шчучынскага** раёна Гродзенскай вобласці пройдзе "Свята музыкі Чэслава Нэмэна", паведаміла ў рэдакцыю **Алена Барэль**. У Васілішкаўскім цэнтры культуры адбудуцца фотавыстава і выступленне калектываў аматарскай творчасці Шчучынскага раёна і гасцей свята. Пасля будзе зладжаны мотапрабег да вёскі Старыя Васілішкі, дзе ў клубе-музеі Чэслава Нэмэна пройдзе інтэрактыўная экскурсія і канцэрт інструментальнай музыкі ад Шчучынскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці.

Уладзімір Жылевіч піша пра тое, што на **Століншчые**, ля вёсак Стасіна, Рубель, ва ўрочышчы Хіноўск падчас Вялікай Айчыннай вайны фашысты знішчылі больш за 13 тысяч чалавек мірнага насельніцтва. У верасні ў сасновым бары ля Стасіна з усяго свету збіраюцца сваякі і родныя загінулых.

І апошняе. Наш сталы аўтар, спецыяліст Савецкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях **Мінска** Таццяна Бычанок нагадвае, што з мэтай прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблем траўматызму і гібелі дзяцей ад пажараў з прычыны пакідання іх без нагляду з 22 жніўня па 23 верасня ў краіне праходзіць прафілактычная акцыя "У цэнтры ўвагі — дзеці!", прымеркаваная да Дня ведаў. "*Акцыя праходзіць у тры этапы*, — піша аўтарка. — *Першы этап — з 22 па 31 жніўня на аб'ектах гандлю. Другі этап — з 1 па 16 верасня ў агульнаадукацыйных установах. І трэці этап — з 19 па 23 верасня ў дашкольных установах. У акцыі бяруць актыўны ўдзел актывісты аддзяленняў Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных, а таксама работнікі па надзвычайных сітуацыях*".

К

Суботнія сустрэчы

Доктар, неабыякавы да культуры

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 6.)

У Сафійскім саборы — выдатная канцэртная зала, раней там сапраўды была рэгулярная музычная праграма, сёння ж толькі два фестывалі на год, вясенні і асенні, астатняе — пераважна канцэрты для турыстаў. Мне здаецца, людзі сумуюць па актыўным культурным жыцці ў невялікіх гарадах. А другая прычына абыякавасці ў тым, што зараз людзі жывуць у іншым вымярэнні, у сацыяльных сетках. Яны нават у кафэ сядзяць і глядзяць кожны ў свой тэлефон.

— Чаму так павольна вяртаецца беларуская мова ў наша жыццё?

— Мне здаецца, што з гледзішча сучаснага часу наша мова — з'ява вельмі маладая. Сучасная традыцыя беларушчыны ў нас пайшла ад братоў Луцкевічаў, Тарашкевіча і іншых, карацей, пачаткам XX стагоддзя. Да гэтага беларусы жылі пераважна ў вёсках, размаўлялі па-беларуску, але ў іх галовах не было думкі, што гэта паўнавартасная мова. Таму што не было нацыянальнай школы, падручнікаў, збору граматыкі. Па сутнасці, мова пачала выкрышталізоўвацца сто гадоў таму. Гэта вялікі прагрэс. Я не ведаю мовы, якая б так хутка вярталася, развівалася. Яна і дагэтуль развіваецца, з'яўляюцца новыя словы, вызначэнні, тэрміны. І многія проста не паспяваюць за гэтым працэсам. Канешне, беларускую мову як дзяржаўную мову трэба больш актыўна падтрымліваць.

— Не сакрэт, што сфера культуры — адна з найбяднейшых. А заробак уплывае на настрой і лад жыцця...

— Ёсць у Маскве пад кіраўніцтвам Кірыла Сярэбранікава "Гогаль-цэнтр", які я люблю: перагледзеў там усё. Дык вось, гэта адзіны ў Маскве тэатр на гасразліку. Ён ні капейкі не атрымлівае ад дзяржавы. Усё трымаецца на якасным рэпертуары, прафесійнасці. Таму і білеты ў іх вельмі дарагія. Але публіка, як кажуць, "валіць валам". Гэта прыклад таго, што культура не абавязкова павінна быць датацыйнай. Яна можа зарабляць калі не грошы, дык іншыя бонусы. А часта ідзеш у нейкі той жа маскоўскі тэатр і потым шкадуеш. Дзяржава, падаткаплацельшчыкі не павінны падтрымліваць шмат устаноў. Гэта баласт, у тым ліку культурны. Я б нават не трымаў столькі тэатраў, у якіх працуюць людзі, якія называюць сябе авангардыстамі, але ў глядзельнай зале пры гэтым нікога няма. А яны атрымліваюць грошы ад дзяржавы на свае творчыя эксперыменты. Культуру, на мой погляд, не трэба баяцца адпускаць у сэнсе магчымасці зарабляць грошы на якасным творчым прадукце.

— Якія парады як доктар дасце работнікам сферы культуры?

— Парады самыя агульныя. Гэта правільнае харчаванне: кожны дзень 400 грамаў чырвонага, жоўтага, зялёнага, што хрумсціць, — клятчатку. Не паліць, быць фізічна актыўным, хадзіць пешшу ці хаця б на лецішчы працаваць. Алкаголь: чым менш, тым лепш. А калі яго ўжываць, дык чырвонае віно ў вельмі невялікіх дозах, гэта садзейнічае прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў. Быць у суладдзі з сабою, менш скардзіцца на жыццё. Больш думаць, што ты можаш зрабіць і для сябе, і для астатніх людзей. І ўвогуле — жыць у любові.

К

Персаніфікацыя культуры

Алея зорак. Postfactum

Аляксей Сількевіч.

Стваральнікам і нязменным кіраўніком рагачоўскага народнага тэатра доўгія гады быў Аляксей Сількевіч. Пачынаючы з 1960-х, Аляксей Ігнатавіч упарта рабіў акцэнт на роднай мове, народным гумары, спрадвечных чалавечых каштоўнасцях, пераходзячы з камедыйнага жанру ў жанр казкі, з трагікамедыі ў меладраму, і зноў вяртаючыся да прыпавесці і фантасмагорыі.

Спектакль пад назвай "Чужое багацце" паводле твора гомельскага драматурга Васіля Ткачова, п'есы Аляксея Дударава "Прыцемкі", "Кім", "Іван і мадонна", адзін з апошніх спектакляў Сількевіча "Мікітаў лапаць" — усе пастаноўкі народнага тэатра гучалі на сакавітай беларускай мове. П'есы падбіраліся ім, у асноўным, сучасных аўтараў. Гэта была прынцыповая пазіцыя, мэтанакіраваная дзейнасць асобнага творцы для развіцця культуры і для нашага нацыянальнага самаўсведамлення — тут і цяпер. Не чужое, сваё багацце — сваю гісторыю будзем беражліва захоўваць ва ўдзячнай памяці. Пра што яна сёння?

Слушная народная мудрасць: сыходзячы, чалавек забірае свой свет з сабой. Гэта непаўторны свет, як непаўторны і рэжысёр Аляксей Ігнатавіч Сількевіч, які пайшоў з жыцця ў 2006-м. Якім ён быў, чым вылучаўся? Разумным, падцягнутым, трохі вышэйшым за сярэдні рост, з завостранымі рысамі твару, зачасанымі назад цёмнымі валасамі. Негаваркі, стрыманы, добразычлівы, весела адгукаўся на добры жарт... Любіў свой горад. Кожны дзень шпацыраваў па яго вуліцах, атрымліваючы задавальненне ад сузірання наваколля і гараджан. Завітваў у цэнтральную бібліятэку, якая знаходзіцца ў будынку XIX стагоддзя (сёння гэта Дом кнігі), каб пачытаць свежую прэсу. Любіў парыцца ў гарадской лазні. Раз на год стараўся з'ездзіць да Чорнага мора. І разважаў, разважаў, пакуль не наставаў час дзейнічаць. Умеў узяць артыста і так яго паказаць, што імёны гэтых акцёраў ведалі ў Рагачове літаральна ўсе. Вылучаўся павагай да сваёй прафесіі, сур'ёзным падыходам да справы, талентам творцы. А вось і ўсё. Дай Бог кожнаму!

Вернай сяброўкай, музай і нават актрысай у некаторых пастаноўках была Марыя Сямёнаўна — жонка Аляксея Ігнатавіча. Вельмі жвавая, напорыстая, яна валодала вялізнай энергіяй. Працавала ў аддзеле культуры, шмат гадоў узначальвала ансамбль народнага танца "Дняпранка", нават на пенсіі ставіла хаду юным "міс Рагачова". Як распавядалі відавочцы, у пастаноўцы 60-х "Барабаншчыца" яна ўзлятала на стол адбіваць чачотку, чаруючы гледачоў сваімі запалам і жаноцкасцю...

Канец 1990-х адзначыўся бурным усплёскам у жыцці народнага тэатра. Дзіва, бо ў былых рэспубліках СССР адзначаўся заняпад дзейнасці тэатраў наогул, а вось на канкрэтнай Рагачоўшчыне — уздым! Аляксей Ігнатавіч з велізарнай упартасцю пераадольваў усе перашкоды, каб зноў і зноў гучала родная гаворка са сцэны галоўнай залы Рагачова. На вяршыні айсберга заставаліся гарачыя воплескі выдатным, таленавітым народным акцёрам, узгадаваным Майстрам Сількевічам. А другая частка — тытанічныя намаганні па арганізацыі працэсу амаль без дапамогі мастака, гукааператара, тэхнічнай падтрымкі, сродкаў, — па-за ўвагай. Ведаеце, калі з належным пієтэтам вымаўляюцца імёны Таўстаногава, Яфрэмава, Любімава, будзе справядліва нагадаць, што для Рагачова імя Сількевіч мае тую ж вагу і тое ж значэнне.

Людзі сыходзяць. Паступова страчваецца і памяць пра тых, чый лёс тычыўся духоўнага жыцця горада, хто напаўняў яго самааддданай творчасцю, паэзія гэта, музыка, тэатр ці выяўленчае мастацтва... Як заезджаны гэтыя словы, але яны верныя. У апошнія гады Сількевіч быў не супраць перадаць сваё стварэнне ў рукі маладой змены, непакоіўся пра адсутнасць ахвотных прыняць "эстафету". Замяніць на пасадзе асобу такога ўзроўню было надзвычай складана.

У свой час рагачоўскі тады яшчэ аддзел культуры задумаў стварыць па амерыканскім узоры Алею славы з імёнамі і адбіткамі рук выбітных людзей горада. Вельмі шкада, што ідэя дагэтуль не рэалізавалася. З той хаця б прычыны, што спіс кандыдатаў на "зорку" пачынаўся з Аляксея Сількевіча. І, баюся, на ім жа заканчваўся, бо не было працягу. Падумаць толькі, ніхто на той момант не мог зраўняцца з маштабам яго асобы! У Рагачове шмат выдатных дзеячаў у сферы культуры, адукацыі, спорту, безумоўна годных згадвання. З кожным годам іх імёны, выкрышталізаваныя яшчэ ў XX стагоддзі і вядомыя кожнаму рагачоўцу, становяцца толькі больш выпуклымі, аб'ёмнымі, яркімі. Няхай ажыццявіцца ў найбліжэйшы час прыгожая ідэя з зоркамі! Пакуль гэтыя зоркі нам свецяць.

Алена КАЛУГІНА, малодшы навуковы супрацоўнік музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля

Сцэна са спектакля "Мікітаў лапаць" Рагачоўскага народнага тэатра. / Фота прадастаўлена аўтарам

Як сумясціць маркетынг з куфрамі?

Памятаю, як мая настаўніца па гісторыі Ала Рэчыц знаёміла нас з музеямі роднага горада. Яна выдзяляла свой вольны час на тое, каб звадзіць вучняў у музей. Прайшоў час, і я зноў завітала ў музей народнай культуры Мазыршчыны "Палеская веда", куды апошнім разам прыходзіла з настаўніцай. Пра цікавосткі музея і ягоную дзейнасць распавяла старшы навуковы супрацоўнік Віталіна Сайфутдзінава.

Вольга РОПАТ, Мінск — Мазыр — Мінск / Фота аўтара

Віталіна Сайфутдзінава распавядае пра калекцыю "Палескай веды".

"Упісацца" ў школы

І першае, што я зразумела з размовы з Віталінай Талібжанаўнай: школьных наведвальнікаў у "Палескай веды" стала менш.

— Хочацца, каб настаўнікі больш развівалі дзяцей — прыводзілі вучняў у музей, ёсць класная гадзіна ў раскладзе ці яе няма… Атрымліваецца, мы шмат чаго прапануем, але не заўсёды "упісваемся" ў планы школы. Так, з музычнага каледжа некалькі разоў прыходзілі навучэнцы, прасілі распавесці пра традыцыйныя касцюмы. Зараз прыходзяць у асноўным сем'ямі, стала больш турыстычных груп, а таксама турыстаў, якія даведаліся пра музей праз Інтэрнэт ці ад знаёмых.

Музею ёсць, чым пахваліцца. Маю на ўвазе не толькі нейкія рэдкія экспанаты, а таксама і тое, як складзена экспазіцыя: прадумана і выверана. Існуе яшчэ адзін пакой, дзе праводзяцца выставы, заняткі для школьнікаў (якіх налічваецца больш за 20), тэатралізаваныя прадстаўленні. Выключна музейнымі мерапрыемствамі музей не зможа прыцягнуць вялікую колькасць наведвальнікаў. Супрацоўнікі разумеюць, што патрэбен арыгінальны маркетынгавы ход. Але што можа прапанаваць музей народнай культуры — асабліва музей з пэўнай канцэпцыяй (аўтар яе — начальнік аддзела Інстытута культуры Беларусі Ала Сташкевіч, мастацкае ж вырашэнне належыць Рыгору Сташкевічу і Леаніду Мірончыку). Гэта тая тэматыка, якая знаходзіцца часта ў нейкім "некранутым" становішчы, не асабліва прымаючы элементы сучаснасці. І музеяў з такога ж кшталту праблемамі, упэўнена, у краіне хапае. На думку Віталіны Сайфутдзінавай, неабходна правесці рэканструкцыю экспазіцыі сучаснымі мастацкімі і тэхнічнымі сродкамі, таму што музею ўжо больш за 17 гадоў, і яго "узрост" бачны пры тэхнічным аналізе экспазіцыі.

Але звернемся да цікавостак экспазіцыі, на аснове чаго тыя тэхналогіі грунтаваць?

Пазнаць сваіх продкаў

Невялікае памяшканне з некалькімі пакойчыкамі. У адзін з іх, які нагадвае жылы пакой продкаў, — уваход праз сімвалічны скрыўлены парог. Ён аддзяляе наведвальніка ад тых, хто калісьці жыў на Мазыршчыне. Абстаўлена ўсё па колішніх правілах, калі кожнай рэчы надавалася ўвага. Адразу кідаецца ў вочы калыска: з нараджэннем дзіцяці звязана багата рытуалаў і прыкмет.

— Да хрышчэння немаўля называлі Багданька, каб нячыстая сіла не зашкодзіла яму, — кажа Віталіна Талібжанаўна. — Першы абрад купання называўся зліўкі. Дзіця голымі рукамі браць забаронена, таму выкарыстоўвалі звычайна ручнік, які, па меркаванні даследчыкаў, сімвалізуе шлях. На Мазыршчыне абрад меў свае асаблівасці. Напрыклад, у Петрыкаўскім раёне (па запісах Аляксандра Сержпутоўскага), калі купалі дзяўчынку, — ваду вылівалі на парог, каб хутчэй выйшла замуж, калі хлопца — пад печ, каб быў гаспадаром. А з экспедыцыйных даследаванняў мы даведаліся, што ў Мазырскім раёне вылівалі на вугал хаты альбо там, дзе ніхто не ходзіць, каб дзіця здаровае было.

— У сваіх экспедыцыях мы сустракалі жанчын, якія пераязджалі з іншага раёну ў Мазырскі, — адказала старшы навуковы супрацоўнік. — І тое, што яны з сабой прывозілі (посцілкі ды іншыя тканыя вырабы), адрознівалася. Дарэчы, да 17 — 20 гадоў трэба было наткаць шмат ручнікоў, посцілак, а таксама вышыць адзенне. Калі нявеста прыязджала ў дом жаніха, дык абавязкова павінна была паказаць ягоным бацькам і гасцям на вяселлі пасаг. І калі куфар падымалі ўсяго двое мужчын, тое лічылася за ганьбу.

Агледзеўшы рэканструяваны куток хаты, звярнула ўвагу на хадункі і агнявіцу, з дапамогай якой здабываўся свяшчэнны агонь. Агнявіца лічыцца сімвалам адзінства трох сфер — свету прыроды, чалавека і сакральнага. Але продкі карысталіся ёй (па запісах Аляксандра Сержпутоўскага) у выключных сітуацыях: падчас эпідэміі, засухі альбо перасялення сям'і ў новую хату. Таксама "ў хаце" — фотаздымкі з Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў. На адным з іх — вучні Раманаўскай сельскай школы ды падручнікі пачатку XX стагоддзя.

— Быў выпадак, калі на экскурсію з Раманаўкі прыехалі дзеці, але іх не столькі выгляд школы зацікавіў, як людзі на здымку. Адразу пачалі разглядаць яго ў надзеі пазнаць на ім сваіх продкаў.

Чаго няма ў іншых?

— У кнізе "Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў" Аляксандра Сержпутоўскага напісана, што ў нас на Купалле не ў ваду вянкі кідалі, а ў агонь. Калі вянок згарыць, значыць, жанчына выйдзе замуж. А калі юнак хацеў ажаніцца з пэўнай дзяўчынай, то ён павінен быў выхапіць з вогнішча яе вянок, каб той не паспеў згарэць, — кажа мая візаві.

Асаблівую ўвагу надавалі продкі шлюбнаму адзенню. Ад паўсядзённага адрознівалася яно яркімі колерамі ды большай колькасцю арнаментаў. Па жаночым касцюме канца XIX — пачатку XX стагоддзя можна было даведацца пра матэрыяльнае становішча нявесты. Скажам, чым больш андаракаў было ў дзяўчыны, тым больш моднай яна лічылася. А выйшлі з выкарыстання такія рэчы дзесьці ў 1930-я: за ўсе свае экспедыцыі мы знайшлі іх толькі тры. І да гэтага часу важнай дэталлю ўбрання нявесты з'яўляецца шлюбны вянок. Што да вянкоў, то іх звычайна дзяўчыны рабілі з рознакаляровай паперы, часам бралі вяночак у каго-небудзь. У адной вёсцы ў 1940-х усе нявесты бралі вянок у "старой дзевы", якая яго да вяселля падрыхтавала, але замуж так і не пайшла.

— У нашым музеі знаходзіцца гэта рэдкая рэч, — кажа Віталіна Сайфутдзінава. — Думаю, не кожны этнаграфічны музей краіны можа тым пахваліцца. Сярод самых цікавых экспанатаў можна вылучыць наміткі (выйшлі з выкарыстання дзесьці пасля І сусветнай вайны), або сэрпанкі — самыя прыгожыя наміткі другой паловы XIX стагоддзя, якія завіваліся толькі на шлюбе. Мы знайшлі іх у Жыткавіцкім раёне.

Свет мужчын

Наступная частка экспазіцыі прадстаўлена, збольшага, тэматычнымі фотаздымкамі, прыладамі працы земляробаў і рыбаловаў, а таксама разнастайнымі прыстасаваннямі для лоўлі рыбы. Апошніх назбіралася столькі, што можна, па словах Віталіны Талібжанаўны, стварыць асобны музей рыбалоўства.

— Аднойчы да нас зайшоў мужчына і сказаў, што ягоны дзед рабіў на продаж чаўны. А на выраб іх патрэбна было дзесьці два тыдні, існавалі свае тэхналагічныя сакрэты. Пэўныя асаблівасці тычацца і бортніцтва, якое лічылася прывілеяваным промыслам. Існавалі бортныя знакі (іх можна ўбачыць у музеі), якія былі таксама і адпаведнымі сімваламі.

Увогуле кожная з мікратэм, скажам, этапаў быцця чалавека, у экспазіцыі распрацавана ўдала. Віталіна Сайфутдзінава распавяла пра ўсе гэтыя этапы: ад нараджэння да смерці. Такім чынам, атрымаўся колазварот часу, сэнс якога — ў адраджэнні ў сваіх нашчадках.

Узаемасувязі

З Віталінай Сайфутдзінавай выязджалі ў экспедыцыі па Мазырскім Палессі з праектам этнакультурнага вывучэння Мазыршчыны "Шляхамі Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага" навуковыя супрацоўнікі з музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. На практыку ў "Палескую веду" разпораз прыязджаюць з вышэйшых навучальных устаноў краіны, цікавяцца фондамі, экспедыцыйнай дзейнасцю, музейнай педагогікай.

А як адносіны з іншымі музеямі? Падчас гутаркі зразумела: сувязь з тымі ж рэгіянальнымі і сталічнымі музеямі раней была моцна наладжана. Віталіна Талібжанаўна лічыць: сталічным музеям зараз цікава супрацоўнічаць з буйнымі музеямі замежжа. Так, нам і сапраўды ёсць што пераняць. Але ж, на жаль, мы не заўжды можам цікава падаць, а пасля прапанаваць штосьці сваё для замежнікаў. Мо, як пісаў Купала, у пошуках перлін "умей шукаці блізка"? Гэтак жа як капрадукцыя ў кіно, актуальная яна і ў музейнай справе.

К

R + A: сіла музейнага брэнда

ЛАТВІЯ

Больш за пяць гадоў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы супрацоўнічае і сябруе з Аб'яднаннем мемарыяльных музеяў Латвіі. Беларусы заўсёды чакаюць калег на адкрыццях экспазіцый ды выязджаюць на адпаведныя імпрэзы да суседзяў. Сёлета ў тамтэйшых музейшчыкаў было багата падстаў, каб даслаць у Беларусь запрашэнні: за год яны адчынялі адразу тры абноўленыя філіялы музея народнага паэта Латвіі Яна Райніса. Пра асаблівасці музейнай справы Латвіі, пра беларускі прыклад і замежныя цікавосткі, якія былі б карыснымі айчынным мемарыяльным музеям, распавялі "К" дырэктар Музея Янкі Купалы Алена ЛЯШКОВІЧ і намеснік дырэктара па навуковай рабоце Наталля СТРЫБУЛЬСКАЯ.

Настасся ПАНКРАТАВА

Партрэты Райніса і Аспазіі з тэхналагічным дадаткам у выглядзе пераплеценых радкоў з іх твораў. / Фота прадастаўлены музеем

Што змянілася?

А.Л.: — Мы наведалі тры аб'екты: лецішча Райніса і яго жонкі, паэтэсы Аспазіі ў Юрмале, Тадэнаву — радзіму пісьменніка, і дом-музей Райніса і Аспазіі ў Рызе. Музейшчыкі Латвіі знаходзяцца ў такіх жа, як мы, умовах: яны таксама бюджэтнікі, іх штаты аптымізавалі, адчуваецца недахоп супрацоўнікаў. Аднак там маюць магчымасць працаваць са спецыяльнымі фондамі. Скажам, балтыйскія калегі адправілі заяўку на грант у нарвежскі фонд, які спецыялізуецца на драўляным дойлідстве. Справа ў тым, што філіялы месцяцца ў будынках — помніках драўлянай архітэктуры. Дык вось, два гады таму музейшчыкі атрымалі грошы на праект, будаўніцтва, капітальную рэстаўрацыю, рэстаўрацыю музейных прадметаў, якія планавалася размясціць у экспазіцыі, на стварэнне канцэпцыі і яе практычнае ўвасабленне. Як усё на вачах змянялася! Асабліва ў параўнанні з 2013 годам, калі становішча філіялаў музея Райніса было, мякка кажучы, сумнае.

Мяне вельмі ўразіла, што нават вясковыя філіялы, якія месцяцца кіламетраў за трыста ад Рыгі, займелі добрую інфраструктуру. Музеі сапраўды паклапаціліся пра свайго наведвальніка: у іх з'явіліся сучасныя прыбіральні з каналізацыяй, асобныя прыбіральні для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, душы для наведвальнікаў і супрацоўнікаў. Гэта тыя рысачкі, што распавядаюць пра новы ўзровень працы ў такіх установах культуры і іншае стаўленне да наведвальнікаў. Чаго нам яшчэ, на жаль, не заўсёды хапае...

Н.С.: — Нарвежцы выстаўлялі жорсткія патрабаванні да спецыялістаў. Прынамсі, калі неабходна было замяніць бервяно, то дазвалялася яго абгаблёўваць толькі сякерай і па адмысловых правілах, адпаведных часу ўзвядзення гмаха: у дачыненні да архітэктурных помнікаў выкарыстанне сучасных інструментаў патрапіла пад забарону. Калі, напрыклад, спецыяліст не выконвае ва ўстаноўлены тэрмін сваю працу ці робіць яе з парушэннем стандарту, то правяраючы мае права не падпісаць акт прыёму і грошы на дадзены этап рэстаўрацыі не выдаткоўваюцца. Было шмат бюракратычных патрабаванняў з боку фонда, аднак, жорсткі кантроль паспрыяў выдатнаму выніку: узровень якасці рэстаўрацыі будынкаў і прадметаў надзвычайны!

Сапраўды ўражвае, у якім шчыльным кантакце працавалі над аб'ектам будаўнікі, рэстаўратары, дызайнеры, навуковыя супрацоўнікі. У нашай краіне, на жаль, яшчэ сустракаюцца выпадкі, калі адны зрабілі ў музеі рамонт, другія выканалі ўнутраныя працы, а потым прыходзіць дызайнер і не ведае, што з усім гэтым рабіць, бо разеткі не там размешчаны, тут трэба наноў штрабіць, там — пераносіць камунікацыі...

9 слаёў і адзін сканер

А.Л.: — Пабачанае намі — прыклад надзвычай беражлівага стаўлення да рэстаўрацыі і захоўвання музейных каштоўнасцяў. Напрыклад, музей шукаў шпалеры, каб узнавіць гістарычны выгляд мемарыяльных пакояў. У Латвіі ўжо не выпускаюць шпалеры, таму дырэктар аб'яднання Рыта Мейнэртэ, калі была ў Мінску, хадзіла па крамах у пошуках падобнага малюнку. Нічога, што хаця б аддалена нагадвала тую эпоху, не знайшлося. І тады латвійскія музейшчыкі адсканавалі і фактычна зрабілі такія ж шпалеры, якія былі калісьці на лецішчы Райніса і Аспазіі ў Юрмале.

Н.С.: — Дарэчы, моманты рэстаўрацыі ўвасоблены ў экспазіцыі. Тыя ж шпалеры: за стагоддзе на сценах з'явілася 8 — 9 слаёў, таму ў некаторых месцах было вырашана прадэманстраваць іх усе адразу. Таксама пакідалі без атынкоўкі частку сцяны, каб наведвальнік мог пабачыць асаблівасці арыгінальных бярвенняў, уключылі ў экспазіцыю старыя дзверы дома, якія дагэтуль проста валяліся. Іншымі словамі, беражлівы падыход да кожнай дробязі. Экспазіцыя атрымалася па-сапраўднаму музейнай: усё тое, што павінны зберагчы і ўлічыць, тут захавана і выстаўлена на паказ.

А.Л.: — Таму не дзіва, што наведвальнікаў адразу пабольшала. Можа, па беларускіх мерках, лічба і невялікая, але трэба памятаць, што ва ўсёй Латвіі пражывае менш за два мільёны жыхароў. Напрыклад, экспазіцыя ў Тадэнаве была адчынена напрыканцы ліпеня, і за гэты час туды завітала каля паўтары тысячы чалавек. Для музея, які месціцца на хутары за 300 кіламетраў ад Рыгі, куды грамадскім транспартам не даедзеш, — сапраўды шмат.

Штурхаць дазваляем!

А.Л.: — Новаадчыненыя музеі развярнуліся да наведвальніка. Той жа мемарыяльны дом — даволі невялікі, але заслуга дызайнераў, што яны змаглі знайсці прастору для працы з наведвальнікамі, асабліва з дзецьмі. Сучаснаму музею ўжо мала толькі праводзіць экскурсіі: сёння неабходна працаваць з гасцямі, праводзіць інтэрактыўныя праграмы.

Н.С.: — Непрыкметна, але вельмі эфектна ў музейную прастору ўпісаны мультымедыйныя тэхналогіі: тут не пабачыш знарок выстаўленых экранаў.

А.Л.: — Напрыклад, у Юрмале нам паказалі партрэт Райніса і Аспазіі, на якім постаці стралялі адзін аднаму вачыма. Насамрэч, партрэт уяўляе сабой два тэлевізары, на якія запушчана спецыяльная праграма. На падлогу ідзе праекцыя вершаў паэтаў: радкі абодвух бягуць "васьмёркай", сімвалізуючы агульны лёс. Хочацца паўтарыць такі прыём у нас! Дзеля справядлівасці скажу, што латвійскія калегі многаму вучыліся і ў Музея Купалы, які быў першым у Беларусі з літаратурных, хто масава ўкараніў сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў экспазіцыю. Рыта Мейнэртэ казала, што да нас яна ўявіць сабе не магла, як такое магчыма ў літаратурным музеі.

Н.С.: — Напрыклад, ва ўсіх філіялах латвійцамі шмат увагі нададзена дзецям і сямейным наведвальнікам. Дзесьці інтэрактыўныя зоны становяцца часткай экспазіцыі. Так, у Юрмале школьнікаў запрашаюць у тэатральную залу, дзе на дошцы неабходна з адмысловых выяў на магнітах выкласці сцэны са спектакляў. А музей ў Тадэнаве цалкам аддадзены малечам. Там толькі адзін музейны прадмет, астатняе можна мацаць, перасоўваць, круціць. Сімвал усёй экспазіцыі — сонца, бо сам Райніс называў гэты куточак сваім сонечным гняздом. Таму драўляныя канструкцыі, з якімі могуць гуляць дзеці, вырабленыя ў форме круга альбо шара. Ты ў самым пачатку атрымліваеш шарык-сонца і праходзіш з ім па ўсім музеі. Ён коціцца, паказваючы жыццё Райніса: у гэтым дамку нарадзіўся, тут жыў, туды ездзіў з бацькамі (усе гэтыя макеты змешчаны на адным паваротным коле). Наведвальнікам таксама прапануюць цацкі і гульні, якія любілі іх равеснікі сто гадоў таму. Гэта абсалютна чароўныя зоны!

А.Л.: — Мелі б дадатковыя плошчы — адну залу цалкам аддалі б дзецям! І магчымасці ёсць, бо ў Купалы стае дзіцячых вершаў. У нас ужо дзейнічае інтэрактыў "Хлопчык і лётчык", але хацелася б ажыццявіць задуму ў поўным аб'ёме. Прынамсі, гэта легла б у канцэпцыю "Вязынкі", дзе нарадзіўся паэт. У нас даўно ёсць ідэя, якая многім падаецца шалёнай: аднавіць там сядзібны дом! У ім можна было б зрабіць музей дробнай шляхты — менавіта з гэтага асяродку выйшаў будучы пясняр. Заадно мы вырашылі б свае праблемы: з'явіліся б прыбіральні, памяшканні для супрацоўнікаў, пакоі для адукацыйных заняткаў і зала, дзе ўладарылі б дзеці.

Вязынка знаходзіцца недалёка ад Мінска, таму лічу тое запатрабаваным.



Фрагмент экспазіцыі ў Тадэнаве, філіяле, які стаў "тэрыторыяй дзяцінства".



Прысутнасць героя ў экспазіцыі Дома Райніса і Аспазіі ў Рызе.

Аб'яднаныя стылем

Н.С.: — Для комплексу мемарыяльных музеяў, прысвечаных Райнісу, быў распрацаваны адзіны фірменны стыль. Да праекта падключылі маладых дызайнераў, і іх юнацкі задор, тэндэнцыі, уласцівыя сучаснаму дызайну, увасобіліся ў новых экспазіцыях. У кожным аб'екце захоўваецца адпаведны яму колер, з дапамогай якога фарміруецца экспазіцыя. Часам, першая рэакцыя на абранае адценне — шок. Прынамсі, у Юрмале звонку бачыш ажурны, лёгкі будынак, а ўнутры — суцэльны чорны колер. Паступова разумееш, што гэты асаблівы прыём спалучэння натуральных матэрыялаў, якія прысутнічаюць у экспазіцыі, з такімі брутальнымі асаблівасцямі дызайнерскіх праектаў адпавядае настрою творчасці Райніса і Аспазіі і дапамагае спасцігнуць сутнасць іх паэзіі.

А.Л.: — Розныя па змесце музеі атрымалі агульны брэнд. Распрацоўшчыкі абыгралі ініцыялы паэтаў. Для Тадэнавы галоўным колерам стаў жоўты — сімвал сонца. А на эмблеме ўзнікла літара "R" з кароткай рысай — лінія жыцця, якая толькі пачалася, бо пясняр толькі нарадзіўся. На лагатыпе Ясмуйжы ініцыял займеў больш працяглую рысу — у гэтым музеі распавядаюць пра юнацтва і маладосць свайго героя. Далей побач з "R" з'яўляецца "A", аб'яднанае агульнай рысай: у рыжскім доме Райніса і Аспазіі ўсё прасякнута тэмай іх сустрэчы і жаніцьбы. Лецішча-музей Райніса і Аспазіі дэманструе аддаленыя адна ад адной літары: тут праходзілі апошнія гады жыцця народнага паэта. Мне падаецца, гэта задума чытабельная. Прынамсі, па значках з музеяў можна прасачыць усю біяграфію Райніса. Дарэчы, лагатып выкарыстоўваецца паўсюль: у аздабленні экспазіцый, касы, сядзіб, папяровых паведамленнях, буклетах, інфармацыйных стэндах.

Узровень падыходу да фарміравання экспазіцый нас надзвычай уразіў і даў штуршок для разваг, імпульс для нашай працы. Хочацца таксама выпрацаваць адзіны фірменны стыль. Мы ў чарговы раз задумаліся над тым, што нашы ўсе філіялы, за выключэннем "Ляўкоў" і "Вязынкі", паўтараюць экспазіцыю галаўнога музея. Такая традыцыя была за савецкім часам: паўсюль распавядалі пра Янку Купалу ад нараджэння да смерці. Па факце атрымліваўся адзін і той жа матэрыял… Мы вырашылі змяніць канцэпцыю, і паступова нам гэта ўдаецца. У "Вязынцы" мы гаворым пра нараджэнне чалавека і нараджэнне паэта. У "Ляўках" распавядаем не толькі пра Купалу і яго жыццё тут, але і пра гісторыю краю ў 1930-я — 1940-я. У "Акопах" гучыць гісторыя раскіданага гнязда — гэта ж фальварак, які арандавала маці паэта. Пасля падарожжа ў Латвію мы вырашылі, што наспеў час прыступіць да распрацоўкі новай канцэпцыі ў "Яхімоўшчыне" — у месцы, дзе Янка Купала пачаў пісаць. Там захавалася цудоўная панская сядзіба і адзіны мемарыяльны дом, у якім жыў сам Янка Купала. Мы пакінем мемарыяльны пакой, але ў літаратурна-дакументальнай частцы зробім акцэнт на гэтым перыядзе, калі туды пераехаў беларускі пясняр. Таксама можна зрабіць акцэнт на гісторыі вёскі, уласнікаў сядзібы — паноў Любанскіх, Свянтажыцкіх. Спадзяюся, нашы планы ажыццявяцца ў 2018-м.

К

Антон Валынчык.

Ансамбль "Нёман". У цэнтры — Аляксандр Шыдлоўскі і Антон Валынчык.

(Заканчэнне. Пачатак у № 34.)

Піруэты лёсу слонімца

Хормайстар Антон Валынчык: не зважаючы на абставіны

"Культура" завяршае знаёміць чытачоў з пакручастай біяграфіяй вельмі важнай для сучаснай гісторыі нашай музыкі, але прызабытай сёння постаці — хормайстра, педагога і кампазітара Антона Валынчыка.

Няўдалыя ўцёкі ад вайны

…Падчас нямецкай акупацыі школа працягвала працаваць. Больш за тое — атрымала статус прагімназіі. Застаўся на сваёй пасадзе і Антон Валынчык. Па вялікім рахунку, іншага выйсця ў яго проста не было, як толькі адпавядаць свайму крэда: рабіць тое, што магчыма, не зважаючы на абставіны. У Народным доме акупаванага Слоніма ім быў арганізаваны даволі вялікі і добры хор, рэпертуар якога складаўся з кампазіцый самога хормайстра ды іншых беларускіх аўтараў. Да таго ж, Антон Валынчык выкладаў спевы ў адкрытай пры немцах Слонімскай настаўніцкай семінарыі і кіраваў добрым царкоўным хорам у слонімскай Свята-Троіцкай царкве. Па сканчэнні акупацыі пра ўсё гэта яму неаднаразова давялося распавядаць на допытах у НКВД. Хмары над ім згушчаліся, але… Настаўнік унікнуў арышту. Магчыма, гэтаму паспрыяў яго вялікі аўтарытэт сярод мясцовых жыхароў, а магчыма, "адпаведныя органы" проста не знайшлі, у чым яго можна звінаваціць.

— У нашай сям'і пра яго вельмі станоўча адгукаліся. Дый ва ўсім Слоніме людзі казалі пра Антона Валынчыка толькі добрыя словы, — згадваў слонімец Аляксандр Пасько, які ў будучыні стаў заслужаным настаўнікам Беларусі. — Мне здаецца, што ад рэпрэсій яго выратавалі самі іх выканаўцы. Ім шкада было арыштоўваць гэтага таленавітага і апантанага музыкай чалавека.

У пошуках "месца пад сонцам"

Тым не менш, яго біяграфія была сапсаваная, здавалася б, назаўсёды, а пра вялікую сцэну не выпадала нават марыць. Ды хормайстар не апускаў рук.

— Я памятаю яго падцягнутым, хударлявым, энергічным, ён любіў насіць карычневы плашч і капялюш, — згадвае Аляксандр Пасько. — Гэта тыповы інтэлігент: сціплы, шчыры, размаўляў з намі па-беларуску.

Нягледзячы на ўсеагульную павагу, родны Слонім яму неўзабаве давялося пакінуць. Пачаліся доўгія гады вандровак не раўнуючы па ўсёй Беларусі ў пошуках свайго "месца пад сонцам". У асабістым лісце па ўліку кадраў Антона Валынчыка, які захоўваецца ў архіве Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, запісана: 1947 — 1949 гады — мастацкі кіраўнік ансамбля славянскай песні і танца ў Ашмянах. 1952 — 1954 гады — мастацкі кіраўнік Пухавіцкага РДК. 1954 — 1955 гады — мастацкі кіраўнік сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках Магілёўскай вобласці. 1956 — 1957 гады — настаўнік спеваў у Пухавіцкай СШ і ў Талькаўскай СШ Мінскай вобласці… Пусціць карані яму перашкаджала таўро "нацыяналіста", якое дырыжор атрымаў яшчэ дзякуючы сваёй працы ў Клецкай гімназіі.

Урэшце, ужо ў часы "адлігі", у 1957 годзе, ён становіцца хормайстрам раскватараванага ў Маладзечне Мінскага ансамбля песні і танца. Склад калектыву да канца не быў сфармаваны, і каб папаўняць яго талентамі "з гушчы народнай", кампазітар выпраўляўся па гарадах ды вёсках. Аднойчы прыехаў у Пінск. Ідзе па вуліцы і чуе: цудоўны дзявочы галасок спяваў: "Ой, рэчанька, рэчанька…" Антон Міхайлавіч уважліва прыслухаўся і накіраваўся на гук. Зайшоў у маленькую кавярню і спыніўся каля ўваходу. Там нікога не было, акрамя адной дзяўчыны, якая прыбірала са сталоў посуд. Убачыўшы незнаёмага мужчыну, збянтэжылася і спыніла песню. Валынчык тут жа прапанаваў ёй пайсці ў ансамбль, і яна пагадзілася.

Так папаўняўся ансамбль у Маладзечне. Хутка ў ім было 40 юнакоў і дзяўчат. Ужо праз некалькі месяцаў пасля прыходу Антона Валынчыка калектыў выступіў з першай праграмай. Потым былі паспяховыя канцэрты па Беларусі, у краінах Балтыі, ва Украіне. "Пасля выступлення ансамбля ў Мінску падняўся старшыня журы і папрасіў, каб ён праспяваў яшчэ раз свае песні. Гэта быў даволі рэдкі выпадак, каб журы некага прасіла выступіць зноў" — згадвае кіраўнік фальклорнага ансамбля "Гарадзенскія дударыкі" Яўген Петрашэвіч.

Прызнанне

За свае заслугі Валынчык атрымаў першую падзяку ад дзяржавы: Ганаровую грамату за развіццё самадзейнага мастацтва рэспублікі і актыўны ўдзел у ім. Прафесійная кар'ера ізноў пайшла ўгару, і ў 1961 годзе спадар Антон пераехаў у Гродна, куды яго запрасілі выкладаць музыку і спевы ў педагагічным інстытуце імя Янкі Купалы, цяперашнім універсітэце. Праз колькі месяцаў ён узначаліў адпаведную кафедру.

На пасадзе Валынчык быў патрабавальны і да сябе, адзіным крытэрыем лічачы прафесіяналізм. Вось што згадаў пра Антона Міхайлавіча яго студэнт Аляксей Дземідовіч: "Гэты выкладчык прытрымліваўся дысцыпліны і патрабавальнасці да кожнага, хто прысутнічаў на яго лекцыях ці практычных занятках. Маэстра лічыў, што музыку і песню ўсе павінны любіць так, як ён, і не інакш. Таму на яго занятках нельга было біць лынды... Антона Міхайлавіча мы ўсе любілі. А калі ў музкабінеце заставалася вольная хвіліна, мы прасілі выкладчыка паіграць на скрыпцы і праспяваць які-небудзь са сваіх твораў. Лёгкая ўсмешка асвятляла яго, здавалася б, заўсёды строгі твар, і Антон Міхайлавіч сваім ціхім, трохі сіпатым голасам пачынаў, затым рабіў пройгрыш — і песня працягвалася да таго часу, пакуль такія радасныя хвіліны не перапыняў залівісты званок на калідоры… Як жа сёння хацелася б вярнуцца ў той нялёгкі, але шчаслівы малады час!.."

Праца Антона Міхайлавіча ў ВНУ была належным чынам ацэнена. Загадам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 28 верасня 1963 года Валынчыку было прысвоена ганаровае званне "Заслужаны дзеяч культуры БССР".

Адначасова з выкладчыцкай працай Антон Валынчык з'яўляўся хормайстрам гродзенскага народнага ансамбля песні і танца "Нёман", быў мастацкім кіраўніком Гродзенскай народнай капэлы настаўнікаў. Незабыўныя тыя часы былі ў жыцці гродзенскіх калектываў, калі за пультам стаяў Антон Валынчык. Высокая творчая патрабавальнасць хормайстра, уменне здабыць інтанацыйную чысціню спеву, дамагчыся сапраўднага гучання і ансамблевасці партый, глыбіні прачытання аўтарскай партытуры — усё гэта заўсёды вабіла тых, хто разумеў і любіў харавую музыку.

Багацце рэпертуару тых калектываў, якімі кіраваў Антон Валынчык, была адной з іх адметных рысаў. Прыкладам, Гродзенская капэла настаўнікаў выконвала і бахаўскі хор "Сэрца, маўчы", і "Вячэрняя песня" Танеева, і "Ухваленне прыроды" Бетховена, і "Что смолкнул веселия глас…" Чайкоўскага, і творы Рымскага-Корсакава, Кюі, Шуберта, Манюшкі, Вебера, Расіні, — не кажучы ўжо пра музыку Аляксандрава, Дунаеўскага, Хрэннікава, Фляркоўскага… Такому рэпертуару і сёння можа пазайздросціць не адзін прафесійны харавы калектыў.

Зразумела ж, не былі абмінутыя ўвагай і творы беларускіх аўтараў. А песні самога Валынчыка "Ліпы старыя" і "Касцы" на словы Якуба Коласа — гэта найярчэйшыя ўзоры харавой музыкі, у якой кампазітар выступаў не толькі знаўцам сакрэтаў партытуры для ансамблевага спявання, але таксама тонкім мастаком, які выдатна пераўтвараў багацце народнай музычнай мовы ў строгі і дакладны па форме твор.

Агулам Валынчыкам было напісана больш за 100 хораў, песень, апрацовак музычнага фальклору. Нават самыя патрабавальныя прыхільнікі харавой музыкі не змогуць знайсці ў гэтай творчасці адхіленняў ад прафесійных законаў і мастацкага густу. Натхнялі кампазітара цудоўныя радкі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Адама Русака і іншых беларускіх паэтаў. А колькі плёну было ад супрацоўніцтва Валынчыка з самадзейнымі кампазітарамі, музыцы якіх ён першы даваў пуцёўкі на эстраду! Да ўсяго, як хормайстар ён рупліва кансультаваў шматлікія харавыя калектывы Гродзеншчыны.

У 1966 годзе ўпершыню за ўсё ягонае жыццё ў актавай зале Гродзенскага педінстытута быў наладжаны творчы вечар кампазітара і дырыжора з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння і 50-годдзя працоўнай дзейнасці. З юбілеем Антона Міхайлавіча павіншаваў тэлеграмай сам Рыгор Шырма. Праўда, персанальнай пенсіі рэспубліканскага значэння Валынчыку так і не далі, нягледзячы на хадайніцтвы. Зрэшты, сыходзіць на заслужаны адпачынак ён не спяшаўся. Сваё працоўнае месца ў педінстытуце Антон Валынчык пакінуў толькі ва ўзросце 78 гадоў. Ды і пасля гэтага вяртаўся зрэдчасу на месяц-другі, калі яго зноў запрашалі ў ролі педагога.

Жыў Антон Міхайлавіч са сваёй жонкай Вольгай Данілаўнай і сынам Леанідам спачатку на Сацыялістычнай вуліцы, а потым у сваёй невялікай двухпакаёвай кватэры на першым паверсе ў доме № 33 на вуліцы Ажэшка, значную плошчу ў якой займала вялізная калекцыя кружэлак, часам нават і з ягонай музыкай. Яўген Петрашэвіч прыгадвае, што не раз бываў там, праводзячы з гаспадаром час у гутарках. Пра пуцявіны свайго жыцця ён гаварыць не надта любіў. Затое ў ахвоту дзяліўся марай злавіць на Нёмане вялізнага сама. Ці ўрэчаіснілася яна, невядома. Але, думаецца, рыбалка для яго была толькі нагодай набрыняць музычнымі ідэямі.

Антона Валынчыка не стала 13 лістапада 1985 года. Ён пражыў 89 гадоў, праслужыўшы музыцы сем дзесяцігоддзяў! Здавалася б, гэты ўнёсак неаспрэчна варты ўшанавання. Але… Ні на тым доме, дзе жыў кампазітар, ні на будынку ўніверсітэта мемарыяльнай шыльды ў яго гонар вы не пабачыце. Добра, што хаця б помнік на яго магіле нядаўна быў пастаўлены, шмат у чым дзякуючы намаганням тагачаснага старшыні аблвыканкама Сямёна Шапіры. Не ўшанавана памяць пра заслужанага дзеяча культуры і на яго радзіме — Слонімшчыне. У вёсцы Мяльканавічы, дзе прыйшоў на свет педагог і кампазітар, многія вяскоўцы пра земляка не чулі. Толькі старэйшыя згадалі пра яго, а адна жанчына заспявала:

Ідуць касцы, звіняць іх косы,
Вітаюць буйныя іх росы,
А краскі ніжай гнуць галовы,
Пачуўшы косак звон сталёвы…

Сяргей ЧЫГРЫН,
літаратар, краязнаўца
Слонім

Фотафакт

Беларускую дэлегацыю ачольваў намеснік міністра культуры краіны Васіль Чэрнік (трэці злева). / Фота Ільі СВІРЫНА

Дажынкі на Анезе

10 верасня ў цэнтры сталіцы Рэспублікі Карэлія (Расія) Петразаводска гучалі беларускія песні. На галоўнай сцэне гарадскога сямейнага свята "Лета.PTZ" прайшоў фэст "Дажынкі". У склад творчага дэсанту з Беларусі ўвайшлі заслужаныя калектывы "Неруш" і "Альянс", эстрадныя і фальклорныя выканаўцы, а таксама народныя майстры. Пра жыццё нашых суайчыннікаў у далёкім паўночным краі — у наступных нумарах "К".

“Нягледзячы на подпіс, карціна сапраўдная...”

(Працяг. Пачатак у № 37.)

А далей я распавяду пра амаль дэтэктыўны лёс вядомай дыпломнай карціны “Вяселле” Леаніда Шчамялёва, якая дзякуючы Алене Аладавай захавалася для нашага мастацтва.

Барыс КРЭПАК



У экспедыцыі па Брэстчыне. Алена Аладава і рэстаўратар Віктар Філатаў. 1958 год.

Вітольд Бялыніцкі-Біруля. "Зімовы сон". 1911 год.

Ілья Рэпін. Партрэт актрысы Марыі Андрэевай. 1905 год.

Справа была наступная. У 1959 годзе, Леанід Дзмітрыевіч, выпускнік БДТМІ, абараніў гэту сваю дыпломную работу. Зразумела, яна засталася ў фондах інстытута, як і ўсе творы такога кшталту. Але праз тры гады карціна зноў нагадала пра сябе. Аднойчы невялічкая кампанія, у якой былі, у прыватнасці, Шчамялёў і графік Юрый Зайцаў, прагульвалася па тагачасным Ленінскім праспекце. Зайшлі ў гастраном “пад гадзіннікам”, узялі пару пляшак партвейну і спыніліся: дзе б выпіць? Тады адзін з хлопцаў, загадчык гаспадаркі Тэатра юнага гледача, прапанаваў зайсці ў тэатральную творчую майстэрню, дзе можна было, на яго думку, зусім культурна правесці пару гадзін. Тэатр побач, ключ у кішэні. І ніхто не зможа перашкодзіць, бо ўсё начальства на чале з галоўным рэжысёрам Любоўю Мазалеўскай — на прэм’еры спектакля “Над хвалямі Серабранкі”. Сказана — зроблена. І толькі расклалі на доўгім драўляным варштаце сціплую закусь, як Леанід пабачыў у глыбіні змрочнага засмечанага памяшкання штосьці вельмі доўгае, прамавугольнае, прыкрытае вялікім кавалкам брызенту, з-пад якога зіхацеў вугал рамы і край грунтаванага палатна. І якое ж было яго здзіўленне, калі, прыадкрыўшы гэты невядомы прадмет, ён распазнаў сваё дыпломнае “Вяселле”! Як, якім чынам карціна, уласнасць інстытута (!), апынулася тут, сярод хламу і бруду? Загадчык гаспадаркі невыразна хмыкнуў, што ўжо даўно хтосьці (ён не помніў — хто) яе сюды прывалок і проста кінуў без усялякіх тлумачэнняў. Але адно для Шчамялёва было ясна: без “візы” рэктарата карціна не магла пакінуць межы ВНУ. Але калі ад яе такім спосабам пазбавіліся, дык навошта, які ў гэтым сэнс? Паколькі карціна ў тэатры не была зафіксавана ніякім дакументам як матэрыяльная каштоўнасць, “гаспадар” памяшкання прапанаваў Леаніду, калі ён жадае, забраць яе. Канешне, за адпаведны магарыч — пляшку “Маскоўскай”. Без ваганняў Шчамялёў пан-аскроб грошай на дзве. Але паўстала сакраментальнае пытанне: куды падзець такую махіну?

Рашэнне прыйшло хутка: зразумела, у мастацкі музей, ён побач. Алена Васільеўна можа дакладна разабрацца — што і як. Прынамсі, параіць. Хлопцы акуратна вынеслі ў двор карціну, збочылі з вуліцы Энгельса на вуліцу Маркса і накіраваліся ў бок музея. Быў аўторак — у музеі выхадны дзень, але, як заўсёды, дырэктрыса на месцы. Шчамялёў расказаў Алене Васільеўне сутнасць справы і пацiснуў плячыма: “Не ведаю, што зараз рабіць з карцінай. Шкада, калі яна загіне...” Аладава доўга не думала: “Леанід Дзмітрыевіч, не хвалюйцеся. Па-першае, пакуль што нікому пра палатно не кажыце. Па-другое, папрасіце сваіх хлопцаў, каб яны знялі з падрамніка гэтую груваcткую раму і куды-небудзь аднеслі яе падалей. Пра астатняе я паклапачуся...”

Праз два месяцы, нечакана для Шчамялёва, Аладава выпісвае яму за карціну “Вяселле” ганарар — каля 700 рублёў. За гэтыя грошы мастак купіў будаўнічы матэрыял, машыну шлаку пад фундамент і з дапамогай цесця збудаваў у двары дома па вуліцы Рабкараўскай 18-метровую творчую майстэрню. Унутры паставіў грубку-буржуйку з комінам, які выходзіў у вакно, каб і зімой можна было працаваць. Вось так, дзякуючы Аладавай, з’явілася першая майстэрня Шчамялёва. Тут нарадзіліся карціны “Цяжкія гады” (“Апалчэнец”) і “Мацярынства”, якія прынеслі шырокую вядомасць мастаку далёка за межамі Беларусі — ад Масквы да Натынгема (Англія).

Адна з выдатных заслуг Аладавай — вяртанне на Радзіму з Расіі спадчыны нашага земляка-беларуса Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Толькі за гэта ёй можна ставіць помнік! Бо ўсё тое, што сёння мы маем з духоўнай спадчыны мастака, — гэта, найперш, яе заслуга. Менавіта яна, блізкая сяброўка Вітольда Каэтанавіча і яго жонкі Алены Аляксееўны, зрабіла ўсё магчымае, каб песняр прыроды застаўся назаўсёды з намі, беларусамі. Так, дзякуючы Аладавай, мастацтва Бялыніцкага-Бірулі стала па-сапраўднаму цудоўным адкрыццём для беларускага гледача і шчырым трыумфам увасаблення ідэі Алены Васільеўны, рэалізацыі якой, у тым ліку арганізацыі музея мастака ў Магілёве, яна цалкам прысвяціла апошнія гады свайго жыцця. Усё, што звязана сёння з імем Вітольда Каэтанавіча, асвечана духам гэтай жанчыны, якая першая заявіла, што “знаходжанне найбуйнейшага майстра пейзажа ў Беларусі — усяго створанага ім тут — уяўляе для нас асаблівую цікавасць і каштоўнасць” і што “мы павінны беражліва збіраць і захоўваць яго творы, вывучаць яго спадчыну: мастакі — пасвойму, музейшчыкі — пасвойму”, бо “творчасць яго-

Леанід Шчамялёў. "Вяселле". 1959 год.

Феномен Алены Аладавай

ная складае законны гонар беларускага народа”.

Аднак тое, што зрабіла Аладава і ў галіне папаўнення музейнай калекцыі ўнікальнымі творамі рускага мастацтва, ды і старажытна-беларускімі рарытэтамі таксама, ужо даўно ўвайшло першым радком ва ўспаміны многіх яе калег-музейшчыкаў і мастакоў-сучаснікаў. Заір Азгур згадвае: “Помню яе натхненне, калі яна затрымлівалася каля назбіраных ёю палотнаў Рэпіна. У Алены Васільеўны з’яўляўся нават пафас у інтанацыях: “Чалавек, які напісаў такія карціны, як “Бурлакі”, “Іван Жахлівы”, “Запарожцы”, “Царэўна Соф’я”, “Хрэсны ход”, “Не чакалі”, зрабіў для гістарычнай самасвядомасці такую ж вялікую справу, як Леў Талстой у літаратуры, Мусаргскі — у музыцы, Станіслаўскі — у тэатры. Кожнаму, хто цікавіцца Рэпіным, дарагі любы мазок яго пэндзля. Ды паглядзіце самі на гэта ззянне і бляск у вачах Марыі Фёдараўны Андрэевай!.. Да таго ж у нас, у беларусаў, ёсць свой сантымент да Рэпіна: ён сэрцам прывязаўся да нашага віцебскага краю, бо “здраўнёўскі” перыяд яго жыцця — важная старонка ў творчасці Ільі Яфімавіча...” І далей: “Аладава да кожнага з нас, мастакоў, падбірала “ключык”, якім можна было прыадкрыць душу мастака, падтрымаць яго ў цяжкую хвіліну, заахвоціць творчы працэс, звярнуць увагу на новы сюжэт. І ўсё гэта яна рабіла як бы мімаходзь, без назойлівай дабрачыннасці. На службе Аладава была гранічна адміністрацыйным дзеячам: дырэктар, мастацтвазнаўца ў музеі, экспазітар. Затое ў сапраўднасці мы ўсе ведалі яе як чалавека мастацтва па прызванні, па абавязку сэрца. Ні адна важная падзея ў мастацкім жыцці рэспублікі не абыходзілася без яе ўдзелу. Яе запрашалі мастакі ў свае майстэрні, яна ўваходзіла ў склад выставачных камітэтаў і журы, да яе прыслухоўваліся на грамадскіх абмеркаваннях новых экспазіцый і на вернісажах. Што тут сказаць? Майстра робіць вялікую справу, калі стварае шэдэўр; музейны работнік захоўвае гэты шэдэўр для многіх пакаленняў. Узаемасувязь тут дыялектычная і вельмі важная для культурнага працэсу. Аладава ведала гэта. Яна свядома выбрала сабе такое поле дзейнасці, на якім магла ажыццявіць сваё чалавечае імкненне служыць людзям і пакінуць добры след пасля сябе. Такое называюць падзвіжніцтвам...”

А зараз дазволю сабе даць волю не мастацтвазнаўчаму, а мемуарнаму тону апавядання. Бо як чалавек і музейшчык яна ўвайшла ў маё жыццё і маю свядомасць так імкліва, важка і ўладна, і прытым у такім непадзельным адзінстве чалавечых і творчых якасцей, што для мяне так і не настаў час для эпічнага спакою і акадэмічнай бястраснасці ў роздумах і ўспамінах пра яе.

Аднак лёсу было пажадана, каб гэтая ўнікальная жанчына яшчэ пры жыцці стала легендай, з імем якой звязаны нараджэнне і станаўленне духоўнага цэнтра Беларусі — Дзяржаўнай карціннай галерэі, якая стала ў 1957-м Дзяржаўным мастацкім музеем БССР, адным з самых лепшых у тагачасным СССР — у кампаніі такіх славутасцяў, як Траццякоўка ў Маскве і Рускі — у Ленінградзе. Так, яна, гэта вялікая падзвіжніца ў гісторыі беларускай культуры, па-сапраўднаму легенда. Чаму я гэта падкрэсліваю? Ды таму, што гэтае слова сёння настолькі дэвальвавалася. Куды ні кінь, усе “легендарныя”, “непаўторныя”: дзьмутыя эстрадныя “зоркі” і “зорачкі”, музыканты, артысты тэлесерыялаў, шоумены... А на справе — у лепшым выпадку, “каліфы на гадзіну”.

А мая гаворка ідзе пра легенду — пра Алену Васільеўну — таленавітую, мужную, харызматычную, з багатай і складанай лініяй жыцця, апантаную толькі адзінай святой думкай у сваёй біяграфіі: як зрабіць беларускі Музей, які стаў не толькі яе сэрцам, але і розумам, сапраўды духоўнай скарбніцай нашай краіны. Такіх людзей жыццё спараджае няшмат. У свой час міністр культуры СССР Кацярына Фурцава назвала Аладаву “беларускім Траццяковым”. І яна мела рацыю.

У 1966-м ёй было прысвоена званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, першай у краіне, хто атрымаў такі гонар з мастацтвазнаўцаў. Пасля яе такога звання ў рэспубліцы былі ўдастоены толькі чатыры чалавекі. І гэта прытым, што спецыяльнага дыплома мастацтвазнаўцы яна не мела, а адукацыю атрымала спачатку ў БДУ, дзе займалася ў Мікалая Шчакаціхіна (канец 1920-х), потым, перад вайной, — завочна на мастацтвазнаўчым факультэце Інстытута гісторыі, філасофіі, літаратуры і мастацтва імя Мікалая Чарнышэўскага ў Маскве. Паралельна працавала ў штаце Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР у якасці навуковага супрацоўніка па арганізацыі Карціннай галерэі БССР. Праўда, вайна перашкодзіла здаць дзяржэкзамены ў Маскве і закончыць інстытут...

К

Працяг чытайце **ў наступных нумарах.**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі — выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ Выстава твораў скульптара і графіка Аляксандра Шаппо **"Сюіта №45"** — да 29 верасня.
■ Выстава жывапісу Ягора Батальёнка — да 26 верасня.
■ Выстава Георгія і Наталлі Паплаўскіх **"Вехі творчасці"** — з 7 да 30 верасня.
■ Выстава фарфору і роспісу па тканіне Эміліі Фокінай **"Дзіўныя звяры"** — да 25 верасня.
■ Выстава **"Мастацтва будызму"** з фондаў Дзяржаўнага Эрмітажу — да 9 лістапада.

Дадатковыя імпрэзы:

■ Выстава да 100-годдзя з дня нараджэння Паўла Любамудрава **"Мастак і педагог"** — да 3 кастрычніка.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
■ Кожную пятніцу і суботу з 17.45 да 21.00 у дворыку дома-музея адбываецца танцавальны open air і бясплатны майстар-клас для пачаткоўцаў .

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Давыд-гарадоцкі роспіс"** з прыватнага збору А.М. Арлова, аднаго з першых даследчыкаў феномену "цікетак" — да 4 верасня.
■ Кожную суботу ў 12.00 — майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў, саломкапляценні і роспісе яек.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава **"Прыватная калекцыя"** вядомага расійскага фотамастака Кацярыны Раждзественскай (Масква) — да 30 кастрычніка.
■ Выстава **"Агароднінны кірмаш"** беларуска–канадска–ізраільскага фотамастака Аліка Замосціна — да 18 верасня.
■ Выстава **"PaVetra. Водар роднага краю"** — з 22 верасня.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
■ Інтэрактыўны праект **"Лазерны лабірынт"** — да 28 верасня.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Выстава ўнікальных рэалістычных фігур **"Свет старажытных людзей"** — з 3 верасня да 4 снежня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.
■ Выстава **"Перадвыбарны плакат Беларусі. Мінулае і сучаснасць"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Персанальная фотавыстава Аляксандры Пяхота **"Падарожжа дадому"** — да 9 кастрычніка.

г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.

■ Выстава **"Шумлівая пярнатая вясёлка"**.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."

Выстава:

■ Выстава **"У храме мастацтва"** Аксаны Аракчэевай.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстава:

■ **"Займальная геаграфія"** — да 31 кастрычніка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

Выстава:

■ **"Вянок"** — з 15 верасня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава серыі карцін **"Лічбы на сэрцы"** Героя Беларусі, народнага мастака СССР і Беларусі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Міхаіла Савіцкага — да 9 кастрычніка.
■ Выстава **"Беларусы ў II Польскім корпусе. Невядомыя старонкі Другой сусветнай вайны"** — да 2 кастрычніка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільнюс) — да 11 верасня.
■ Выстава **"Час. Рэчы. Прасы"** — да 18 верасня.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Выстава **"Беларусь у абдымках зорак"** — да 3 кастрычніка.

Слуцкая брама

■ Інсталяцыя **"Застылыя хвіліны цішыні"** — да 30 верасня.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"** — да 30 верасня.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**.
■ Музейна-адукацыйная праграма **"Музейны дэсант"** (сумесна з Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам А.С. Пушкіна "Міхайлаўскае") — з 5 да 10 верасня.
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Фотавыстава Міхася Міцкевіча **"Мілыя вобразы"** — з 23 верасня да 15 кастрычніка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**
■ Выстава **"Горад, які мы не бачылі. Мінск на малюнках 1940 — 1950-х"** — да 11 верасня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ Выстава **"Цяпло душы"** Свята-Елісавецінскіх майстэрняў "Ella" (у экспазіцыі прадстаўлены вырабы з фарфору, керамікі і шкла, выкананыя ўручную) — да 18 верасня.
■ Выстава **"Героі атамнага фронту. Месца подзвігу — Чарнобыль"** (арганізавана з Беларускім саюзам мастакоў і Фондам падтрымкі мастацтва і культуры "Чырвоны кут" (Масква) — да 23 верасня.
■ Выстава жывапісу **"Мінск Барыса Аракчэева"** — да 18 верасня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Рэтраспектыўная выстава ўдзельнікаў фотаклуба "Мінск" **"Так! Гэта Мінск"** — да 25 верасня.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

■ Выставачна-адукацыйны праект **"Па слядах мамантаў"** — да 30 верасня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"** (у яе рамках — выстава **"Расповед пра археолага: памяці Уладзіміра Багамольнікава"** — да 14 верасня).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Выстава **"Біблейскія і міфалагічныя сюжэты ў заходнееўрапейскім мастацтве XVII — XIX стст."** (прадстаўлена больш за 70 твораў жывапісу, скульптуры і графікі з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь) — да 13 лістапада.
■ Выстава **"Відавочнае і неверагоднае: оптыка"** (30 унікальных экспанатаў з Цэнтра навукі Каперніка ў Польшчы) — з 10 верасня.
■ Выстава **"Паралельны свет, або Міфы пра дамавікоў і лесавікоў"** (падарожжа ў загадкавы свет славянскай міфалогіі, забабонаў і магіі) — да 25 верасня.
■ Выстава **"Атлантыда. Мігатлівыя скарбы Ёнагуні"** — да 9 кастрычніка.
■ Выстава **"Узнагароды краін свету"** — да 25 верасня.
■ Выстава **"Ёсць вочы ў кветак"**) — да 25 верасня.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:

■ **"Мудрая думка"** — выданні ўсходняй літаратуры другой паловы XX ст. — да 30 верасня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Zooterra"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

Вежа агляду.
Спачывальня князёў Паскевічаў.

■ Інтэрактыўны праект для школьнікаў **"Вялікі музей для цікаўных сяброў"**.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"І памяць сэрца гаворыць"**.
■ Выстава **"Мы ўспомнім зноў мінулую вайну..."**
■ Выстава **"Зброя для моцных духам".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера".**
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі".**
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны".**
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2-68-96

■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Страчаная спадчына яўрэйскай культуры", "Мой край не мінула вайна".**
■ Выстава Марыі Васюкевіч **"Дамінанта майго жыцця... Родныя рэчы".**
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка".

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

Выставы (усе — да 23 верасня):

■ Выстава памяці Яўгена Каробушкіна
■ Юбілейная выстава Аляксандра Зіменкі **"Культурны слоік"**.
■ Выстава **"Гродзенскі транзіт"**.

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава славацкага аўтара Зузаны Граус Рудаўскай **"Дакрананне Славакіі. Малюнак. Аб'ект. Каштоўнасць"** — да 26 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

■ **11 — "Бахчысарайскі фантан"** (балет у 2-х дзеях, прэм'ера абноўленай пастаноўкі) Б.Асаф'ева.
■ **12 — "Яўген Анегін"** (опера ў 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **13, 14 — "Вітаўт"** (балет у 2-х дзеях) В.Кузняцова.
■ **13 — "Прысвячэнне Шастаковічу"** (Камерная зала імя Ларысы Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **15 — "Севільскі цырульнік"** (опера ў 2-х дзеях) Дж.Расіні.
■ **16 — "Шчаўкунок, або яшчэ адна калядная гісторыя..."** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **11 — "Соф'я Гальшанская"** (мюзікл у 2-х дзеях) У.Кандрусевіча. *Пачатак а 18-й.*
■ **12 — "Мая чароўная лэдзі"** (мюзікл у 2-х дзеях) Ф.Лоу.
■ **13 — "Баль у Савоі"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама.
■ **14 — "Мэры Попінс"** М.Дунаеўскага (шоу-мюзікл у 2-х дзеях).
■ **15 — "Клеапатра"** (балет у 2-х дзеях) Г. Шайдулавай.
■ **16 — "Вяселле ў Малінаўцы"** (музычная камедыя ў 2-х дзеях) Б.Аляксандрава.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **12 — "Дзед"** (трагікамедыя) В.Паніна.
■ **13 — "Мабыць?"** (спектакль-даследаванне).
■ **14 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** (сучасная драма) Д.Балыка.
■ **16 — "Кантракт"** (камедыя) Ф.Вэбера.
■ **17 — "Два чароўныя парасоны"** (казка для дзяцей і дарослых) Г.Х. Андэрсана.